Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і мастацтва

ПЯТНІЦА, 5 чэрвеня 1981 г. № 23 (3069) Выходзіць з 1932 г. Цана 8 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

...І СІМВАЛ БЕЛАРУСІ— ВАСІЛЁК

Да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма БАГДАНОВІЧА

Сапраўдны талент — заўсёды загадка. І чым больш ён велічны ў сваёй сутнасці, чым больш глыбінны ў праяўленні сваім, тым відавочней, што нельга падыходзіць да ацэнкі яго з загадзя запраграмаванымі меркаваннямі. Толькі час бескампрамісна скажа — талент гэта непаўторны ў сваёй сутнасці, ён—прыклад для ўсіх, урокі ягоныя будуць вечнай крыніцай натхнення для ўсё новых і новых творцаў.

Найлепшы прыклад — Максім Багдановіч. Паэт, чалавек, грамадзянін. Сын Беларусі і пясняр яе. Зорка першай велічыні ў нацыянальнай паэзіі.

— Вершы Максіма Багдановіча захапілі мяне ў студэнцкія гады. Чытаў я іх з хваляваннем. Паэзія яго ўразіла глыбока, па-сапраўднаму. Гэта быў свет, увайшоўшы ў які аднойчы, ужо нельга забыць яго. Ён усё больш і больш уладна кліча да сябе...

Гутарым мы са скульптарам, заслужаным дзеячам мастацтваў БССР С. Вакарам у яго майстэрні па вуліцы Сурганава ў Мінску. Гаворка ў асноўным ідзе пра яго, Максіма Багдановіча, над помнікам якому, што будзе ўстаноўлены ў беларускай сталіцы сёлета, напярэдадні 90-годдзя з дня нараджэння паэта, працуе сёння скульптар. Сёння? Не, не зусім так. Над помнікам М. Багдановічу С. Вакар працуе пятнаццаць гадоў. З той памятнай яшчэ студэнцкай пары, калі ўпершыню трапіў яму ў рукі томік вершаў паэта.

С. Вакар тады ўжо не быў навічком у мастацтве. Ён закончыў Мінскае мастацкае вучылішча, быў аўтарам дыпломнай работы «Рэйкавая вайна», а таксама шматлікіх кампазіцый. У гады вучобы з'явілася ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце жаданне ствараць скульптурныя партрэты лепшых людзей свайго часу — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, нашых слаўных сучаснікаў, дзеячаў літаратуры.

У 1964 годзе студэнт С. Вакар выконвае партрэт Скарыны.

— Праца над увасабленнем вобраза Скарыны,— прызнаецца С. Вакар,— дала мне шмат. Ён зацікавіў мяне перш за ўсё сваёй велічнасцю, сваёй геніяльнай прадбачлівасцю. Гэты чалавек пакінуў найглыбейшы след у гісторыі роднага народа, нягледзячы на тое, што знаходзіўся далёка ад беларускай зямлі, жыў на чужыне.

— Як і Максім Багдановіч...

— У іхніх лёсах шмат падобнага. І творчасць абодвух аднолькава напоўнена любасцю да свайго краю, свайго народа. Калі пачаў працаваць над партрэтам Багдановіча,— працягвае скульптар,— над першым варыянтам яго, зноў і зноў перачытваў цудоўныя вершы. І «Зорку Венеру», і «Слуцкіх ткачых», і вось гэты, у якім боль душы, трывога паэтавага сэрца:

Краю мой родны! Як выкляты
богам —
Столькі ты зносіш нядолі...

І, вядома, знаёміўся з тым, што пісалі пра Багдановіча даследчыкі. Хацелася глыбей пранікнуць ва ўнутраны свет паэта, адчуць тое, чаго не выказаў ён у сваіх творах...

Ужо ў 1966 годзе С. Вакар выканаў два варыянты партрэта М. Багдановіча. Адзін—у таніраваным гіпсе, другі — у бронзе. Вырашаны яны таксама па-рознаму. На адным Багдановіч глядзіць у далячынь, склаўшы рукі на грудзях. Другі партрэт — правая рука паэта сагнута ў локці, прытрымлівае каўнер вопраткі. Пазней у скульптара былі іншыя кампазіцыйныя варыянты. Адну з работ мастак выканаў у дрэве. С. Вакар настойліва ішоў па шляху далейшых пошукаў, дасягаючы ўсё большай і большай мастацкай дасканаласці.

Работы паказваліся на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, з цікавасцю сустракаліся гледачамі. А ў душы скульптара ўсё больш акрэслівалася мара, якая жыла падсвядома яшчэ са студэнцкіх гадоў. Стварыць у горадзе Мінску помнік М. Багдановічу. Занатаваць у бронзе воблік таго, хто верыў, што народ Беларусі «дачакаецца залацістага, яснага дня».

Сёння работа гэтая блізка да завяршэння. У майстэрні мастака ўзвышаецца скульптура паэта ва ўвесь рост. Памер яе—4,6 метра. Адна рука Багдановіча прыўзнята ўверх, прытрымлівае каўнер вопраткі. Паэт як бы засланяецца ад ветру, што дзьме насустрач. Імклівы позірк скіраваны наперад, у вачах гарачае жаданне крочыць і крочыць далей. Ісці насустрач новым дням.

А ў руцэ—сціплы букецік кветак. Сімвал радзімы—васілёк...

— Думаю, — дзеліцца планамі С. Вакар,—прыняць удзел і ў рэспубліканскай мастацкай выстаўцы, прысвечанай юбілею М. Багдановіча. На яе прапаную адну са сваіх работ. А яшчэ зрабіў юбілейны медаль...

...Сапраўдная закаханасць у творчасць любімага паэта, высокае ўсведамленне свайго мастакоўскага і грамадзянскага абавязку перад часам— так можна вызначыць у некалькіх словах тое, што робіць С. Вакар. Яго майстэрню пакідаеш з тым радасным пачуццём, якое прыходзіць звычайна ў моманты высокага душэўнага ўзрушэння. Максім Багдановіч, паэт, які ўсім сваім сэрцам любіў родную зямлю, адзін з лепшых яе сыноў, хутка вернецца ў сталіцу Беларусі. Вернецца назаўсёды.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

На здымку адзін з варыянтаў скульптурнага партрэта Максіма Багдановіча.

Фота Ул. КРУКА.

АД ПЯТНІЦЫ ДА ПЯТНІЦЫ

МАРШРУТ ГАСТРОЛЯЎ—САФІЯ, ПЛОЎДЗІЎ, СТАРА ЗАГОРА

У афішах Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР пазначаны назвы бягучага рэпертуару, у оперных класах ідзе падрыхтоўка да надыходзячай прэм'еры — «Рыгалета» Д. Вердзі, а балетная трупа ўжо збіраецца ў замежную паездку. Беларускі балет атрымаў запрашэнне на гастролі ў Балгарыю. Вось што сказаў у гутарцы з нашым карэспандэнтам галоўны балетмайстар тэатра, народны артыст БССР В. ЕЛІЗАР'ЕЎ:

— Нашы гастролі пройдуць у юбілейны год святкавання 1300-годдзя стварэння Балгарскай дзяржавы, у рамках фестывалю «Сафійскія музычныя тыдні». У нас, вядома, ёсць вопыт замежных гастроляў — у Венгрыі, Польшчы, Кувейце, сёлета нашы салісты Л. Бржазоўская, Ю. Траян, В. Саркісьян і В. Лапо ў складзе творчай групы майстроў мастацтваў Савецкага Саюза пабывалі ў Румыніі, але ўсё роўна хвалюемся: у Балгарыю едзем упершыню.

14 чэрвеня мы адкрываем гастролі на сцэне Сафійскай народнай оперы, потым выступім на адкрытай пляцоўцы антычнага тэатра ў Плоўдзіве, а таксама ў Старазагорскім тэатры оперы і балета. Праграма складзена такім чынам, каб у балгарскага гледача засталося больш поўнае ўяўленне пра беларускі балет. У прэм'ерах апошніх гадоў — сучасных спектаклях «Стварэнне свету», «Кармэн-сюіта», «Камерная сюіта», «Адажыета», фрагментах з «Ціля Уленшпігеля» і «Спартака», а таксама класічных спектаклях «Пахіта» і «Прывал кавалерыі» выступіць амаль уся трупа: народныя артысты рэспублікі Л. Бржазоўская, Н. Паўлава, Ю. Траян, В. Саркісьян, заслужаныя артысты БССР У. Камкоў, У. Іваноў, С. Пясцехін, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Т. Яршова і А. Мартынаў, салісты В. Лапо, А. Куркоў і інш.

Дадам таксама, што Я. Лысік як мастак і як балетмайстар запрошаны ў Варну для пастаноўкі спектакля «Стварэнне свету». Для нас гэта вельмі прыемная і пачэсная прапанова, бо Варну, дзе традыцыйна раз у два гады праводзіцца Міжнародны конкурс артыстаў балета, можна з поўным правам лічыць «балетным» горадам. Прэм'ера спектакля павінна адбыцца 1 лістапада.

А пакуль усе клопаты і турботы звязаны з надыходзячымі гастролямі. Своеасаблівую «генеральную рэпетыцыю» — канцэрт з нумароў, якія ўвайшлі ў гастрольны рэпертуар, пабачыў беларускі глядач, які днямі завітаў у тэатр.

Т. КЛЯНОВІЧ.

З ПАКЛОНАМ — ДА ПУШКІНА

Пскоўская зямля зноў прымае гасцей Усесаюзнага пушкінскага свята. Пакланіцца вялікаму паэту прыехалі пісьменнікі Масквы, Ленінграда, саюзных рэспублік, зарубежныя сябры. Урачыстасці адкрыліся сёння сустрэчамі на заводах абласнога цэнтра, у педагагічным інстытуце, бібліятэках. На розных мовах народаў свету гучалі вершы, услаўляючыя генія рускай літаратуры.

Удзельнікаў фестывалю чакае сяло Міхайлаўскае, дзе пятнаццаць гадоў назад быў пакладзен пачатак усесаюзным святам паэзіі.

ТАСС.

ПАЛІТЫЧНУЮ КНІГУ — РАБОЧЫМ

У рамках Усесаюзнага агляду-конкурсу па прапагандзе і распаўсюджванні грамадска-палітычнай кнігі, які праводзіцца Дзяржкамвыдам СССР, праўленнем Цэнтрсаюза і Цэнтральным праўленнем Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі, на мінскім заводзе імя У. І. Леніна адбылося адкрыццё рэспубліканскага свята пад дэвізам «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё».

Перад кнігалюбамі выступілі дэлегат XXVI з'езда КПСС, швачка скургалантарэйнай фабрыкі імя Куйбышава А. Кісель, намеснік старшыні рэспубліканскага праўлення Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі В. Вільтоўскі, паэты В. Зуёнак, А. Вольскі, П. Макаль, У. Скарынкін.

Прысутныя змаглі набыць грамадска-палітычную літаратуру, а таксама выданні па краязнаўстве, творы беларускіх пісьменнікаў.

А. ПЕТУХОЎ.

ПРЭМ'ЕРЫ



«Таямнічы гіпапатам» — назва прэм'еры Дзяржаўнага тэатра лялек БССР. Спектакль па п'есе У. Ліфшыца і І. Качанава паставіў народны артыст БССР А. Ляляўскі, мастак А. Фаміна, кампазітар В. Іваноў.

На здымку: сцэна са спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

І ЮБІЛЕЙ, І СПРАВАЗДАЧА

Народнаму артысту БССР, салісту Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР Ігару Сарокіну — 50 гадоў. Гэта радасная падзея не толькі для самога юбіляра, але і для ўсіх, каго ўжо даўно зачараваў яго талент. А выступленні Ігара Дзмітрыевіча заўсёды карыстаюцца нязменным поспехам у гледача. І ў тэатры, дзе ён выконвае вядучыя партыі ў многіх оперных спектаклях, і на канцэртах, што наладжваюцца ў час сустрэч з калгаснікамі, рабочымі студэнтамі.

Дружна апладзіравалі прысутныя І. Сарокіну і на яго творчым вечары, што адбыўся ў гасцінай рэспубліканскага Дома работнікаў мастацтваў. Ігар Дзмітрыевіч прымаў не толькі віншаванні, але і рабіў своеасаблівую творчую справаздачу з нагоды свайго пяцідзесяцігоддзя. Прынамсі, арыі з опер, некалькі песень беларускіх кампазітараў у яго выкананні прагучалі цудоўна.

А музыказнавец Э. Язерская, расказаўшы пра жыццёвы і творчы шлях юбіляра, яшчэ раз нагадала ўсім аб тым важкім укладзе, які ўнёс І. Сарокін у развіццё беларускага музычнага мастацтва.

На здымку: спявае І. Сарокін.

Фота Ул. КРУКА.

У ВЯЗЫНКУ, ДА КУПАЛЫ...

У пяты раз у Вязынцы, на радзіме неўміручага Янкі Купалы, адбыўся злёт студэнтаў-філолагаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Свята, якое пачалося ў горадзе з урачыстага шэсця па вуліцы Карла Маркса і ўскладання кветак да Памятнага знака выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам універсітэта, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, не выпадкова прывяло сюды, на зямлю песняра. Студэнты любяць літаратуру, асабліва творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа. Тут даўно працуе літаратурнае аб'яднанне пачаткоўцаў «Узлёт», якім кіруе прафесар універсітэта, паэт А. Лойка, рэгулярна праводзяцца літаратурныя вечары, сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі, дыспуты па прачытаных кнігах.

Літаратурныя мерапрыемствы арганічна ўпісаліся і ў злёт студэнтаў. Будучыя настаўнікі пазнаёміліся з экспазіцыяй філіяла Літаратурнага музея Я. Купалы, агледзелі мясціны, дзе нарадзіўся пясняр, разам з А. Лойкам правялі гадзіну паэзіі. А дзе паэзія, там і песні — на студэнцкае свята быў запрошаны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Вячоркі» з Лунінецкага раёна.

НАД РАКОЮ АРЭСАЙ

Саюз пісьменнікаў БССР і Літаратурны музей Янкі Купалы праводзяць цыкл літаратурных вечароў «Па купалаўскіх мясцінах». Адзін з іх нядаўна адбыўся ў Любанскім раёне. Да працаўнікоў калгаса імя ЧБВА прыехалі навуковыя супрацоўнікі музея М. Чабатарэвіч і Н. Вітушка, пісьменнік С. Шушкевіч і іншыя.

У Доме культуры сабраліся калгаснікі, ветэраны сельскагаспадарчай вытворчасці. Усе яны з цікавасцю агледзелі купалаўскую выстаўку, падрыхтаваную супрацоўнікамі музея, з радасцю прыгадалі разам з гасцямі тыя дні, калі тут бываў народны пясняр.

Я. САДОЎСКІ.

АРКЕСТРАЎ ЗВОНКІХ МЕДЗЬ

У тэатральнай зале Мінскага акруговага Дома афіцэраў з поспехам прайшоў конкурс духавых аркестраў Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Асабліва шмат аматараў духавой музыкі сабраў заключны канцэрт, у якім прынялі ўдзел лепшыя калектывы.

Пачалося гэтае свята духавой музыкі «Святочнай уверцюрай» Д. Шастаковіча. Выконваліся ўступленне да 3-га дзеяння оперы Р. Вагнера «Лаэнгрын» і фантазіі на тэмы песень І. Дунаеўскага, венгерскі танец № 5 І. Брамса і канцэрт для трубы з аркестрам І. Гайдна, раманс з оперы К. Малчанава «А досвітні тут ціхія» (салістка Л. Пакідчанка) і рапсодыя Б. Дзіева на тэмы мелодый народаў СССР.

Значнае месца ў рэпертуары занялі творы беларускіх кампазітараў. Гучалі «Лявоніха» Я. Глебава, «Бульба» А. Мдзівані, сюіта для духавога аркестра «Беларуская мазаіка», «Палессе», «Вясновыя песні» Э. Казачкова, «Вясковае свята» Г. Суруса (салістка — цымбалістка Т. Чанцова), «Песня аб Радзіме» Д. Смольскага...

На здымку: выступае духавы аркестр штаба ЧБВА. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор, заслужаны артыст БССР падпалкоўнік Б. Чудакоў.

Фота Ул. КРУКА.

ПРОЗА ШАМЯКІНА — З ЭСТРАДЫ

Апавяданне народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы Івана Шамякіна «Хлеб», а таксама фрагменты з пенталогіі «Трывожнае шчасце», раманаў «Сэрца на далоні», «Атланты і карыятыды», «Снежныя зімы» гучалі са сцэны Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Артыст С. Сакалоў, які пазнаёміў з імі прыхільнікаў таленту пісьменніка, перадаў сам дух шамякінаўскай прозы, яе надзвычайную сацыяльную напоўненасць і грамадзянскую скіраванасць, яе важкі агульначалавечы змест.

СТУДЭНЦКАЯ «МАЙСТРОЎНЯ»

Малады студэнцкі тэатральны калектыў «Беларуская драматычная майстроўня», які год назад створаны на філфаку БДУ, паставіў беларускую народную драму «Цар Максімілян».

Імкненне самадзейных акцёраў знішчыць бар'ер між сцэнай і залай, непасрэднасць ігры, што ідзе ад народнай традыцыі, — усё гэта захапіла гледачоў. На прэм'еры прысутнічалі пісьменнікі У. Караткевіч, В. Сёмуха, А. Разанаў, тэатразнавец Г. Колас. Пасля спектакля адбылася зацікаўленая гаворка гасцей са студэнтамі.

Фота У. КУПРЭЕВА.

Вінцэнт Вячорка ў ролі Адольфа.

ПРА ЛІТАРАТУРУ — ХІМІКАМ

На сустрэчу са студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна прыйшла група супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Адбылася гаворка на тэму: «Беларуская літаратура — гісторыя, сучасны стан, выхад да зарубежнага чытача».

У. Мархель расказаў пра літаратурнае і грамадскае жыццё Беларусі XIX стагоддзя, прачытаў свае пераклады твораў Вінцэся Каратынскага, чый паўтаравяковы юбілей будзе адзначацца ў жніўні.

Цікавымі былі таксама выступленні Я. Лецкі і Л. Казыры. Госці адказалі на пытанні слухачоў, падзякавалі арганізатарам сустрэчы — намесніку дэкана факультэта В. Самахвалу і выкладчыку А. Казыру — за магчымасць абмяняцца думкамі са студэнцкай моладдзю.

НА РАДЗІМЕ ПАЎЛА ТЫЧЫНЫ

Вёска Пяскі Баброўніцкага раёна на Чарнігаўшчыне. Тут у 1891 годзе нарадзіўся хлопчык, якому суджана было стаць выдатным украінскім савецкім паэтам, вучоным і грамадскім дзеячам. Паўло Тычына! Гэта ён стварыў неўміручыя радкі, што вядомы ўсяму свету:

Ля царквы на людной площы
рэвалюцыя ідзе.
— Хай пастух,—усе гукнулі,—
атаманіць і вядзе.

Слынны ўкраінскі пясняр услаўляў братэрства, заклікаў усіх людзей добрай волі жыць «у дружбе моцнай, як са сталі, у дружбе шчырай міжнароднай». І яго справядліва назвалі будаўніком мастоў дружбы. Тычына часта выязджаў у братнія рэспублікі, быў асабіста знаёмы з многімі савецкімі пісьменнікамі. Сярод яго сяброў былі Джамбул і Аванясян, Янка Купала і Якуб Колас, ён перакладаў іхнія творы на ўкраінскую мову. Моцныя масты дружбы наладзіў ён, як перакладчык, з Грузіяй, Асеціяй, Літвою, Латвіяй, Башкірыяй, Чувашыяй, Узбекістанам, а таксама з Балгарыяй, Чэхаславакіяй, Польшчаю, Румыніяй.

У вёсцы Пяскі—свята. На мітынгу, прысвечаным адкрыццю помніка Тычыну, выступіў сакратар Чарнігаўскага абкома партыі В. М. Полавец.

— Сорак год назад, — зазначыў ён,—са старонак «Правды» на ўсю нашу краіну прагучалі радкі верша Тычыны «Партыя вядзе». Гэты твор стаў праграмным для нашых літаратараў, вызначыў напрамак ідэалагічнай работы.

— Сёння вялікае свята ўкраінскай культуры,—сказаў лаўрэат Ленінскай прэміі, Герой Сацыялістычнай Працы Алесь Ганчар. — Ушаноўваючы памяць вялікага песняра, чыё імя ў сузор'і найвялікшых паэтаў свету, Чарнігаўшчына ведае, што яна дала свету шмат слаўных стваральнікаў нашай культуры. Дзесьці тут жыў і працаваў легендарны аўтар неўміручага «Слова». Тут вучыўся Мікалай Гогаль. З Прыдзяснянскага краю — Міхайла Кацюбінскі. На гэтай зямлі разгарнуў свае дужыя крылы Аляксандр Даўжэнка. У гэтым цудоўным шэрагу бачым і вобраз Паўла Тычыны.

Усхваляваныя словы песняру дружбы прысвяцілі сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Л. Навічэнка, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Украіны Б. Алейнік, маскоўская паэтэса Ларыса Васільева і іншыя.

Спадае белае палотнішча, і ўсе бачаць такія знаёмыя рысы аблічча Паўла Тычыны. Паэт у бронзе вярнуўся ў роднае сяло і стаў каля бацькоўскай хаты (адноўлена па чарцяжах і ўспамінах аднавяскоўцаў), у якой адкрываецца мемарыяльны музей.

У паэтычнай пераклічцы, апрача ўкраінскіх майстроў слова, удзельнічалі госці з Масквы і Ленінграда, саюзных рэспублік.

Дванаццаць пісьменніцкіх брыгад пабывалі ў гарадах і раённых цэнтрах Чарнігаўшчыны. Літаратурная сустрэча адбылася ў вёсцы Сенькаўка на мяжы Украіны, Расіі і Беларусі. Традыцыйнае інтэрнацыянальнае свята літаратуры і мастацтва, якое названа вядомым тычынаўскім радком «Пачуццё сям'і адзінай», закончылася вялікім літаратурным вечарам у памяшканні абласной філармоніі.

У правядзенні ўрачыстасцей на Чарнігаўшчыне прымалі ўдзел старшыня рэспубліканскага юбілейнага камітэта па святкаванні 90-годдзя з дня нараджэння П. Тычыны, намеснік Старшыні Савета Міністраў УССР М. А. Орлік, загадчык аддзела культуры ЦК Кампартыі Украіны Б. В. Іваненка.

На здымку: помнік Паўлу Тычыну на радзіме паэта.

Аляксей ПЫСІН.

У САЮЗНЫМ ДРУКУ

Выйшаў у свет чарговы выпуск альманаха «Истоки» (выдавецтва «Молодая гвардия»). Ён поўнасцю прысвечаны творчасці ўдзельнікаў VII Усесаюзнай нарады маладых пісьменнікаў. Амаль сто маладых літаратараў з усіх рэспублік выступаюць у зборніку. Сярод іх — У. Някляеў, С. Законнікаў, А. Салтук і іншыя.

●

Падборку вершаў савецкіх паэтаў «Мне зноў прыснілася вайна...» публікуе ў пятым нумары часопіс «Дружба народов». Прадстаўлены ў ёй і беларускія аўтары: А. Зарыцкі (пер. І. Бурсаў) і Ю. Свірка (пер. І. Васілеўскі).

У гэтым жа нумары ў рэцэнзіі «Якім ты станеш, чалавек?» У. Гніламёдаў рэцэнзуе кнігі паэзіі П. Панчанкі «Дзе начуе жаваранак» і «Млечны шлях», выпушчаныя выдавецтвам «Мастацкая літаратура» ў 1979 і 1980 гадах.

Пераклад І. Шклярэўскім на рускую мову «Слова аб палку Ігаравым», змешчаны ў дзевятым нумары часопіса «Октябрь» за мінулы год, аналізуе А. Мальгін.

●

Герою Савецкага Саюза Веры Харужай, нашай выдатнай зямлячцы, прысвяціў дакументальную аповесць «Нарвіце пралесак» Б. Кацельнікаў. Твор гэты, які пабачыў свет у выдавецтве «Молодая гвардия», — праўдзівы расказ пра слаўную дачку беларускага народа. Пасляслоўе да кнігі напісаў былы сакратар ЦК КПБ П. К. Панамарэнка.

●

«Гераічнае ў мастацтве» — так называецца новая манаграфія вядомага мастацтвазнаўца Георгія Кучарэнкі, якая выйшла ў выдавецтве «Изобразительное искусство». Аўтар аналізуе ідэйна-маральныя вытокі, характар і асаблівасці ўвасаблення гераічнай тэмы ў выяўленчым мастацтве пасляваеннага перыяду.

Сярод тых, пра каго расказваецца ў кнізе, беларускія жывапісцы Міхась Саніцкі і Гаўрыла Вашчанка.

●

Неўзабаве споўніцца сорак гадоў з дня выхаду ў свет сатырычнага выдання «Раздавім фашысцкую гадзіну». Пазней гэта выданне стала часопісам «Вожык», і ён (таксама неўзабаве) выйдзе з лічбай «1000» на вокладцы. Гэтым падзеям часопіс «Крокодил» прысвяціў у № 13 артыкул свайго спецкарэспандэнта І. Левіна, які расказвае чытачам аб тым, як зброяй ідэалагічнай барацьбы станавілася на старонках «Раздавім фашысцкую гадзіну» слова Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, М. Лынькова, М. Танка, П. Панчанкі, А. Астрэйкі.

●

«Аўтабіяграфія пакалення» — так называецца вялікі матэрыял у часопісе «Литературная учеба» № 2. Паведамляецца, што за перыяд паміж VI і VII з'ездамі пісьменнікаў СССР у члены творчага саюза было прынята больш за тысячу маладых літаратараў. Праблемы творчага станаўлення і развіцця, публікацыі і рэдагавання мастацкіх твораў, выдання кніг, садружнасці паміж вопытнымі майстрамі і літаратурнай зменай разглядаюцца ў выступленнях удзельнікаў анкеты, на пытанні якой адказваюць маладыя празаікі, паэты і крытыкі. У гэтым нумары апублікаваны выказванні беларускіх празаікаў Яўгена Лецкі і Уладзіміра Ліпскага.

●

«Радуга» — так называецца падпісная бібліятэчка мастацкай самадзейнасці, якую выпускае ўкраінскае выдавецтва «Мистецтво». Нядаўна выйшаў яе чацвёрты нумар за сёлетні год. Сярод іншых твораў, што адрасуюцца культасветработнікам, і аднаактовая камедыя А. Махнача «Смык і капуста», якую на ўкраінскую мову пераклаў А. Дэка.

ЗАХОПЛЕНАСЦЬ ПЛЮС МАЙСТЭРСТВА

Выступае народны ансамбль танца «Вясёлка».

Фота Ул. КРУКА.

Пры Палацы культуры Белсаўпрофа працуе шмат калектываў мастацкай самадзейнасці, якія даўно заваявалі любоў гледача не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Па добрай традыцыі многія з іх штогод выступаюць са справаздачнымі канцэртамі. На мінулым тыдні дэкада калектываў мастацкай самадзейнасці палаца праходзіла ў дваццаць чацвёрты раз.

Адкрыў дэкаду народны оперны тэатр. Была паказана опёра вядомага польскага кампазітара С. Манюшкі «Слова гонару». Потым сваё майстэрства паказвалі ўдзельнікі народнай харавой капэлы, студыі класічнага танца, ансамбля скрыпачоў і іншых калектываў.

Па - сапраўднаму святочныя моманты перажылі тыя, хто пабываў на выступленні Узорнага дзіцячага хору «Сонейка», таксама на канцэрце Узорнага дзіцячага харэаграфічнага калектыву «Мара».

Дружнымі апладысментамі сустракала зала і выступленні вакальна - харавога ансамбля «Юнацтва», цыркавога калектыву, студыі бальнага танца і студыі дэкламатара, а аматары сцэнічнага мастацтва з задавальненнем паглядзелі спектакль па п'есе Р. Каўгвера «Свой востраў» у пастаноўцы народнага тэатра палаца.

Заключны ж канцэрт, што адбыўся ў нядзелю, ператварыўся ў сапраўднае свята самадзейнасці, удзел у якім прынялі дзесяткі танцораў, спевакоў, дэкламатараў.

ПЕРШАЕ ГАРАДСКОЕ...

Упраўленне культуры Мінгарвыканкома і Міжсаюзны Дом самадзейнай творчасці Мінскага аблсаўпрофа ў мінулую нядзелю ў скверы імя Янкі Купалы беларускай сталіцы правялі першае гарадское свята самадзейнага выяўленчага мастацтва, на якое прыйшлі мінчане і госці горада-героя.

Пачалося свята з конкурсу дзіцячага малюнка на асфальце. Дзесяткі юных мастакоў — конкурс праводзіўся па кожнай узроставай групе—на некалькі гадзін ператварылі набярэжную Свіслачы ў вялікае, маляўнічае палатно. Хлопчыкі і дзяўчынкі з захапленнем малявалі тое, што найбольш блізка ім і дорага. Ажывалі пад рознакаляровай крэйдай краявіды роднай зямлі, сюжэты, падказаныя казкамі і творамі пісьменнікаў, партрэты сяброў і знаёмых. На большасці малюнкаў было мірнае, блакітнае неба...

Цікавасць у наведвальнікаў выклікаў і конкурс-вернісаж эцюдаў. І, вядома, выступленні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Мінска.



На здымку: малююць удзельнікі свята.

Фота Ул. КРУКА.

АМАТАРСКАЙ КІНАСТУДЫІ—ЗВАННЕ НАРОДНАЙ

Пяць гадоў працуе аматарская кінастудыя Мінскага вытворчага аб'яднання індустрыяльнага домабудавання. За гэты час знята 18 фільмаў, чатыры з якіх адзначаны граматамі і дыпломамі лаўрэатаў.

Аб чым жа расказваюць аматарскія стужкі будаўнікоў? З дапамогай кінакамеры яны праўдзіва і выразна адлюстроўваюць наш час, стваральныя будні савецкіх людзей, прыгажосць роднага краю.

На высокім узроўні зроблены фільмы «Камуністычны суботнік», «Прапагандыст», «Запрашэнне на злёт», «Турыст» і іншыя.

У студыі пасля заняткаў нярэдка можна бачыць вучняў трох падшэфных школ. Школьнікі па сваіх сцэнарыях знялі кінастужкі «Бывай, дзесяты класі», «Мы будуем студыю», «Наш Дом піянераў». Абяцае быць цікавым мультфільм аб ахове навакольнага асяроддзя.

Кіруе студыяй вопытны майстар сваёй справы Міхаіл Трайцяк.

Вытворчае аб'яднанне паклапацілася аб стварэнні спрыяльных умоў для плённай работы. Цяпер тут абсталявана зала агучвання фільмаў, кінапраекцыйная, мантажная, фільмасховішча, фоталабараторыя і лабараторыя па апрацоўцы плёнкі, майстэрня і пакой для камбінаваных здымак.

Нядаўна аматарскай кінастудыі «Домабудаўнік» прысвоена званне народнай.

У. АНТОНАЎ.

ФІЛІЯЛ ФІЛАРМОНІІ Ў МАЗЫРЫ

У Мазыры пачаў працаваць філіял Гомельскай абласной філармоніі. Артысты філіяла А. Сарокін, В. Смоляр, Э. Елязараў, Л. Мініна і музыказнавец З. Камоска паказалі прэм'еру — лекцыю-канцэрт «Фальклор і прафесійная творчасць».

Пры філіяле пачаў працаваць таксама эстрадны дыксіленд і група эстрадных выканаўцаў. Артысты будуць абслугоўваць працаўнікоў Мазыра і раёна.

Адрас паездкі—Гродна

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце паспяхова працуе літаратурнае аб'яднанне «Наднёманскія галасы», якім кіруе малады паэт, кандыдат філалагічных навук М. Губернатараў. Пачаткоўцы змяшчаюць свае творы ў мясцовым друку, былі аўтарамі зборніка, што так і называўся — «Наднёманскія галасы», выпушчанага Выдавецтвам БДУ імя У. І. Леніна.

У іх у гасцях нядаўна пабывалі паэты А. Вольскі, В. Іпатава, П. Макаль, Г. Пашкоў, а таксама гродзенскія літаратары Д. Бічэль-Загнетава, А. Карпюк, А. Пяткевіч. Адбылася зацікаўленая гаворка аб сучаснай беларускай літаратуры, аб далейшых перспектывах яе развіцця.

ПАРАДЫ І УРОКІ

У Доме творчасці Літфонду СССР у Піцундзе адбыўся традыцыйны ўсесаюзны семінар па драматургіі. Яго работай кіравалі вядомыя тэатразнаўцы Уладзімір Піменаў і Іна Вішнеўская, асобныя групы ўзначальвалі вопытныя прафесійныя драматургі. Ад Беларусі ў семінары ўдзельнічалі Алесь Дударэў і Святлана Клімковіч.

У. СІЛІЧ.

РАДУЮЦЬ ГЛЕДАЧОЎ

Больш за пятнаццаць гадоў радуе сваім сцэнічным майстэрствам Хожаўскі танцавальны калектыў Маладзечанскага раёна, які быў лаўрэатам Першага ўсесаюзнага фестывалю народнай творчасці.

А пачынаўся калектыў з невялічкага гуртка. Потым кіраваць ім стаў настаўнік Хожаўскай сярэдняй школы Уладзімір Свістуноў. У кароткі час ён згуртаваў вакол сябе энтузіястаў. Разам са Свістуновым у першых канцэртах з захапленнем выступалі браты Георгій і Веніямін Кучынскія, Галіна Баннікава і Таіса Гарошка, Марына Сыраватка і Святлана Полаз, іншыя хлопцы і дзяўчаты. Ужо тады радавалі гледачоў «Хожаўская полька», «Лявоніха», «А мы хожаўскія хлопцы».

А ўсяго за пятнаццаць гадоў было ажыццёўлена каля семнаццаці пастановак. У. Свістуноў перадаў эстафету Мікалаю Гарошку, які з поспехам працягвае добрыя традыцыі свайго папярэдніка.

У. МАНГІНОВІЧ.

ПЕСНЮ Ў ДАРОГУ ВАЗЬМУ

Дыпламантам ВЦСПС стаў вакальны мужчынскі ансамбль Лунінецкага лакаматыўнага дэпо. Гэтай узнагародай калектыў адзначаны за вялікія поспехі ў развіцці самадзейнай мастацкай творчасці і ў сувязі з 35-годдзем з дня стварэння.

За 35 гадоў свайго існавання калектыў выступіў больш чым з 300 канцэртамі. У рэпертуары — беларускія народныя песні і песні сучасных кампазітараў.

З асаблівым задавальненнем выконваюць самадзейныя артысты песні, напісаныя мясцовым самадзейным кампазітарам Я. Куфайкіным.

Кіруе ансамблем выкладчык музычнай школы Б. Шчур.

М. МІКАЛАЕЎ.

НОВЫЯ ПЕРАКЛАДЫ

Лодзінскае выдавецтва рэгулярна знаёміць польскага чытача з беларускай літаратурай. Нядаўна выпушчаны зборнік паэзіі Д. Бічэль-Загнетавай у перакладах Я. Гушчы, Т. Хрусцялеўскага, М. Канановіча і І. Сікірыцкага.

Штотыднёвік «Пшыязнь» — орган Таварыства польска-савецкай дружбы—змясціў у адным з нумароў з гэтай нагоды рэцэнзію, а таксама адзін з вершаў паэтэсы.

У. СТРУМІЛА.

ВЫСТАЎКІ

І МІНУЎШЧЫНА, І ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

У ЗАЛАХ Дзяржаўнага мастацкага музея БССР зноў адкрыта для наведвальнікаў пастаянная экспазіцыя беларускага савецкага мастацтва. Выстаўка знаёміць гледача з лепшымі творамі беларускіх жывапісцаў і скульптараў, дае магчымасць прасачыць развіццё выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі ад яго вытокаў да нашых дзён.

Плённай і разнастайнай была творчая дзейнасць беларускіх мастакоў да вайны. Партрэты М. Філіповіча, М. Станюты, М. Тарасікава, Ю. Пэна, пейзажы У. Кудрэвіча і М. Слепяна, тэматычныя карціны С. Каўроўскага і А. Шаўчэнкі даюць уяўленне пра асаблівасці развіцця беларускага мастацтва перыяду яго станаўлення, сведчаць аб багацці творчых манер і стыляў.

На вялікі жаль, у музеі знаходзяцца нешматлікія творы даваеннага перыяду: фашысцкія захопнікі ў час Айчыннай вайны абрабавалі і мастацкую спадчыну нашага народа.

Дзе б ні знаходзіліся ў час вайны беларускія мастакі — на фронце ці ў тыле, на акупіраванай тэрыторыі або ў партызанскім атрадзе, — усім ім было ўласціва адно: акрамя выканання свайго салдацкага абавязку, яны працягвалі актыўна працаваць творча.

Галоўнае месца сярод жанраў у гэты час і ў савецкім мастацтве ўвогуле, і ў беларускім, у прыватнасці, заняў партрэт. Стрыманы, строгі, але разам з тым багаты па фарбах каларыт, свабодная, тэмпераментная манера пісьма ўласціва жывапісным партрэтам Я. Зайцава і Я. Ціхановіча. Скульптар З. Азгур у час вайны стварыў цэлую галерэю партрэтаў сваіх землякоў — байцоў Савецкай Арміі, партызан. Партрэт Героя Савецкага Саюза лётчыка Мікалая Гастэлы А. Бембеля — адзін з лепшых твораў усёй савецкай ваеннай пластыкі.

Гераіка-патрыятычная тэма ўсур'ёз заяўляе пра сябе ў беларускім мастацтве пасляваеннага часу.

Імкненнем раскрыць у канкрэтным эпізодзе істотныя бакі падзеі, выклікаць пэўныя асацыяцыі прасякнуты твор «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» І. Ахрэмчыка. Выразная кампазіцыя, завершаныя характарыстыкі герояў, паказаных буйным планам, пераканаўча перадаюць дынаміку і напружанасць падзей. Вялікае значэнне ў кампазіцыі мае дакладна знойдзены рух, жэсты, складаныя ракурсы, а таксама кантрастныя супастаўленні ценю з асветленымі часткамі карціны. Дэталёва характарызуюцца абставіны і месца дзеяння. Усе элементы карціны заклікаць апавядаць аб гераічным подзвігу маленькай групы савецкіх людзей, якія стаялі насмерць, абараняючы Брэсцкую крэпасць.

Суровасць, пэўны, аскетызм мужнага, поўнага высокай героікі і драматызму мастацтва папярэдняга перыяду змяняецца ў 50—60-я гады паўнагучнасцю фарбаў жыцця, больш шырокай гамай чалавечых пачуццяў і перажыванняў. З гэтага часу сучаснасць, яе глыбінныя працэсы, яе надзённыя праблемы і задачы становяцца ў цэнтры ўвагі беларускіх мастакоў.

Беларускую Ленініяну гэтага часу прадстаўляе ў экспазіцыі скульптурная кампазіцыя «Ленін-правадыр» А. Бембеля. Для стварэння вобраза правадыра скульптар абраў матыў непасрэднага выступлення Леніна перад народам. Сілуэтная выразнасць вобраза, дынаміка кампазіцыі пераканаўча перадаюць характар і своеасаблівасць ленінскіх выступленняў, заўсёды прасякнутых страснасцю, багаццем пачуццяў. Энергічны жэст ленінскай рукі, выразная пластыка твару даносяць да нас пафас ленінскай думкі і адначасова падаюць рысы канкрэтнасці вобразу. Тут жа, побач з правадыром, мы ўяўляем сабе і людзей, якія ўважліва слухаюць яго.

У карціне «Раніца ў Кастрычніку» Н. Воранаў імкнецца вырашыць тэму праз постаць рабочага-байца. Аўтар вылучае яе на фоне панарамы старога Мінска. Постаць як бы пануе над наваколлем. Гэты прыём надае ёй манументальнасць, асаблівую важкасць. З уласцівым мастаку пачуццём часу Воранаў праўдзіва перадае трывожную атмасферу рэвалюцыйных гадоў. Яна адчуваецца літаральна ва ўсім: у напісаным па-майстэрску гарадскім пейзажы, у постацях людзей, у святле кастра.

На рубяжы сямідзесятых гадоў беларускае мастацтва асабліва дынамічнае ў сваім развіцці. Вострае адчуванне часу, пранікненне ў сутнасць падзей, імкненне перайсці ад непасрэднага назірання да філасофскага асэнсавання, абагульнення, імкненне стварыць ёмістыя, значныя мастацкія вобразы — вось найбольш характэрныя рысы мастацтва гэтага перыяду. Беларускія мастакі творча пераасэнсоўваюць мастацкія традыцыі розных эпох. Лінія, колер, кампазіцыйныя прыёмы пачынаюць выступаць у больш складаным узаемадзеянні.

Карціна «Партызанскае вяселле» М. Данцыга адразу захапляе сваёй маштабнасцю, маляўнічасцю, багаццем каларыту. Яна ўспрымаецца як святочная харавая сцэна. У простым, здавалася б, жыццёвым сюжэце мастак здолеў многае ўбачыць, многае расказаць аб партызанскім жыцці і барацьбе.

Аўтарскім роздумам прасякнуты эпічны пейзаж В. Грамыкі «Чырвоныя землі Полаччыны». У гэтым палатне своеасаблівае пластычнае вырашэнне прасторы, а таксама дэкаратыўнасць, абагульненасць гучання колераў. Гармонія чыстых, лакальных тонаў, пругкасць лінейных абрысаў зямлі нараджаюць лірыка-манументальны вобраз Полаччыны. Абеліск, які відаць удалечыні, гучыць як напамінак аб дарагой цане, якая заплачана за магчымасць жыць і працаваць на роднай зямлі.

У беларускім мастацтве 70-х гадоў прыкметна імкненне да большай псіхалагічнай паглыбленасці, павышэнне цікавасці да чалавечай асобы, паказу багацця жыцця праз асабістыя пачуцці і перажыванні.

Прадстаўленая ў экспазіцыі работа Л. Шчамялёва «Нядзеля» вабіць сваёй дэкаратыўнасцю, рытмікай колеравых плоскасцей. Аўтар імкнецца фарбамі вырашаць вобразныя задачы: ён адчувае вялікія магчымасці тапальнага багацця колеру, колеравых кантрастаў, сілуэта. Карціна ўздзейнічае на гледача сваім агульным настроем. Яна ўводзіць нас у складаны духоўны свет людзей, у сферу іх пачуццяў, поўных прыхаванага драматызму.

У скульптуры Л. Гумілеўскага «Крылатая» ёсць сапраўдная экспрэсія, рух, шырыня дыхання, пачуццё радасці. Агульнаму ўражанню дапамагае багата распрацаваная пластыка адзення з яго неспакойным рухам складак. Антычны вобраз Нікі, творча пераасэнсаваны, выступае ў гэтым творы сучасна, канкрэтна, як сімвал квітнеючай Беларусі.

У апошні час беларускае мастацтва прыкметна ўзбагачаецца новымі мастацка-вобразнымі рашэннямі. Разам з ужо распрацаванымі прыёмамі раскрыцця характэрнага, тыповага ў канкрэтных з'явах развіваецца і другая тэндэнцыя — імкненне да сінтэзу, абагульнення. Мастака цяпер пачынае хваляваць свет ужо не ў адзінкавых выяўленнях, а ў агульных яго заканамернасцях.

Падобную канцэпцыю развівае ў сваім творы «Нафтавікі Палесся» Г. Вашчанка. Пераўтварэнне Палесся — аднаго кутка беларускай зямлі — у яго выступае як частка вялікіх змен усяго нашага жыцця. Для раскрыцця зместу твора мастак знаходзіць свае сродкі. Асновай вобразнага ладу карціны з'яўляецца строгая, прадуманая, ураўнаважаная кампазіцыя з падкрэсленым цэнтрам. Мастак выкарыстоўвае прыём супрацьпастаўлення роўных, застылых канструкцый на пярэднім плане і пейзажнай прасторы — жывога, вялікага свету прыроды. Прырода, людзі, плён іх працы — гэта адзіны працэс, у якім чалавек выступае як гаспадар і стваральнік. Гэтае адзінства адчуваецца ў агульнай канструктыўнасці ўсіх пластычных элементаў карціны.

Перад сучасным беларускім выяўленчым мастацтвам адкрыты неабсяжныя далягляды росту. Кожная рэспубліканская выстаўка падае новыя рысы нашаму мастацтву. Малавядомай была творчасць беларусаў у мінулым, зараз мастацтва Савецкай Беларусі займае пачэснае месца сярод мастацтваў народаў СССР, творы беларускіх мастакоў часта экспануюцца на замежных выстаўках.

Сустрэча з прыгажосцю заўсёды хвалюе, тым больш — сустрэча з мастацтвам свайго народа.

Н. БАРАНОЎСКАЯ,
А. РУНЕЦ,
навуковыя супрацоўнікі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

Выступае Дзяржаўны народны хор БССР.

Фота Ул. КРУКА.

ПРА ЧАС І ПРА СЯБЕ

ЛІТАРАТУРА — ГЭТА НЕПАКОЙ...

«Біяграфія чалавека — гэта яго непакой аб нечым», — гэтыя словы Алеся Харытонавіча Асіпенкі прымусілі задумацца.

Так, непакой. Ён праходзіць праз усе яго творы, праз усё жыццё. І якую б рэч А. Асіпенкі мы ні ўзялі, няхай то будзе «Жыта», «Канец бабінага лета», «Два дні і дзве ночы» або «Непрыкаяны маладзік», — абавязкова адчуем — бо нельга не адчуць — гэты непакой за нашу зямлю, за жыццё на ёй, за чалавека, за яго душу.

Алесь Харытонавіч — цікавы субяседнік. За яго плячамі вялікі і складаны жыццёвы і творчы шлях.

— Для пісьменніка вельмі важна мець добрую памяць. Без памяці няма празаіка, — гаворыць ён.

Памяць... Памяць, асветленая трывожным полымем партызанскіх вогнішчаў; памяць камсамольскага работніка на паўспаленай, галоднай пасляваеннай Магілёўшчыне; памяць журналіста і сталага пісьменніка. Паездкі, людзі, сустрэчы — усё гэта густа лягло ў яго творы.

— Пісьменніцкія лёсы — як лёсы чалавечыя. Празаік, — жартуе Алесь Харытонавіч, — мне нагадвае нечым каня: іншы рэзка рване воз, а потым — не цягне. А ёсць цягавітыя.

Ён належыць да апошніх...

У гэтым годзе А. Асіпенку за раман «Непрыкаяны маладзік» прысуджана Літаратурная прэмія імя І. Мележа. Але ён, як кажуць, не спачывае на лаўрах, ды і некалі — наперадзе багата работы. Я гляджу на яго, слухаю і міжволі прыгадваюцца словы з аўтабіяграфіі пісьменніка: «Я не адношуся да тых людзей, што задаволены сваім жыццём і гатовы ў другі раз ісці той жа дарогай, якой ішлі спярша. Мне заўсёды здаецца, што я нешта недарабіў, недзе не пабываў, штосьці згубіў, кагосьці дарэмна пакрыўдзіў і ўжо ніколі не выпраўлю памылкі маладосці, бо на гэта не хопіць жыцця».

Расказваць пра сябе гэты чалавек дужа не любіць, больш гаворыць пра сяброў, таварышаў па пяру, сваіх настаўнікаў. Прыгадваючы работу ў «Маладосці», з удзячнасцю ўспамінае Янку Брыля з яго карэктным падыходам да людзей, з уменнем бачыць тое, чаго не заўважаюць іншыя; Пімена Панчанку з яго няўрымслівасцю, шырокім колам інтарэсаў.

— Алесь Харытонавіч, не так даўно закончыў сваю работу VIII з'езд пісьменнікаў Беларусі. Скажыце, калі ласка, якія думкі, меркаванні ён выклікаў у вас?

— Пісьменніцкі з'езд, несумненна, вялікая падзея ў жыцці нашай рэспублікі. Ужо хаця б таму, што падсумоўвае вынікі зробленага, як бы збірае ручайкі літаратурнага працэсу ў адну магутную плынь, каб лепш выявіць тэндэнцыі развіцця. Трэба сказаць, што работа з'езда шырока асвятлялася ў друку і атрымала належную ацэнку. Што датычыць суб'ектыўных уражанняў, то мне падалося — шмат часу аддадзена дакладам і садакладам, у большасці інфармацыйным. Мне не зусім зразумелы і сам жанравы прынцып дакладаў. Чаму, напрыклад, па крытыцы садаклад і да чаго? Хапіла б аднаго аналітычнага даклада, у якім былі б вызначаны характар і тэндэнцыі развіцця літаратуры. І галоўнае — хацелася б значнай, заглыбленай гаворкі, бо з'езд — не сума выбаршчыкаў, а шчырая размова людзей, зацікаўленых лёсам літаратуры. А яна, гэтая размова, ішла не дужа жыва і ўзрушана... Праўда, напярэдадні з'езда ў друку прагучалі занепакоеныя галасы аб стане сённяшняй літаратуры. Зразумела, ніхто не аспрэчвае тых поспехаў, якіх яна дасягнула, яе вядомасці і ў нашай краіне, і за мяжой. І ўсё ж падставы для занепакоенасці ёсць: у артыкулах І. Шамякіна і Л. Дайнекі ў «Полымі» (№ 3) гучала трывога аб страчаных пазіцыях у прозе і паэзіі. Прагучала гэтая трывога і на з'ездзе ў выступленнях, напрыклад, В. Быкава і Г. Бураўкіна.

«І раманісты, і навелісты, — сказаў В. Быкаў, — навучыліся працаваць роўна, «наверняка», і мне асабіста бачыцца ў гэтым пэўная адзнака стагнацыі, калі ўсё вызначылася, пошук адсутнічае і яшчэ горш — адсутнічае малейшая рызыка».

Ужытае са сферы эканомікі слова стагнацыя і для літаратуры мае такое ж самае значэнне — застой. Гэта не можа не насцярожваць, хваляваць. Мы можам грэцца ў промнях чужога плёну, але ж варта задумацца і над тым, што далей?

Год назад у Балгарыі прайшла дыскусія па праблемах сучаснай балгарскай літаратуры. Пенча Данчаў заклікаў балгарсіх пісьменнікаў вывесці літаратуру са стану парушанага дыхання і кровазвароту і вярнуць нармальны для яе стачу непакой і хваляванне. У нас, можа, яшчэ і не зусім парушаны дыханне і кровазварот, але падумаць пра непакой і хваляванне, напэўна, варта...

Літаратура ствараецца не за круглымі сталамі пасяджэнняў Дома літаратара, а ў хатніх зацішках, калі яны ёсць або надараюцца. У творах жа не павінна быць месца ні зацішку, ні абыякавасці. Мы навучыліся прафесійна пісаць, вынаходзіць прыдатныя тэмы і няблага іх распрацоўваць, але робім гэта іншы раз без узрушэння, без болю ў сэрцы. І тады ствараецца ўражанне, што некаторыя творы пісаліся пасля добрага абеду, калі цягне на адпачынак. Менавіта пра гэта якраз і не хапіла часу пагаварыць усхвалявана і клапатліва. Нашай крытыцы таксама належала б з большым непакоем гаварыць пра літаратурныя творы. Праўда, сённяшні крытык уяўляецца мне тарэадорам, які выйшаў на арэну стадыёна, але трымае чырвоны ласкут не ў руках, а прышытым на грудзях, ці не таму ён у адказны момант і паварочваецца спіной да небяспечнага аўтара, стараецца не раздражняць яго.

А зрэшты, з'езд прайшоў нармальна. Нам ёсць чым ганарыцца, ёсць чым і засмучацца.

— Сапраўды, нам ёсць чым ганарыцца. Кнігі пра Вялікую Айчынную вайну — адна з самых яркіх старонак нашай літаратуры. І гэта зразумела, інакш не можа быць. У Беларусі яна забрала кожнага чацвёртага, а на вашай радзіме, партызанскай Віцебшчыне, загінуў кожны трэці.

— Беларуская літаратура слаўная распрацоўкай ваеннай тэмы. У гэтым сэнсе беларускія літаратары шмат зрабілі адкрыццяў, здолелі сказаць сваё адметнае, менавіта беларускае слова. Мне адразу прыгадваецца, што яшчэ ў суровыя гады вайны Кузьма Чорны ў сваіх раманах так далёка і так глыбока глянуў на вайну і чалавека ў ёй. Многа і па-рознаму пасля пісалі нашы пісьменнікі пра вайну. У першыя пасляваенныя гады найбольш уражваў гераізм народа-пераможцы. Пра гэта не маглі не пісаць, не маглі не гаварыць. Усенародная партызанская барацьба здзіўляла ўвесь свет. І, зразумела, патрабавала эпапейнага вырашэння. Міхась Лынькоў у «Векапомных днях» зрабіў выдатную спробу паказаць размах вайны, складанасць чалавечых лёсаў. Потым няспынна ішла распрацоўка самых розных пластоў жыцця народа ў вайну: І. Навуменка адкрыў нам семнаццацігадовых, рамантычна ўспрымаўшых вайну хлопцаў; Я. Брыль у сваім рамане «Птушкі і гнёзды» глянуў на вайну па-філасофску; важкае і цікавае слова сказаў А. Адамовіч у сваёй дылогіі; І. Чыгрынаў у раманах «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві» зірнуў на вайну вачамі звычайных сялян, якія жылі і змагаліся на акупіраванай тэрыторыі; А. Кулакоўскі плённа распрацоўваў тэму чалавека на фронце і ў глыбокім тыле; І. Шамякін у «Трывожным шчасці» даў шырокую панараму франтавога і партызанскага жыцця. І пры ўсім тым В. Быкаў адкрыў цэлы свет складаных чалавечых пачуццяў і пакут, паражэнняў і перамог чалавека на вайне. Часам здаецца, ваенная тэма ўжо вычарпала сябе, і раптам глядзіш — з'яўляюцца адкрыцці на зведаным мацерыку ваеннай тэмы. Так, напрыклад, у кнізе «Я з вогненнай вёскі...» А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка вайна раптам павярнулася такім страшным бокам і такой мужнасцю людзей, што наўрад ці можна было б адлюстраваць усё гэта ў мастацкім творы. А вось зусім нядаўна А. Адамовіч у аповесці «Карнікі» глянуў на яшчэ адну з'яву, народжаную вайной. Думаю, тэма гэта бясконцая і хопіць яе не на адно пакаленне.

— І тым не менш, часам чуюцца галасы, што маладым, не бачыўшым вайну на свае вочы, не пад сілу сказаць пра яе сваё слова. Якая ваша думка наконт гэтага?

— У сувязі з гэтым мне хацелася б запярэчыць адной думцы, якая бытуе сярод некаторай часткі нашых маладых пісьменнікаў. У «Маладосці» (№ 4) малады здольны празаік А. Дудароў піша: «Напісаць гэтак жа як В. Быкаў пра вайну маладому літаратару не пад сілу. І не таму, што нестае быкаўскага таленту, майстэрства ці вопыту, а таму, што нестае ўласнага індывідуальнага адчування таго гераічнага часу і тых трагічных падзей».

Ці не адсякаецца гэтым самым ахвота ў маладых працаваць над тэмай вайны, як бы ставіцца заслона, маўляў, ты на вайне не быў — не напішаш праўдзіва. Прабачце, а як жа быць з Л. М. Талстым, які напісаў «Вайну і мір»? Можа, маё слова было б і не важкае, ды вось прыйшоў на дапамогу Э. Хемінгуэй. У «Литературной газете» (№ 19) ён у пісьме да Фіцджэральда Скота піша: «...І дзеля ўсяго святога, не засмучайся, што не быў на вайне». І раіць Ф. Скоту цэлы шэраг тэм, якія б ён мог распрацаваць, кажучы, што ўсе тэмы цікавыя і толькі бяссілле з'яўляецца сумнай тэмай. Калі стае быкаўскага таленту, майстэрства і вопыту, дык не трэба палохаць сябе адсутнасцю індывідуальнага адчування. Ды, зрэшты, талент, майстэрства і вопыт можна выкарыстаць, напрыклад, на паказ сённяшняй рэчаіснасці. Перакананы, што і пісьменнік, які не бачыў вайны, некалі зможа сказаць свежае, новае слова пра Вялікую Айчынную.

— Вайна або яе водгулле не магла не ўвайсці і ў вашы творы, творы непасрэднага ўдзельніка вялікіх падзей. Адразу ўспамінаюцца «Жыта», «Вогненны азімут», «Два дні і дзве ночы» і інш.

— Мне здаецца, усё наша пакаленне, якое было сведкам вайны, яно, я б сказаў, «атручана вайной». І не толькі ў творах ваенных. У кожным нашым творы адчуваецца яе дыханне. Давайце зірнём на творы І. Шамякіна. Пра што б ён ні пісаў, усюды адчуваецца гэтае дыханне вайны, а калі не яно, дык філасофія чалавека, які быў на вайне. Або маладзейшага І. Пташнікава: у кожным яго творы адчуваецца як бы позірк з той ваеннай пары на ўсё, што адбываецца зараз. Мне думаецца, што наша літаратура асветлена гэтымі падзеямі. Таму і нясе ў сабе вялікі гуманізм, яна чалавечная, наша літаратура, і ў гэтым вялікая яе сіла, яе поспех. Гэта тое, на маю думку, што павінна прысутнічаць у кожным творы. Вайна прынесла многа гора, але навучыла і любіць, навучыла ненавідзець ману і абыякавасць. Не страціць бы нам гэтай гуманістычнай традыцыі.

Так, у кожным маім творы вайна прысутнічае, калі пра яе нават не гавару...

— У апошні час можна часта пачуць папрок у адрас беларускай прозы за тое, што яна абыходзіць жыццё сучаснага горада. На гэта, мабыць, ёсць свае прычыны. Як вобразна сказаў Янка Сіпакоў, — усе мы з хат... Што вы думаеце на гэты конт?

— Я хацеў бы аспрэчыць думку, што мы мала пішам пра горад. Толькі ў трох нумарах «Полымя» і «Маладосці» за сёлетні год надрукаваны апавяданні пра гарадское жыццё І. Навуменкі, Л. Гаўрылкіна, аповесці—В. Гігевіча «На пераломе лета», І. Капыловіча «Бяроза на мяжы», апавяданні В. Хамчук і У. Арлова. Вось вам і ўсе мы з хат! А чаму тады трывога? Тут я згодны з І. Шамякіным, што мы ўвайшлі ў горад і пішам пра горад, але пакуль што вельмі лакальна, не вылазячы з рэдакцый, устаноў, навукова-даследчых інстытутаў. Дадам, што і не глыбока пішам, абмінаючы вострыя праблемы. З другога боку, мы нешта страцілі ў паказе сяла. У нас, калі можна сказаць, склалася такая сітуацыя, што мы і з вёскі выехалі, і горада не дасягнулі. А сучасная тэма чакае сваіх пісьменнікаў.

Тут нельга не сказаць пра адзін парадокс: мы вельмі часта гаворым пра вывучэнне жыцця, і калі даводзім, што сучасная вясковая тэма страціла свае пазіцыі, тлумачым гэта тым, што жывём у горадзе і дрэнна ведаем жыццё цяперашняй вёскі. Але чаму тады дрэнна ведаем гарадское жыццё — мы ж жывём у горадзе? Нашай прозе пра сучаснасць не хапае і праблемнасці, і смеласці, і добрай узрушанасці. І яшчэ трэба сказаць, што проза наша вельмі аднастайная ў стылявых адносінах. Мы не робім пошукаў, каб расказаць пра пэўныя з'явы ўласцівай ім мовай.

Зусім слушна гаворыцца пра тое, што ў нас мала кніг пра рабочы клас. Мала. А паспрабуйце пачытаць тыя, якія ёсць. Яны як бы па адным рэцэпце складзены. Па-мойму, тая забытоўленасць, што назіраецца ў кнігах пра вёску, зусім не падыходзіць для кніг аб горадзе. Зніклі з ужытку раманы-рэпартажы, ды і нашы нарысы пра рабочыя калектывы больш падобныя на падарожныя нататкі. А горад багаты на такія з'явы, якія б маглі стаць крыніцай для вельмі бескампрамісных твораў! Мы, можа, проста крыху абляніліся: больш ходзім на пасяджэнні, чым па мікрараёнах, рэдка бываем там, дзе збіраюцца людзі, а калі і заходзім на завод, то часцей у заводакіраўніцтва, дзе літаральна ашаламляюць лічбамі і фактамі.

Справа ўся заключаецца ў тым, што сапраўды трэба больш рызыкаваць. Напрыклад, у дакладных навуках тая ідэя лічыцца перспектыўнай, якая выглядае неверагоднай. Штампам чалавек карыстаецца таму, што гэта лёгка. Так сказана, так напісана... Навошта ж перапевы? Безумоўна, гарадскому чалавеку цікава чытаць пра горад. Але ж давайце адкрываць перад ім гарадское жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці і непаўторнасці. Чаму мала кніг пра горад? Па-мойму, у нас зараз ідзе працэс назапашвання матэрыялу. І, канечне, маладыя павінны смялей брацца за сур'ёзныя тэмы. Хай часам сустрэне і няўдача. Галоўнае, каб быў заглыблены позірк на горад. Прыгадайце творы М. Стральцова, большасць яго твораў — гэта не проста гарадская тэматыка. Цікава пра горад піша Я. Сіпакоў.

Мы, тыя, што выйшлі з хат, глядзім на горад па дужа няплённай звычцы: горад, маўляў, абязлічвае ўчарашняга вяскоўца, нявечыць яго душу. А горад жа — носьбіт культуры, асяроддзе выдатных людзей. Вядома, гэта вельмі цяжкая задача — пісаць пра прыгожага чалавека. Для гэтага трэба і вопыт, і майстэрства. У гэтым плане паэты абыходзяць празаікаў. Яны ўмеюць пісаць пра прыгажосць натхнёна і перакананўча.

— Алесь Харытонавіч, вы зараз працуеце над новым раманам «Святыя грэшнікі». Скажыце, калі ласка, гэта будзе твор пра сучаснасць?

— Мне пра гэта не вельмі хочацца гаварыць, бо я зараз знаходжуся на тым этапе, калі ўсё зробленае карціць перапісаць нанова. У новым рамане стараюся глядзець на рэчы ў аспекце непарыўнай повязі гісторыі і сучаснасці. І гэта зразумела, мы — дзеці сваёй гісторыі, дзеці сваёй эпохі... Работы наперадзе яшчэ шмат.

Інтэрв'ю ўзяў
А. ПІСЬМЯНКОЎ.

КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

КНІГАПІС

У. СКАРЫНКІН. Дазвольце ўзлёт. Вершы і паэмы. Аўтарызаваны пераклад з беларускай С. Красікава. М., «Советский писатель», 1980.

Уладзімір Скарынкін — адзін з найбольш актыўных беларускіх паэтаў так званага сярэдняга пакалення, які з поспехам піша пра авіятараў, людзей, блізкіх яму па прафесіі. У той жа час ён, як і іншыя яго равеснікі, у творах сваіх раскрывае вечныя тэмы любві да бацькаўшчыны, дружбы, кахання, сяброўства. І, вядома ж, звяртаецца да падзей Вялікай Айчыннай вайны, якая пякельным болем сваім апаліла яго сэрца ў маленстве.

Цяпер з творчасцю У. Скарынкіна пазнаёміўся ўсесаюзны чытач. Зборнік «Дазвольце ўзлёт», перакладзены на рускую мову С. Красікавым, — першая кніга беларускага паэта, якая выйшла ў Маскве.

Е. ДРОМІН.

Праз цярні — да зорак!

Уладзімір Караткевіч, пяцідзесяцігоддзе якога нядаўна з годнасцю адзначала грамадскасць рэспублікі, выдаў два тамы сваіх выбраных твораў, якія бачацца нам пэўным падрахункам творчага плёну аднаго з нашых самых папулярных празаікаў. Гэты двухтомнік яшчэ раз сведчыць, што У. Караткевічу, як пісьменніку і чалавеку, абсалютна чужы дрымотна-асалавелы спакой, сузіральнасць, што нярэдка яшчэ даюць аб сабе знаць у творах некаторых аўтараў. Творчасць Караткевіча—гэта сама грамадзянскасць у дзеянні, ваяўнічая непрымірымасць у адносінах і да вялікага, і да малога зла, якой бы апраткай яно ні прыкрывалася. Караткевіч, безумоўна, належыць да тых майстроў прыгожага пісьменства, для якіх творчасць — гэта падзвіжніцтва ў імя ідэалаў гуманізму, дабра і справядлівасці.

У двухтомнік выбраных твораў У. Караткевіча ўвайшлі добра вядомыя беларускаму і шырокаму савецкаму чытачу такія апавяданні, як «Дрэва вечнасці», «Вока тайфуна», «Калядная рапсодыя», «Залаты бог» і інш., аповесці «Лісце каштанаў» і «Чазенія», раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» («Евангелле ад Іуды»).

Мастацкі свет гэтага пісьменніка (маюцца на ўвазе і тыя, якія не ўвайшлі ў гэты двухтомнік, — гістарычныя раманы «Каласы пад сярпом тваім» і «Дзікае паляванне караля Стаха», яго драмы, кінасцэнарыі, вершы)—маляўнічы, шматслойны, складаны, праўдзівы, рэльефны, лірычна-паэтычны і па-філасофску глыбокі ў сваіх асноўных жыццёвых іпастасях. Пра што б ні пісаў У. Караткевіч — а яго творчыя інтарэсы ахопліваюць як гістарычнае мінулае беларускага народа, так і шматаспектны свет сучаснага жыцця, — ён заўсёды вывучае і па-мастацку ўзнаўляе рэчаіснасць як чалавек зацікаўлены, нераўнадушны, як чалавек, у якога выпрацавана ясная і выразная грамадзянская і маральна-этычная пазіцыя. Гэта ў поўнай меры ўласціва яго аўтабіяграфічнай аповесці «Лісце каштанаў», дзе так ярка раскрыта юнацкае парыванне, паказаны любоў і дружба, духоўны дотык герояў да першых радасцей і засмучэнняў. Гэтая пазіцыя адчуваецца ў элегічным апавяданні «Былі ў мяне мядзведзі», драматычнай навеле «Вока тайфуна» і асабліва ў пранікнёна-лірычнай аповесці «Чазенія».

Аднак галоўным чынам талент У. Караткевіча раскрыўся і выявіў сваю індывідуальную непаўторнасць у творах на гістарычную тэму. Канечне, і да Караткевіча рабіліся спробы па-мастацку ўзнавіць мінулае народа. Яшчэ сам Я. Купала ў паэме «Курган» вызначыў магістральную лінію развіцця гістарычнага жанру. Але ў асноўным беларуская гісторыя—рэвалюцыйная, трагічная, ахвярная, поўная агню і страсці — па сутнасці толькі пачынае сваё другое жыццё ў аповесцях і раманах. У. Караткевіч змог у мастацкай структуры сваіх твораў выпрацаваць законы і правілы гістарычнай раманістыкі, вызначыць межы гэтага жанру і перспектывы далейшага яго развіцця.

Тэма гістарычнага рамана — гэта заўсёды расказ пра далёкае мінулае, пра тую эпоху, якая быццам вычарпала сябе і не мае бачных рэалій у сучаснасці. Але мінулае не мёртвае, яно тысячамі ніцей пранізвае наша быццё. Таму гістарычны раманіст так або інакш адгукаецца сваім творам на покліч сучаснасці. Для яго гісторыя—гэта і нагода ўдыхнуць жыццё ў падзеі, што адшумелі, і асэнсаваць па-новаму сучаснасць у яе дынамічным развіцці.

У гэтым пераконваешся яшчэ раз, перачытваючы раман У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Мастак пераносіць чытача ў далёкае XV стагоддзе. Выдатны знаўца этнаграфіі, звычаяў, псіхалогіі людзей той эпохі, аўтар у аснову рамана кладзе спрадвечны канфлікт гуманізму з дэспатызмам. А каб не было ніякага сумнення ў актуальнасці гэтай праблемы, пісьменнік час ад часу знарок перапыняе плынь сюжэта заўвагамі, філасофскімі і публіцыстычнымі адступленнямі і нават зноскамі, каб разбурыць ілюзію падзейнай лакальнасці і зрабіць прарыў у сучаснасць. Героі У. Караткевіча групуюцца і размяжоўваюцца па маральна-этычным прынцыпе: з аднаго боку—гэта тыя, што ўвасабляюць зло, — нунцыі, манахі, военачальнікі, войты і іншыя прадстаўнікі пануючага класа, а з другога—хлебаробы, кавалі, рамеснікі,—тыя, хто спрадвеку стварае ма-

У. Караткевіч. Выбраныя творы ў двух тамах. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

ДАСЛЕДАВАННЕ ВЫТОКАЎ

Сёння мы назіраем павышаную цікавасць навуковай грамадскасці да літаратуры старажытнага часу і асабліва да яе пачатковага агульнарускага перыяду (X — XIII ст ст.), з якога бяруць свае вытокі братнія ўсходнеславянскія літаратуры — руская, беларуская і ўкраінская.

У ліку новых навуковых выданняў нельга не адзначыць кнігу «Древняя русская литература в исследованиях. Хрестоматия», складзеную Л. Гусевай і Л. Кароткай, дацэнтамі філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

Такога тыпу хрэстаматыі не існавала, і шматгадовы вопыт выкладання адпаведнага курса ў БДУ імя У. І. Леніна прывёў складальнікаў да пераканання ў яе неабходнасці для студэнтаў. І асабліва ўдзячныя за кнігу, як на тое і разлічвалі складальнікі, студэнты-завочнікі, бо многія з іх жывуць, працуюць і вучацца ў вёсках, пасёлках і невялікіх гарадах, дзе няма фундаментальных навуковых бібліятэк. Гэта акалічнасць пазбаўляе многіх завочнікаў магчымасці вывучаць сур'ёзныя навуковыя працы. У тым, што праца Л. Гусевай і Л. Кароткай у значнай ступені вырашае праблему, красамоўна сведчыць першы год работы па хрэстаматыі. Кніга досыць шырока адкрывае нашай моладзі дзверы ў свет старажытнай рускай літаратуры праз азнаямленне з гісторыка-літаратурнымі даследаваннямі яе, выкананымі буйнейшымі спецыялістамі краіны, стваральнікамі сучаснай навуковай гісторыі старажытнай рускай літаратуры на аснове глыбокага і ўсебаковага вывучэння «заканамернасцей гісторыка-літаратурнага працэсу ва ўсёй яго мнагастайнасці».

Пачынаецца хрэстаматыя невялікімі асноватворнымі пры вывучэнні літаратурнай навукі ўрыўкамі з прац класікаў марксізму-ленінізму. У кнізе яны вельмі дарэчы: узбройваюць маладога даследчыка-студэнта метадалагічным падыходам, уласцівым савецкай навуцы аб літаратуры.

Як падкрэслівае ва ўступным артыкуле навуковы рэдактар кнігі доктар філалагічных навук А. Творагаў, Старажытная Русь не ўступала сярэдневяковай Еўропе ні ва ўзроўні распаўсюджвання кніжнай культуры, ні ў майстэрстве пісьменнікаў, ні ў жанравым багацці помнікаў, ні ў разнастайнасці літаратурных стыляў. Так з першых старонак кнігі студэнты засвойваюць высокую ацэнку, якую дае старажытнай рускай літаратуры, да вывучэння якой яны прыступаюць, адзін з буйнейшых і аўтарытэтнейшых савецкіх спецыялістаў. Урывак з капітальнай працы М. Гудзія знаёміць чытачоў з распрацоўкай і вывучэннем важнейшых этапаў і твораў старажытнай літаратуры ў XIX ст. у сувязі з агульным развіццём літаратуразнаўчай навукі ў Расіі і прыводзіць да сцвярджэння, што «пачынаючы з 50-х гадоў XIX ст., вывучэнне старажытнай рускай літаратуры становіцца на трывалую глебу» і дасягае вялікіх поспехаў у працах Буслаева, Пыпіна, Ціханравава і іншых вучоных. Знойдуць студэнты ў хрэстаматыі ацэнку ўкладу акадэміка А. Шахматава ў вывучэнне рускіх летапісаў (артыкул А. Праснякова).

Найбольшае месца ў хрэстаматыі адводзіцца фрагментам з прац акадэміка Д. Ліхачова, якія ўзбагацілі сучасную навуку аб старажытнай рускай літаратуры, дзе вучоны глыбока даследуе многія праблемы: жанры і віды старажытнай літаратуры, яе сувязь з рэчаіснасцю і інш.

Найбольш буйным і важным з'явам старажытнай літаратуры ў хрэстаматыі прысвячаюцца па два, а то і па тры ўрыўкі з даследаванняў вучоных. Так, тры матэрыялы прысвячаюцца «Слову аб палку Ігаравым» (з даследаванняў Д. Ліхачова, В. Андрыянавай-Перац, Ю. Лотмана). Гэтыя ўрыўкі выводзяць студэнтаў за межы падручніка, значна паглыбляюць іх веды аб творы. Даследчыкі развіваюць погляд на XI — XIII ст ст. у гісторыі культуры Старажытнай Русі як на перыяд стылю манументальнага гістарызму. У межах гэтага стылю «ўсё найбольш значнае і прыгожае ўяўляецца вялікім, манументальным, велічным...»

Варта асаблівай увагі даследаванне паэтычнага стылю нашага славутага земляка Сімяона Полацкага, выкананае І. Яроміным. Вучоны разглядае творы паэта як прадстаўніка стылю «барока», характэрнага для Украіны і Беларусі ў другой палавіне XVII стагоддзя. У матэрыяле, змешчаным у хрэстаматыі, знаходзім агульную характарыстыку паэзіі «барока», якая, паводле заўвагі вучонага, узнікла «ў заўзятай палеміцы з традыцыямі Рэнесанса» і ў той жа час не парывала са знешнім бокам гэтай паэзіі — з антычнай міфалогіяй. Даследчык прыходзіць да выводу аб тым, што, хоць у паэзіі С. Полацкага вобразы антычнай міфалогіі сустракаюцца часта, у паэта «ніколі не было непасрэднай творчай цікавасці да антычнага свету, яго ўспрыманне антычнай спадчыны тыпова «барочнае», у многім дыяметральна супрацьлеглае Рэнесансу», а антычныя сюжэты ў многіх вершах — гэта «толькі прычына для чарговага іншасказання».

У сваёй хрэстаматыі складальнікі здолелі змясціць разнастайны і багаты матэрыял. І ўсё ж хацелася б, каб у кнізе можна было больш прачытаць па асобных праблемах. Напрыклад, аб стылі «барока», які разглядаецца ў асноўным на творчасці С. Полацкага. Гэта патрэбна таму, што рускае літаратурнае барока ў падручніках па старажытнай літаратуры асветлена пакуль што досыць павярхоўна. Было б таксама надзвычай карысна для студэнтаў-філолагаў, каб яны маглі прачытаць у гэтай хрэстаматыі хоць бы невялікі ўрывак з працы акадэміка Д. Ліхачова, у якой ён даследуе самы першы твор вялікай рускай літаратуры, пакуль што мала вядомы шырокаму колу чытачоў, — «Речь философа».

Было б пажадана знайсці ў кнізе раскрыццё (у выглядзе «зносак») тэарэтычна-літаратурных тэрмінаў, тлумачэння якіх няма не толькі ў слоўніках літаратуразнаўчых тэрмінаў, але і ў «Литературной энциклопедии» («диптих», «мартирий» і інш.).

Аднак вельмі прыемна адзначыць, што хрэстаматыя Л. Гусевай і Л. Кароткай, першая ў сваім родзе вучэбная кніга, створана вучонымі нашай рэспублікі. А неабходна яна ў аднолькавай ступені ў кожнай навучальнай установе краіны, дзе вывучаецца курс старажытнай рускай літаратуры. Безумоўна, гэта прыкметны ўклад вучоных Беларусі ў справу стварэння падручнікаў і іншых вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай школы.

Л. ЦАРАНКОЎ.

Старажытная руская літаратура ў даследаваннях. Хрэстаматыя. На рускай мове. Складальнікі Л. Гусева і Л. Кароткая. Мінск, выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1979.

тэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

Творчасць У. Караткевіча развіваецца ў рэчышчы жыватворнай традыцыі класічнай рускай і сусветнай літаратуры. Гэтая традыцыя прадвызначае мастаку паказаць зло ва ўвесь рост, пазбавіць яго здольнасці да мімікрыі. Вось, напрыклад, вобраз палача, які ў вольны час ад «трудов праведных» майструе мудрагелістыя клеткі для жывёл, нават для чарвякоў, таму што апошнія маюць звычку падкапваць карэнне; машыны, якія б дапамагалі выведаць, пра што думае чалавек; прылады, якія ператвараюць людзей у бязмоўныя аўтаматы, — вобраз вырастае ў змрочны сімвал фашызму і імперыялізму. А чаго варты вобраз войта Жабы!.. Гэты персанаж у мастака набывае яркія абрысы дзікунскага садызму.

Акрамя сімволікі, У. Караткевіч ахвотна выкарыстоўвае іронію, якая пачынае быць састаўным элементам вобразнай структуры тады, калі неабходна высмеяць новых прэтэндэнтаў на сусветнае панаванне, іх абмежаванасць, крывадушнасць. Двайной іроніяй напоўнены эпізод, у якім нунцый Лотр прымушае камедыянтаў іграць ролю апосталаў. З аднаго боку, уся гэта сітуацыя прасякнута насмешкай над усемагутным духоўным пастырам, а з другога—гэты абаронца веры пастаўлены ў такое становішча, што ён жа сам міжволі пачынае выкрываць убоства і духоўную абмежаванасць першых вучняў Хрыста.

Усёй гэтай хеўры супрацьстаіць народ. Можна было б шмат гаварыць пра тых, хто ў пісьменніка арэ і сее. Аднак, мабыць, лепш паказаць адну стылявую асаблівасць У. Караткевіча. Яшчэ ў аповесці «Дрэва вечнасці» вобраз роднай зямлі і айчыны аўтар сімвалічна ўвасобіў у магутным дубе, які непахісна стаіць пад бурамі і навальніцамі праз вякі. Гэты дуб зелянее і расце як вечнае пераможнае жыццё. У рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» ўзнікае новы вобраз — вобраз Зямлі. Зямля ў пісьменніка — гэта і вуліца, і селішча, і, нарэшце, поле, якое ў канцы твора асэнсоўваецца мастаком у касмічным плане. Як вядомая скульптура «Перакуём мячы на аралы» ўвасабляе вечную стваральную працу, так і вобраз поля і сейбіта на ім асэнсоўваецца як вечны, непарушны закон жыцця. «Неапалімыя купіны дрэў стаялі на ўзгорках. Сумавала вакол капліцы шыпшына. А сейбіты падымаліся на вяршыню круглага пагорка, як на вяршыню зямнога шара. І першым ішоў насустрач нізкаму сонцу Хрыстос, мерна размахваючы рукамі. І, гатовае да новага жыцця, падала зерне ў цёплую мяккую зямлю. Выйшаў сейбіт сеяць на нівы свая»,—рамантычна-прыўзнята заканчвае раман пісьменнік.

І, нарэшце, апошняе, што хочацца сказаць у сувязі з выхадам у свет двухтомніка выбраных твораў У. Караткевіча. Вядома, што мастак адбыўся толькі тады, калі ён, акрамя думак і пачуццяў, перадае чытачу сваю непаўторную, арыгінальную мову. Мова Караткевіча, жывая, паўнакроўная, бывае, даволі складаная, але маляўнічая і ёмістая. У гэтых адносінах яго раманы — гэта нібы дзівосны арнамент казачнага ўзору. Стылявы поліфанізм раманаў пісьменніка яшчэ чакае свайго даследчыка.

Уладзімір ГАНЧАРОЎ,

дацэнт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

КНІГАПІС



ВЯСНОВЫЯ ПТУШКІ. Сучасная мангольская навела. Зборнік. Пераклад з мангольскай. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1981.

Змест зборніка, укладальнік якога З. Сандагаа, склалі творы «малога жанру» дваццаці мангольскіх празаікаў. Сярод аўтараў такія вядомыя пісьменнікі, як Б. Баст, Ц. Дамдзінсурэн, Л. Тудэў, С. Эрдэнэ і іншыя, а таксама таленавітая моладзь — Ч. Алгаа, Д. Урыанхай, Д. Цэдэў.

Галоўная тэма твораў — раскрыццё шматграннага характару сучаснага мангола, чалавека, які за параўнальна кароткі гістарычны перыяд прайшоў шлях ад феадалізму да сацыялізму, паказ новых узаемаадносін між людзьмі, заснаваных на даверы і ўзаемапавазе. Побач гучыць другая, не менш важная тэма, якая таксама выклікана самім жыццём — услаўленне дружбы двух братніх народаў — мангольскага і савецкага, той дружбы, дзякуючы якой Мангольская Народная Рэспубліка смела крочыць у заўтрашні дзень.

Навелы мангольскіх празаікаў на беларускую мову пераклалі В. Рабкевіч, М. Паслядовіч, В. Новік, З. Прыгодзіч, Я. Крамко, А. Рыбак.

Г. БРУЙ.

АБСЯГІ ЯГО ДУШЫ

Да гэтай пары не верыцца, што Навума Саламонавіча Перкіна больш няма. Усё здаецца — вось пройдзе ён сваёй упэўненай хадой па калідоры, пагутарыць з калегамі, пажартуе, выслухае, падасць параду, зойдзе ў кабінет і акунецца ў кругазварот штодзённых спраў, якіх у яго заўсёды хапала. Не верыцца яшчэ і таму, што і сёння яго імя ўспамінаецца ў навуковых дыскусіях, публікацыях, на абаронах дысертацый аспірантамі, навуковым кіраўніком якіх ён быў, выходзяць з друку напісаныя ім артыкулы і кнігі. Толькі пасля смерці стала вядома, што Н. Перкін быў не толькі вучоным, даследчыкам, але і аўтарам мастацкіх твораў — аповесці «Я стаў партызанам», апавяданняў. А нядаўна выйшла з друку кніга выбраных літаратурна-крытычных артыкулаў Н. Перкіна «Абсягі думкі». У ёй сабраны артыкулы, якія даюць уяўленне аб шырыні яго навуковых інтарэсаў, значнасці зробленага ім.

Навум Перкін шмат гадоў займаўся пытаннямі ўзаемадзеяння нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў культуры краін сацыялізму, быў глыбока дасведчаны ў творчасці пісьменнікаў многіх народаў. Ён умеў прымеціць і тыя заканамернасці, што вызначалі агульнае для многіх літаратур, і ўласцівае толькі пэўнаму аўтару. Дасведчанасць крытыка не абмяжоўвалася толькі сферай літаратуры. У сваіх даследаваннях ён шырока скарыстоўваў звесткі з розных галін ведаў, не баяўся зазірнуць у сумежныя навуковыя сферы, калі таго вымагала справа.

Шырыня пазнання свету — у гэтым артыкуле, які адкрывае зборнік, аўтар, асэнсоўваючы факты з розных сфер рэчаіснасці, прыходзіць да абгрунтаваных і пераканаўчых высноў, прасочвае працэс тыпалагічнага збліжэння ў літаратурах народаў СССР, ахоплівае сваім поглядам гісторыю развіцця шматнацыянальнай літаратуры нашай краіны. Даследчык прыкмячае тэндэнцыі ўзмацнення інтэрнацыяналісцкага пафасу літаратуры, праяўлення інтэрнацыяналізму як мастацкага мыслення ў розныя перыяды гістарычнага развіцця Савецкай дзяржавы, паказвае, як у сучасных літаратурных творах знаходзіць адлюстраванне тэма дружбы народаў.

Артыкулы, змешчаныя ў зборніку, былі напісаны ў розны час, але, перачытваючы іх, нібы сочыш за развіццём скразной тэмы, якая нязменна прываблівала Н. Перкіна, тэмы пазнання чалавека і чалавецтва ў мастацтве. Чалавек і народ, чалавек і гісторыя, праблема гуманізму ў мастацкай літаратуры — у артыкулах Н. Перкіна гэтыя складаныя пытанні разглядаюцца на высокім навукова-тэарэтычным узроўні, з глыбокім пранікненнем у прадмет даследавання, з палемічным запалам. «І трэба змагацца за чалавечнасць ва ўсім. Калі ў прыродзе існуе «ідэальны герой», то ім можа быць толькі чалавек — барацьбіт за высокія ідэалы чалавецтва», — такімі словамі заключае Н. Перкін артыкул «Мудрасць пазнання чалавека», у якім разважае пра этапы творчага асэнсавання чалавека ў савецкай літаратуры. І думка вучонага была скіравана на новыя, нязведаныя яшчэ шляхі ў раскрыцці дыялектыкі развіцця чалавека на яго шляху да велічнага камуністычнага будучага.

Зборнік «Абсягі думкі» не ахоплівае ўсёй навуковай спадчыны Н. Перкіна, у ім сабраны толькі асобныя артыкулы, якія былі ў свой час напісаны ці для перыядычнага друку, ці як прадмовы да кніг і г. д. Аднак ён дазваляе прасачыць істотныя асаблівасці яго таленту даследчыка, можа многа сказаць удумліваму чытачу і пра чыста чалавечыя якасці вучонага. Учытваючыся ў напісанае Н. Перкіным, мы бачым яго ўменне тактоўна і цярпліва весці дыскусію, сціпласць, спакойную, мудрую разважлівасць, што не перашкаджала яму быць цвёрдым у сваёй перакананасці, настойлівым і прынцыповым. І гэта дае падставу разглядаць кнігу «Абсягі думкі» як даніну памяці таленавітаму вучонаму, які ўнёс значны ўклад у развіццё беларускай навукі.

М. КЕНЬКА.

Перкін Н. С. Абсягі думкі. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

КУЛЬТУРА МОВЫ

Агульнавядома, што веды ў падручніку па мове, як і ва ўсякім іншым падручніку, у якой бы папулярнай форме яны ні выкладаліся, павінны быць дакладнымі і навукова правільнымі.

Падручнік для 7—8 класаў «Беларуская мова» У. Андрэенкі і М. Яўневіча вось ужо на працягу многіх гадоў вучыць школьнікаў адасабляць у абавінакш, у памылковай, нічым не апраўданай рэдакцыі? І яшчэ: а як быць у такім разе вучню, які на ўроках беларускай мовы засвойвае адно, а на ўроках рускай мовы зусім іншае, а іменна: «Дапасаваныя азначэнні, якія стаяць перад паяснёным назоўнікам, адасабляюцца толькі тады, калі маюць дадатковае акалічнаснае значэнне, напрыклад, акалічнасці прычыны»? Гэта цытата з падручніка па рускай мове для 7—8 класаў. Названае правіла агульнае для многіх моў, прынамсі, усходнеславянскіх.

ЦІ ТАК ВУЧЫМ ДЗЯЦЕЙ?

вязковым парадку азначэнні, «выражаныя дзеепрыметным ці прыметным словазлучэннем», калі яны «стаяць перад уласным імем». Калі карыстацца гэтым правілам, то тады трэба прызнаць, што, напрыклад, у наступных сказах ёсць аднолькавая пунктуацыйная памылка: «Абліты крывёю Ваганаў без слова, без гуку асунуўся пад колы гарматы» (Я. Колас); «Маўклівы заўсёды Кухар больш Грамабою не адказваў» (К. Крапіва); «Пакліканы на дапамогу Ігар, высокі і дужы вучань дзесятага класа, не даў рады гнязду» (М. Лужанін); «Безуважны, аднак, да яго Ляўчук саступіў на дол і адчыніў нізкія дзверы ў асець» (В. Быкаў); «Па-ранейшаму засяроджаная і сур'ёзная Таня засвяцілася нейкім унутраным святлом» (Х. Жычка); «Пасаромлены некалі Юлькай меляшкоўскі Вінцак Грабцэвіч надта любіў уладу» (А. Карпюк). На самай справе ў гэтых сказах няма памылак, памылка ёсць у падручніку.

Адасабленне даданых членаў, як вядома, абсалютна не залежыць ад таго, ці яны стаяць перад уласным імем, ці перад агульным назоўнікам. Тут важную ролю адыгрывае такая ўмова, як сэнсавая нагрузка даданага члена, наяўнасць ці адсутнасць паўпрэдыкатыўных адносін паміж дзеепрыметным словазлучэннем ці прыметнікам з паясняльнымі словамі і паяснёным назоўнікам. Калі развітае азначэнне мае толькі атрыбутыўны сэнс (як гэта ёсць у прыведзеных сказах), яно не адасабляецца ні перад агульным, ні перад уласным назоўнікам. І наадварот: калі развітае, а таксама і адзіночнае азначэнне мае дадатковае акалічнаснае значэнне (часцей за ўсё прычыны або ўступкі), то яно адасабляецца і перад назоўнікам, і пасля яго, незалежна ад таго, ці гэта ўласны назоўнік, ці агульны: «Зморана працай, Саша ўпершыню за дні вайны заснула рана і спала моцна» (І. Шамякін); параўнаем: «Саша ўпершыню за дні вайны заснула рана і спала моцна, бо была зморана працай»; «Знясіленыя ад бяссоння і трывогі, людзі адразу валіліся на зямлю і засыналі» (І. Мележ); «Пакрыўджаная, дзяўчына павярнула назад» (М. Лынькоў); «Волька, напалоханая, праслязілася» (Ц. Гартны).

Гэта традыцыйнае правіла падаецца ў акадэмічнай граматыцы (1966), «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959), шматлікіх вучэбных дапаможніках, у тым ліку ў «Сучаснай беларускай пунктуацыі» Г. Клюсава і А. Юрэвіча, «Пунктуацыі беларускай мовы» Л. Бурака.

Правамерна ўзнікае пытанне: а навошта ж у школьным падручніку гэта правіла даваць

У падручніку для 4 класа «Беларуская мова» Н. Шэўчыка і А. Амяльковіча чытаем: «Падаўжэнне гукаў трэба адрозніваць ад падваення. Так, у слове **каменне** — адзін падоўжаны гук **н**, а ў слове **каменны** — два гукі **н** (адно **н** карэннае, другое — суфіксальнае)». У поўнай адпаведнасці з гэтым настаўнік будзе патрабаваць ад вучняў, каб яны пры фанетычным аналізе слоў **каменне** і **каменны** вылучалі ў першым 6 гукаў, а ў другім — 7. Але ці так гэта?

У абодвух словах тут па 6 гукаў, прычым адзін з іх падоўжаны ці доўгі, які адрозніваецца ад звычайнага працягласцю вымаўлення. З фанетычнага пункту гледжання, калі мы характарызуем гукі слова, няма розніцы, ці падоўжаны гук (у слове **каменне**) утварыўся на месцы старажытнага спалучэння «зычны+й», ці ён узнік (у слове **камен-н-ы**) у працэсе словаўтварэння на мяжы дзвюх марфем.

З такімі ж падоўжанымі (падвойнымі) гукамі сустракаемся і ў словах **смяецца, адзінаццаць, насценны, ванна, надта** (вымаўляем: **натта**), **мяккі, аддаць, бясшумна** (вымаўляем: **бяшшумна**), **адчыніць** (вымаўляем: **аччыніць**), **вучышся** (вымаўляем: **вучысся**) і г. д. У слове **падчытчык** 9 літар і сем гукаў, у тым ліку два доўгія **ч**.

Непасрэдным аб'ектам фанетычнага аналізу з'яўляюцца гукі, а не літары. Аднак у аўтараў падручніка для 4 класа свой уласны погляд на фанетычны разбор слоў. У многіх выданнях падручніка на прыкладзе разбору слова **прыязджаць** (у фанетычнай транскрыпцыі: **прыйажджац'**) паказваецца, як рабіць фанетычны аналіз, пры гэтым характарызуецца не гук **ж**, а **з**. Калі адна настаўніца звярнулася ў рэдакцыю часопіса «Народная асвета» з пытаннем, чаму ж гэта трэба характарызаваць гук **з**, якога фактычна ў слове няма, адзін з аўтараў падручніка растлумачыў («Народная асвета», 1977, № 5, с. 54): «Нашы дзеці і без навукі гавораць правільна: **горат, прозьба, маладзьба, лотка, прыяжджаць**, а вось каб яны правільна пісалі **горад, просьба, малацьба, лодка, прыязджаць**, іх трэба вучыць і вучыць, настойліва, штодзённа, сістэматычна... Вопытныя настаўнікі вучаць дзяцей не толькі трымацца правіл вымаўлення (арфаэпіі), але яшчэ ў большай ступені норм правапісу». Так у імя «багіні»-арфаграфіі аўтар ахвяраваў фанетыкай як навукай і яе фанетычнымі законамі.

Даўно ўжо наспеў час выправіць у падручніках гэтыя хібы.

І. ЛЕПЕШАЎ,

дацэнт Гродзенскага універсітэта.

ПАЭЗІЯ

Раіса БАРАВІКОВА

●

Ах, якія мне светлыя помняцца
леты!
Я дзяўчынкай бягу па духмяным
узмежку наўскос,—
там стаіць старшыня сінявокі
з зайздросным букетам
і карэц падымае з вадою
за лершы укос.

Што я ведала там пра жаночае
шчасце,
што з гадамі часцей не ў маю
патыкаецца даль,
апякаў, бы адорваў, зялёны
валок пакручасты,
і свяціўся, як зорка, на лацкане
нечым медаль.

Не баялася там быць залішне
адкрытай,
наплывала сляза, і вяла, як праз
волкі туман,
адзінокая песня з пякучай журбы
пра ракіту,
пад якою забіты чырвоны
ляжаў партызан.

Неаднойчы было ад няправага
слова трывожна,
мне не шкода душы, хто не плача
— хіба запяе?,
ды чаму ж гэтак шкода той
далёкае долі мурожнай,
што крылом жураўліным у днях
растае?

Гавару, як магу, і адкрыта,
і шчыра са светам,
і калі, нібы камень, прыцісне
мяне цішыня,
памахай, памахай мне
найлепшым букетам
з таго чыстага ўзмежку, малады
старшыня.

І калі мне жыццём паднясецца
глыток самы горкі,
і вужакай ля сэрца абкруціцца
ўдушлівы жаль,
пасвяці мне ярчэй, чым у небе
ярчэйшая зорка,
пасвяці мне даўжэй, той
на лацкане нечым медаль.

А калі адвядзецца залішне
зямнога блакіту,
і мышыная сквапнасць уводзіць
наважыцца ў зман,
праспявайце мне, цёткі, пра тую
у полі ракіту,
пад якою забіты чырвоны
ляжыць партызан.

Вучыла мама хадзіць

Дануце БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВАЙ

Не на дыване, і не ля славы,
вучыла мама мяне хадзіць
ля лавы...

Адышлася. Рукі распрастала.
«Хадзі, хадзі, доню...»—сказала.

Стаю, позіркам аблашчаная.
Ступіла... і пайшла ў дарогу —
Бацькаўшчына.

●

Прыеду я у той куток зялёны,
аддам паклон сунічнай старане,
дзе на сядзібах маладыя клёны
шумяць аб нечым дарагім і мне.

Чым аплаціць змагу сустрэчу тую?
І горача, і сорамна да слёз,
што покуль я па днях сваіх
вандрую,
яны не раз аплакалі мой лёс.

Яны не раз узносілі высока
густыя кроны пышна над зямлёй
ад самае нязначнай і далёкай,
ад нечаканай радасці маёй.

І голас голля заміраў пад
ветрам
у вечаровым цёплым тумане,
калі гарэлі зорна кіламетры
агнём любві, што ўспыхвала
ўва мне.

І доўга потым у асеннім ззянні
не я — яны апалена цвілі,
злятаў убор на сум маіх
расстанняў
жывым вянком па звычаю зямлі.

Найлепшым прыдаецца ўсё,
што — ззаду,
найдаражэйшым тое, што баліць,
а тыя клёны бачацца мне садам,

ПРОЗА

Я К ЖА ВАС зваць?
— А так і заві — Галуба.
— Гэта вёска Галуба.
— І вёска Галуба, і я Галуба.
— Як гэта?..

Яна сядзіць побач са мной на печы, звесіўшы босыя ногі на гарачую, звечара напаленую ляжанку, і смяецца, як маладая, бо ёй дзіўна, чаму я не разумею тое, што разумее ўся вёска.

— Ну, каб ведаў, я табе, чалавек — два вухі, раскажу, адкуль Галуба ўзялася. У нас раней як людзі сяліліся? Пачуюць птушку вясновую, спанравіцца яе песенька — гняздзечка шукаюць. Барані божа парушыць, вока на яечкі пакласці, пасягнуць на жаўтадзюбіка. Але калі гняздзечка ёсць, птушка жыве, песенька спанравілася — ладзілі хату. Тут, дзе наша вёска, першую хату чалавек паставіў побач з гняздом ляснога голуба. Птушка гэтакая: вуркоча, як маці над малым, гладзенькая, блішчыць, на ладным валляку дробная галоўка, а хвост шырокі, сіні, з белай тасёмачкай. Яшчэ горлінкаю завуць.

— Клінтух? Голуб-клінтух?

— У нас кажуць голуб, галуба, гарлянка, горлінка.

— Але я не пра вёску. Чаму вы — Галуба?

— Чаму-чаму, усё хочаш ведаць. Давай вячэраць. Ёсць бульба, салёны гурочак...

Старая злезла з печы, падкруціла на стале ў лампе кнот, заляскатала віламі — шукала чыгун з бульбаю.

Як жа я іх, Галубу-вёску і Галубу-старую, адшукаў сярод палёў, лясоў, далёка ад бальшака, на выспе за рэчкай Пятляначкай, на сцежках-дарожках, якія бегаюць з месца на месца ўвесь год — у сяўбу, сенакос, жніво, снягі? Дзіўлюся сам—як?

Вечар быў імглісты, снег ляжаў неглыбокі, маразы не паспелі загнаць пад лёд хуткія рэчачкі. Я ехаў аўтобусам у знаёмы калгас і думаў: чаму багатаму сам чорт дзяцей калыша? Усе да яго едуць, яго славяць, наш брат-журналіст пра яго цяпер толькі і піша, беднаму хіба мімаходзь пстрычку дасць па носе, вожыка падкладзе — хай чухаецца. Быццам дзе багацце, там і сумленне, і праца шчырая, і любоў непадманная да жыцця, зямлі-матухны. І так я развярэдзіў душу думкамі, што выйшаў з аўтобуса раней, як трэба, там, дзе чорт дзяцей ніколі не калыхаў, дзе вёскі раскіданы між палёў і лясоў на пясочку. Ішоў-ішоў — сцямнела. Дарога, уезджаная саньмі, скончылася, я не адразу заўважыў, што іду цаліком, а заўважыў — спыніўся: куды ісці далей? Выйшаў да бярэзніка — могілкі. Я ад іх — полем скаціўся ў лагчыну да хмызнякоў, а там рэчка і ніякага мосціка. За рэчкай, на выспе, ледзь відаць кволы агеньчык, быццам хто свечку запаліў, даланёю затуліў ад ветру—як праз далонь свеціць. І назад не павернеш— агеньчык блізка, і ўперад не пойдзеш — рэчка вузкая, ды не пераскочыш, ног не хопіць. Прабегся паўз яе ў адзін бок, прабегся ў другі — ні моста, ні кладкі. Лазіну выламаў, у ваду тарчма сунуў: не глыбока, па костачкі, але ж зімою ў ваду не палезеш. Думаю: трэба мігам скочыць з берага і мігам выскачыць на той бераг, каб вада не паспела хлынуць у чаравікі, як у дзяцінстве — ускочыш, выскачыш, і ногі сухія. Але ўскочыў дык ускочыў — па калена. Выскачыў, праўда, на тым беразе, дзе агеньчык, і даў лататы. Добра, што хата з агеньчыкам была не на запорах — як смарганyў за клямку, дык і апынуўся ў цяпле. Адразу чаравікі з ног, шапку і куртку вобзем — сам да печы. А там старая: усміхаецца круглым добрым тварам, як радая, што вось і я на печы.

Пасля, пазнаёміўшыся, сядзелі за сталом, вячэралі. Зноў, як на печы, я спытаў, адкуль у яе такое імя — Галуба. Думаў, што цяпер ужо адкрыецца. Ат — не:

— Я ж сказала, што гэтак мяне чалавек назваў.

— А што за чалавек?

— Чалавек як чалавек, два вухі,— смяецца.

гэтая, што цяпер, гэтую ўжо з Сымёнам ставілі, а быў хляўчук з адным акенцам. З Грышам як пажаніліся, печ ў хлеўчуку склалі, акенца прабілі — і жылі.

— А хто гэта — Грыша?

— Мужык мой.

— А Сымён?

— І Сымён мой, чалавек як чалавек — два вухі.

— Дык як жа гэта?..

— Ат, маўчы ды слухай, як было з Іванам Колышкіным. Прывалакла, значыць, а куды схаваць? Ночку на печы мыла, зеллем паіла, карміла, у Грышава ўсё апранула, на дзень пад печ схавала.

— Хто ж ён такі быў, Колышкін?

— Акружэнец. Іх тады, у першыя дні вайны, столькі было рассеяна па нашых лясах!

Віктар КАРАМАЗАЎ

ГАЛУБА

АПАВЯДАННЕ

Нядаўна я зноў заглянуў да Галубы, у самыя веснавыя работы, калі яна гной з хлева выкідала, каня бегала - шукала, бульбу ля хаты садзіла, грады капала і засявала, плот гарадзіла. Калі людзі працуюць, як стаяць, склаўшы рукі? Пасобіў выкінуць гной, паставіць плот, а потым, вячэраючы, завёў ранейшую размову. І вось, як адчуўшы, што за шчырасць трэба плаціць шчырасцю, старая пачала адкрываць свае таямніцы:

— Выгнала, помню, карову на пашу, за рэчку. Пусціла, сама падышла да Пятлянкі, вады прыгаршчамі чарпанула, каб напіцца, і ледзь не самлела: чалавек ляжыць — ногі ў вадзе, у ботах, а грудзі і галава пад кустом. Адскочыла, чую — стогне. Я зноў да яго: салдацік, наш. Выцягнула яго на траву, бачу — плячо і грудзі ў крыві, худзюшчы. Што рабіць беднай бабе? Бегчы ў вёску? А як дойдзе да Клуні? Быў у нас паліцай з суседняй вёскі, з Цітаўкі, адзін на дзве вёскі. У Галубе паліцая за ўсю вайну не знайшлося ніводнага. Схавала сваю знаходку зноў пад куст, галлём прыкінула: ляжы, пакуль сцямнее. А як сцямнела — прыйшла з бутэлькаю малака, з бульбаю цёпленькай. Накарміла, напаіла, падняла, дала ў адну руку кол, каб абапіраўся, памагаў мне, павалакліся. Добра, што хатка мая ад рэчкі першая. Не

— Ну а... Галуба?

— Слухай ты!.. Па начах трызніў, пытаўся, дзе ён. Кажу: у Галубе, у вёсцы. Паляжыць-паляжыць — зноў: дзе я? Злую: ды ў Галубе! А неяк — ужо развідняла — ачомаўся, выбраўся з-пад печы, стаіць пасярод хаты. Я на печы, прыкінулася, што сплю, а сама ўсё бачу. Стаіць, азіраецца, а потым на ўсю хату: дзе ты, Галуба? З-за коміна высунулася — ён да мяне: рукі паклаў на печ, цягнецца, а я смяюся. Думае, што я яму як хлопцу радая, жартую, а мне радасна, што вось ён ужо рукі можа падняць, абаперціся, сіла ёсць. Залез на печ, сеў побач, мяне абхапіў, цалуе, шэпча: Галуба мая, Галуба! Ды якая я табе Галуба, пытаюся, Галуба — вёска, а я баба, не вёска, і завуць мяне Марыляю. А ён сваё: ты Галуба! І не патрэбны, кажу, ты мне, у мяне Грыша... Пытаецца: хто ён, Грыша, дзе ён? У зямліцы, кажу, муж мой. Адзін дзень гулялі вяселле, на другі яго забралі на фінскую, у саракавым. Грыша твой, кажа, мяне не асудзіць, адзін у нас з ім хлеб і лёс. Грыша не асудзіць, кажу, гэта праўда, бо я за яго выйшла з жаласці, што быў дужа непрыгожы з твару, іншая за яго не ішла. І ні з кім да гэтага часу не жыла, ён адзін быў у душы. Як прачнуўшыся ад доўгага сну, абхапіла я Івана Колышкіна, так абхапіла і цалавала, што ўся аблілася слязьмі. Адчула: ён мой,

якому — красаваць, шумець,
радзіць...

Прыеду, увайду пад тыя сховы
душой, ужо гатовай адцвісці,
і страшна не знайсці такога слова,
што толькі раз гаворыцца
ў жыцці.

●

Для чаго спатрэбілася Музе
зноў узяць зусім не той ражок?!
Растае ля камянёў на Фрунзе
пад маёй далонню ледзяшок.

Нехта скажа: «Вунь пайшоў твой
вораг...».
Блісне промень сонечны ясней.
Можа й вораг, ды сказалі б—
дораг,
а вораг быў у бацькі на вайне.

●

«З твайго саду да мяне на агеньчык».
Мікола СЕЛЯШЧУК, алей.

У мяне палянка ёсць за садам,
многа там шыпшыны і травы,
дам табе высокую пасаду, —
будзь майго бяссоння вартавым.

Упадзе ў траву пялёстак клейкі,
задрыжыць расінка на плячы, —
адгукнуся голасам жалейкі,
каб не сумавалася ўначы.

Перадам з душы ўтрапёнасць
слову,
што ірвецца спуджана здалёк,
у шыпшыннік, пад тваю ахову,
быццам саду лёгкі матылёк.

●

Праз навісь лёгкае імжы,
дзе палявыя крэпнуць кветкі,
мільгне зялёны ўскрай мяжы
і знікне ў дымцы за палеткам.

Вось гэтак жа з глыбінь гадоў,
пад пераліў залётнай пташкі
між дрэў бялюткаю рубашкай
азвецца першая любоў.

І, калі нават аднаўлю, —
жыццё не верыць дням мінулым.
Я слаўлю ўсё, што прамінула,
але з жывога дня пяю.

На перавале сталых год
між тых жа дрэў мільгне
рубашка,
і здагадацца мне няцяжка,
хто просіцца у мой заход.

Як лёгка мройнаму растаць,
а ён заве ў жывыя дзверы,
і дай жа бог яму паверыць,
што рада я, пра гэта знаць.

●

Паспытаўшы вясновага шалу,
адляцелі мае жаўрукі.
і пакінулі песню пра Галю,
што з сабою ўзялі казакі.

Не заўжды легкавернасць —
да страты,
я сюжэтам тым сэрца гаю;
знойдзе доля сірочая — брата,
ашуканы — надзею сваю.

І ў хвіліны цяжкія не варта
перад небам высокім грашыць,
вунь стаіць мая верная варта—
амялушкавы гай пры шашы.

Вунь сцяжына, і водар грыбніцы,
вунь прагал, дзе бруснічнік расце.
Дам напіцца з рукі, бы з крыніцы,
і шчасліваму, і сіраце.

І за гэтую радасць малую,
і за хлеб той, з якога жыву,
незаганна, калі пацалую
дол сыры, разгарнуўшы траву.

Прычакае прырода мяцеліц, —
на каго, і на што наракаць?
Веснавыя мае адляцелі,—
трэба новых гасцей сустракаць.

●

Не схацела паклікаць у госці,
і, як толькі дайшлі да вугла,
развіталася рэзка, са злосцю—
абнадзеіць нічым не магла.

А па горадзе дзіўная чутка
з хаты ў хату з той ночы плыве,
быццам ён непрадбачана хутка
перад богам сваёй назаве.

Снег злятае з карніза бялюткі,
да ўсяго стаў абвостраным слых,
я смяюся над дзёрзкаю чуткай,
і чамусьці сцялю на дваіх.

●

Усёй душою палюблю
сцяжыну ў поле, і, як брошку,
дзе б'ецца сэрца прыкалю
на ёй сарваную валошку.

Хутчэй да жыта, за хлявы,
забыць пагляд вачэй суровых,
і да начное сінявы —
шаптацца з лугам чабаровым.

Надыхацца, узяць у кроў,
і захмялела, як ад брагі,
заліцца песняй ля жытоў
з жаночай, смуткавай адвагі.

Прыкласці рукі да грудзей,
дзе абмірае тонкі кужаль,
і кожнай рыскай заірдзець,
як першай ноччу па замужжы.

Ісці спаволена праз луг,
азвоньваць водарнае мліва,
дзе, можа, ўпершыню пастух
заплакаў горка і шчасліва.

І ім страхам яго заваявала. Дурное дзела, кажуць, не хітрае, а якое яно дурное, калі ад душы? Назаўтра дзверы — хлясь! Дурная баба — вечна дзверы не зачыняю, ні днём ні ноччу. А раптам — Клуня? Ён да мяне ў ласку даўно ўбіваўся, як Грыша пайшоў на фінскую. Не, тут Ціхан, сусед: дзе твой хлопец? Які? — пытаюся. Не дуры, кажа, у мяне таксама гэтакі ў хлеве, майго Петраком зваць. Тады — з печы: вядзі, дзед, Петрака, такога ведаю. А як сцямнела, сышліся ў маёй хаце, і яшчэ трэці, у Лізкі Масалыгавай хаваўся. Святла не запальваючы, на стол сабрала, павячэралі. Іван і кажа: ну вось, Галуба, прыйшоў час нам развітацца. Я аж падскочыла: ці тут, кажу, нельга жыць? Нельга, кажа, бо мы салдаты. Вывела я іх да чыгункі, развіталіся. Не плач, Галуба, сказаў мне тады Іван Колышкін, як вайна скончыцца ды жывы буду, я цябе знайду, у шоўк апрану, на руках насіць буду перад усім светам.

— Загінуў, значыць?

— Калі б жывы быў — вярнуўся б. Гэта я ведаю.

— Ну а той, Сымён?

— Сымён пазнейшы. Яшчэ да Сымёна... жыла з Клунем.

— З паліцаем? Як гэта?

— А так. Аднойчы ноччу ўваліўся цераз парог чалавек і ляжыць. Я за яго, адагрэла...

— Таксама акружэнец?

— Сяргей, маладзенькі-маладзенькі. З лагера ўцёк. У Крычаве, дзе завод цэментны, быў лагер ваеннапалонных. Ноч, значыць, на печы адхайвала, а раніцай Клуня ўвальваецца. Сеў на парозе, уставіўся на лахманы, якія я з хлапца садрала, на падлозе ля печы кінула. Клуня змікіціў.

Дзверы адчыніліся, у хату ўвайшла старая. Аберуч абапёршыся на кіёк, глядзела на нас, як не пазнаючы.

— Праходзь, Матруна, садзіся.

Тая села, развязала хустку:

— Я ненадоўга. Прыйшла спытаць, калі ты, Галуба, каня прывядзеш з фермы? Сеяць трэба. Зямля сохне.

— Яшчэ ж ніхто не сеяў.

— Вось і трэба ўсім адразу. Мяне людзі паслалі. У цябе тут госць, усім ісці няёмка, мяне адну выправадзілі. Ляксею трэба галлё з лесу прывезці, палкі дроў няма. Фрося хоча на пошту пасылку брату адвезці. У краму трэба ўсім. Хлеба, цукру, солі купіць. У цябе ногі маладыя, ты каня прывядзі.

— А хто за плуг стане? Я тыя гады ўсім арала-сеяла, а сёлета не пасілю. Рукі баляць.

— Маладзейшых за цябе ў нас няма.

— Якая ж я маладая? Сёмы дзесятак. За ўсю вёску рабіць ды думаць ужо не магу. Але... тут я, Матруна, расказваю, як Сярожу хавала. Клуня тады, як уваліўся, хацеў хлопца з печы сцягнуць, у паліцыю везці, а я не дала. Кажу Клуню: калі не выдасі — буду з табою жыць. І жыла. І ён не выдаў нікога. На што не ішла, каб чалавека выратаваць! А як вы, людзі, пасля майго Ванечку неўзлюбілі?

— Якога? — пытаюся.— Колышкіна?

— Сыночак у мяне нарадзіўся. Пачалі хлопчыка паліцаем зваць. І бабы, і дзеці. Сабрала я тады баб і пытаюся: што вам Галуба зрабіла кепскае? Што як магла ўсіх сваім плячом падпірала, праз Клуню ратавала ад смерці? За гэта вы мне сплочваеце? А ці ён, дзіцятачка, вінаваты?

— Не ўспамінай,— апусціўшы вочы, як ад сораму за вёску, папрасіла Матруна.— Скажы лепш, як напаіла Клуню.

— Помніш? Ды я ж у цябе самагонку брала. Прыехаў, значыцца, сеў есці. Гляджу: кроў на кіцелі. Пытаюся: дзе гэта ты? А гэтак, кажа ён, і з вамі будзе. З кім? А з Ціханам, кажа, з табою, што хаваеце ворагаў Германіі, сёння гэтакіх у Цітаўцы да сценкі ставілі. Не, кажу, табе, Клуня, трэба лячыцца. А палячы, кажа. Я хустку на галаву і да людзей: у каго самагонка? Прынесла ад цябе, Матруна, чвэрць цэлую, шклянку набухала: на, лячыся. Выпіў, рагоча. Яшчэ набухала. А чаму, пытаецца, сама не бярэш? А я, кажу, заўтра на тваіх хаўтурах вып'ю. Рагочучы, перакуліў другую і трэцюю. А як набраўся: падымейся, гультаіна, трэба дровы прывезці з лесу, якіх я там за цябе насекла. Шапку яму на галаву, вывела, у сані ўкінула, сама за лейцы і да лесу. Каня разагнала, а тут паваротак — яшчэ каню пугі. Ён як крутануў, дык мы з Клунем — у снег. А зіма была завейная, лютая, не як цяперашнія зімы. У снег зарыліся, ляжым. Клуня і павярнуцца не можа. Я шапку ў яго з галавы — і на морду. І задушыла сабаку. Назаўтра — поўная хата паліцаяў: дзе Клуня? Кажу: учора некуды нанач паехаў. Знайшлі ў лесе, каня злавілі, а мае сляды мяцеліца за ночку ўсе чыста пахавала.

— Тады і маю недапітую чвэрць знайшлі.

— А я ўсё прадумала. Паглядзелі, што чвэрць у возе, пад сенам, сам смярдзіць самагонкаю — на яе і спісалі.

— Хітрая ты, Галуба.

— Будзеш хітраю з вамі.

Суседка падалася дахаты, а мы сядзелі, даядалі бульбу. Галуба і яшчэ ўспомніла — як брыгадзірыла:

— Вайна, значыць, скончылася, сход сабраўся. Кажу: выбірайце мужчыну, іх у нас, праўда, адзін-два, але можна выбраць. А ўсе як падняліся: не, Галуба, брыгадзірам ты будзеш, ты адна ў нас над усімі, і над мужыкамі. А гэта ж і праўда. Ці мяне які мужчына калі знайшоў, каб памагчы, з бяды выцягнуць? Усё я іх знаходзіла, з бяды цягнула. Хворых, калек падбірала. Ад жаласці.

— Ну, а Сымён?

— Яго пасля вайны на вакзале знайшла, як Ваню вазіла ў Магілёў на рэнтген. Малы, а хварэў цяжка, на лёгкія. А што Сымён быў? Без ног...

Уся затрэслася, быццам сіл не хапіла ўспамінаць, варочаць той камень. Я маўчаў. Такое было адчуванне, што няма ў мяне права нават каб словам суцешыць. Быццам той камень, які каціла па жыцці Галуба, прыдушыў і мяне.

Пазней, калі яна, кладучыся спаць, фукнула ў шкло лямпы, пагасіла святло, я спытаў:

— Чаму ў вашай вёсцы ні святла, ні крамы, ні каня?

— А мы тут, як сказаў старшыня, неперспектыўныя. І вёска неперспектыўная, і бабы неперспектыўныя, і Ляксей, адзіны мужык, неперспектыўны. Дзве каровы — і тыя ялаўкі. Сабакі звяліся — няма каго вартаваць. Вось я... якая з мяне перспектыва?..

Тую ноч я доўга не мог заснуць. Устаў, выйшаў з хаты, сеў на калоду, закурыў. Ніколі не курыў, а тут намацаў у кішэні пачак — частаваў іншых — і прысмаліў. Першы раз у жыцці адчуў радасць ад цыгаркі. Цішыня. Нідзе ані галасочку: ні чалавечага, ні сабачага. Быццам і вёскі няма, і жыцця няма. А я ўяўляў, як недзе блізка едзе чалавек, чужы, полем ці паўз лес, бакавой дарогаю, едзе і бачыць мой агеньчык. Так бы не ведаў, што тут жывуць людзі, а мой агеньчык яму падкажа: жывуць — і вёска, і людзі. Жывуць.

Як позна лёг — позна прачнуўся: ужо сонейка добра ўстала.

Адразу паклікаў:

— Галуба?

Ніхто не адгукнуўся.

Апрануўся і выйшаў з хаты. Галуба ўжо хадзіла за плугам, а дзве старыя ішлі з кошыкамі следам, кідалі ў разоры бульбу. Убачыўшы мяне, Галуба нават не прыпынілася, бо засталося два разы абысці агарод. Абышла — тады і каня распрэгла.

— А чаму мяне не пабудзілі? Я ж таксама — чалавек як чалавек, два вухі... І рукі ёсць...

На цэнтральную сядзібу мы ехалі ўдваіх. Я — на аўтобус, яна — на пошту, у краму па хлеб, цукар, соль, запалкі.

Пятлянку пераехалі ўброд. Рэчка была ўся бялюткая ад калакалушы. Над цёплай ціхай вадою таўклася камарэча. Выехалі на поле.

Палетак быў скрозь засеяны збажыною, старая наезджаная дарога дбайна заворана і таксама засеяна. Мы пакіравалі межамі паўз поле.

На ўзгорку, пасярод поля, стаяла вялізная груша, уся ў квецені, аж галля не відаць. Галуба спыніла каня.

— Глядзі ты на яе, разнявесцілася,— заўсміхалася.

— Дзічка?— спытаў я.

— Ды не. Вінёвачка. Грышава. Садзіў яшчэ хлапчуком.

— Які Грыша?

— Ды мой. Тут стаяла бацькава хата. Тут вёска была. Цітаўка. І Клуня з гэтае вёскі. Нічога не засталося, адна грушка Грышава. А гадоў праз пяць гэтак і з нашай Галубаю будзе. Павымруць старыя, хаты пазносяць, палетак зааруць, засеюць, адна нейчая грушка ці яблынька застанецца.

— А Ваня? Дзе ваш Ваня?— спытаў я.

Старая падумала-падумала і сморгнула лейцамі:

— Но-о-о, два вухі!..

Да калгаснага цэнтра ехалі моўчкі. Мая спадарожніца гаварыць ужо не хацела, а мне ўжо няёмка было распытваць. Але калі пад'ехалі да аўтобуснага прыпынку і я злез з воза, наважыўся развітацца, яна загаварыла:

— Ванечка ваенны, жанаты, служыць на Урале. Мяне да сябе кліча, а я не магу ехаць — бабы не пускаюць. Кажуць: ты, Галуба, у нас самая маладая, дык ты і павінна правесці ўсю нашу вёску ў апошнюю дарогу, каб па-людску было. Адна застанешся — тады куды хочаш. А каб Ванечка сюды ехаў — баюся. Раптам ён тут ад каго дачуецца, хто яго бацька і што я з ім зрабіла?..

— А вы што яму пра бацьку кажаце?

— Кажу, што яго бацька — Іван Колышкін, і назвала па бацьку Ванем, і ў пашпарце ён Колышкін, Іван Іванавіч. Усё як след зрабіла, людзі пасобілі, а цяпер?.. Што рабіць?..

Галуба сядзела на возе і маўчала, чакала мае парады. Але маўчаў і я. Што параіць — не ведаў.

МУЗЫКА

СТЫМУЛ нашых задум

СТРУННЫ квартэт. Гаворка пра яго вялася на нядаўнім нашым форуме—VIII з'ездзе кампазітараў Беларусі. Гэта—невялікі творчы калектыў, які ўжо амаль два дзесяцігоддзі паспяхова прапагандуе ў народзе музыку. Яго запісы ёсць на пласцінках, гучаць па радыё. Мы, беларускія кампазітары, нямала пішам для гэтага выканаўчага складу. Ды не сакрэт: існаванне струннага квартэта Саюза кампазітараў БССР пакуль што ў многім трымаецца на энтузіязме музыкантаў-аднадумцаў, а ён жа, квартэт, мог бы і нават мае права карыстацца большай увагай канцэртных арганізацый, рэспубліканскай філармоніі. Бо ён — адзіны ў рэспубліцы струнны квартэт — рэгулярна дае жыццё ўсеўзрастаючай колькасці твораў, якія беларускія кампазітары сёння пішуць для яго спецыяльна, а таксама айчыннай і замежнай класікі ў галіне квартэтнай музыкі.

Што азначала для беларускай музыкі паяўленне ў нас такога выканаўчага калектыву?

Такі яркі твор, як Першы квартэт М. Аладава, напісаны яшчэ ў 1934-м годзе, быў выкананы ўпершыню толькі праз... 35 гадоў! За тры дзесяцігоддзі (1932-62) беларускія кампазітары стварылі ўсяго каля... дзесятка сачыненняў у гэтым жанры. Выконвалася ж створанае ад выпадку да выпадку. А за 19 гадоў супрацоўніцтва з квартэтам (з 1962 года) кампазітары рэспублікі стварылі больш як сорак сачыненняў буйной формы — струнныя квартэты, квінтэты, трыо і г. д. Само існаванне калектыву, які робіць рэальным неадкладнае выкананне новага твора, — моцны стымулятар творчых задум!..

Яшчэ ў 1963 годзе часопіс «Советская музыка» адзначаў: «Цяпер у беларускіх аўтараў з'явіўся стымул для работы ў жанры квартэтнай музыкі (бо доўгі час... такая музыка тут амаль не гучала)». Потым пра квартэт пісалі многія перыядычныя выданні. У прыватнасці, у «Звяздзе» ад 17 сакавіка 1979 г. гаварылася, што «сёння няма такой старонкі квартэтнай беларускай музыкі, якая б выпала з поля зроку музыкантаў». І далей — вельмі слушная заўвага: «Калі ансамбль выконвае новыя творы, ён часта выступае нібы ў ролі сааўтара, дадаючы ў выканаўчы працэс элементы сваёй творчасці». Як аўтар сямі квартэтаў падзяляю гэтую думку.

Кожная праграма ансамбля — вынік напружанай шматмесячнай працы. Бясконцыя гадзіны рэпетыцый, дзе ўдакладняецца характар гучання, кожная дэталь, штрых. Карпатлівая работа з аўтарамі, людзьмі рознымі і па ўзросце, і па характары, і па здольнасцях. І калі на афішах канцэртаў прайшоўшага кампазітарскага з'езда з'явіліся такія новыя імёны, як Валерый Карэтнікаў, Алег Елісеенкаў, — квартэт мае да гэтага самае непасрэднае дачыненне.

Рэпертуар квартэта вызначаецца, зразумела ж, не толькі прыгаданымі творчымі сувязямі з нашымі сучаснымі аўтарамі. Ён пастаянна знаёміць слухачоў з творамі рускай і замежнай класікі, з музыкай народаў РСФСР, Украіны, Малдавіі, Літвы, Арменіі і г. д. А імёны аўтараў беларускіх квартэтаў стаяць на пласцінках усесаюзнай фірмы «Мелодия»; у перадачах Усесаюзнага радыё гучаць творы М. Чуркіна, М. Аладава, А. Туранкова, І. Лучанка. Ужо не кажу пра фанатэку Беларускага радыё, дзе ў квартэта больш чым паўсотні запісаў.

Квартэт — занятак, якому яны аддаюць час, вольны ад асноўнай працы: у аркестры, у музычнай школе, у кансерваторыі. Квартэт для іх — пачуццё радасці яднання з музыкай, сустрэч з новымі творамі, магчымасць самавыяўлення. Вось Юрый Гершовіч — першая скрыпка. Мастак творчых парыванняў, эмацыянальны шукальнік новых варыянтаў выканання. Альтыстка Вікторыя Баткіна—заўсёды сур'ёзная, засяроджаная, заўсёды пэўная ў сваім выкананні і ў сваіх выказваннях. Яе «голас» у квартэце — адметная фарба, непаўторны тэмбр. Своеасаблівы «грунт» гучанню кожнага твора надае віяланчэль Мікалая Шчарбакова — на ім, да таго ж, трымаюцца многія «гаспадарчыя справы» квартэта. Павел Валадарскі... Трагічна нечакана мы яго страцілі!.. Але традыцыі, якія пакінуў ён у гэтым калектыве, варта захаваць, бо яны — прынцыповыя. І я не маю права не сказаць пра П. Валадарскага больш падрабязна.

Нязменны ўдзельнік квартэта, П. Валадарскі валодаў асаблівым пачуццём адказнасці за агульную творчую справу, надаваў калектыўнай працы той нерв, які нельга страціць. У яго партыі заўсёды вельмі дакладна былі расстаўлены штрыхі, аплікатура. Пачынаючы работу, ён абавязкова імкнуўся дасканала адрэпеціраваць тое месца ў творы, якое яму здавалася найбольш складаным у ансамблевых або тэхнічных адносінах. Мяркую пра гэта не толькі са слоў іншых аўтараў і музыкантаў, але і з уласных уражанняў ад рэпетыцый. Паколькі яго выканаўчай манеры былі ўласцівы строгасць, акадэмічнасць у лепшым сэнсе гэтага слова, развітае пачуццё меры і тонкі густ, многія мае калегі даручалі першае правядзенне фугіраваных эпізодаў менавіта партыі другой скрыпкі. І П. Валадарскі іграў у канцэртах заўсёды з вялікім уздымам і творчай аддачай. Ягоная радасць з выпадку кожнага новага твора, прынесенага кампазітарам на рэпетыцыю, выяўлялася ў тым энтузіязме, што спрыяў глыбокаму раскрыццю пэўных вартасцей музыкі, давядзенню да слухача яе настрою, яе зместу. Прафесійная патрабавальнасць артыста спалучалася ў характары П. Валадарскага з выдатнымі чалавечымі якасцямі.

Нямала ягоных выхаванцаў сярод выпускнікоў Маскоўскай і Беларускай кансерваторый, яны паспяхова працуюць у аркестрах, выкладаюць у рэспубліцы і ў многіх гарадах краіны. У Сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры БДК П. Валадарскі загадваў струнна-смычковым аддзяленнем. Да яго звярталіся, калі была патрэба адрэдагаваць скрыпічныя п'есы для школьнікаў або стварыць метадычныя дапаможнікі.

Нядаўна ў склад квартэта прыняты малады скрыпач, выкладчык Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры БДК А. Шанін. Калектыў паранейшаму выступае на «музычных серадах» Саюза кампазітараў, удзельнічаў ён і ў вялікім канцэрце беларускай музыкі, што быў сёлета наладжаны ў філармоніі.

Струнны квартэт застаецца надзейным прапагандыстам камернай творчасці беларускіх кампазітараў, якая заваёўвае ўсё новых сваіх прыхільнікаў.

Кім ЦЕСАКОЎ,
кампазітар, сакратар партбюро СК БССР.

На здымку: кампазітары Я. Дзягцярык, К. Цесакоў і ўдзельнікі квартэта М. Шчарбакоў, В. Баткіна, Ю. Гершовіч, П. Валадарскі. Фота 70-х гадоў.

Вучоніца і шукальніца

Спявачка, пра якую пойдзе гаворка, вельмі блізкая мне як творца, як мастак. З ёй вось ужо 15 гадоў мы выступаем на розных канцэртных эстрадах з рознымі праграмамі. Многія творчыя задумкі таксама звязаны з ёй. Яна добрая прафесіяналка, далікатны, мяккі чалавек і вельмі добразычлівы — а гэта, як вы самі разумееце, вельмі важна. Яна ўвесь час у пошуках, яе творчы дыяпазон вельмі шырокі: ад эстраднай песні да самых складаных партый у араторыях і кантатах сусветнай класікі, ад народнай песні да оперных арый кампазітараў розных музычных напрамкаў. Гэта спявачка — салістка хору Беларускага радыё і тэлебачання, заслужаная артыстка БССР Любоў Каспорская.

Знаёмства маё з Любоўю Каспорскай адбылося яшчэ ў студэнцкія гады ў Гомельскім музычным вучылішчы: яна — будучая вакалістка, а я—дырыжор хору. У Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі мы сустрэліся як студэнты аддзялення спеваў. Абодва мы скончылі кансерваторыю як канцэртна-камерныя спевакі (хаця шмат і з задавальненнем спявалі і ў опернай студыі), і ганарымся гэтым, бо канцэртна-камерныя спевы — адзін з найбольш складаных жанраў выканаўчага мастацтва.

Яшчэ студэнткай, у 1965 годзе, Люба стала лаўрэатам Міжрэспубліканскага конкурсу музыкантаў-вакалістаў у Рызе, і з таго часу можна адлічваць яе артыстычны шлях. Дарэчы, напярэдадні гэтага конкурсу Л. П. Александроўская пісала ў «ЛіМе»: «Лірычнае сапрана Л. Каспорскай вабіць сваёй яркай выканаўчай манерай, пачуццём стылю, сцэнічнай здольнасцю». Да гэтага трэба дадаць, што Л. Каспорская — вельмі працавітая. 15 гадоў яна — салістка хору Беларускага радыё і тэлебачання. У гэтым калектыве каля 60 спевакоў, большасць мае вышэйшую музычную адукацыю. Але, бадай, ніхто не рыхтуе самастойны рэпертуар, не выступае з сольным канцэртам; самае большае—спяваюць сола ў харавым канцэрце. Ужо толькі гэты факт гаворыць пра многае.

Любоў Каспорская належыць да тых артыстаў, якія ўвесь час узбагачаюць свой рэпертуар, адкрываючы для слухачоў новыя, яшчэ «незапетыя» творы. І гэта датычыць не толькі музыкі беларускіх аўтараў, дзе спявачка часта выступае як «першапраходца» — многія беларускія кампазітары даверяюць ёй права першага выканання. Упершыню ў выкананні Л. Каспорскай прагучалі вакальныя цыклы С. Картэса «Вясёлыя песні» на вершы С. Маршака, А. Мдзівані — «Песні кахання» на вершы Г. Апалінэра, «Дзявочыя песні» Г. Гарэлавай на вершы М. Багдановіча, песня І. Лучанка «Бярозка» і іншыя.

Пра сумесную працу з выканаўцай над вакальнымі цыкламі «Перайманне англійскіх балад» і «Незвычайная школа» расказвае кампазітар Э. Тырманд:

— Маё знаёмства з Любай Каспорскай пачалося даўно, у класе канцэртмайстарскага майстэрства, дзе яна з бляскам выконвала найскладаную музыку сучасных кампазітараў — В. Сланімскага, І. Стравінскага і іншых. Таму менавіта ёй я даверыла выкананне сваіх вакальных цыклаў, якія таксама напісаны ў сучасным стылі: сучасныя гармоніі, рытмічны малюнак. І я не памылілася: Каспорская сваёй артыстычнасцю, сваім выканаўчым вынаходніцтвам садзейнічала паспяховаму з'яўленню на эстрадзе маіх твораў. І артыстцы, якая так сур'ёзна і зацікаўлена ставілася да паказу гэтых твораў слухачам, я вельмі ўдзячная.

У камернай вакальнай музыцы шмат таямніц, вядомых, мусіць, спрактыкаваным музыказнаўцам. Тым больш прыемныя для іх (і для радавых слухачоў таксама) тыя адкрыцці, што вылучаюць канцэрты Любы Каспорскай. «Прыродныя дадзеныя — прыгожае цёплае сапрана, артыстызм і абаянне — спалучаюцца ў гэтай спявачкі з вялікай працаздольнасцю, пастаянным удасканаленнем прафесійнага майстэрства,—пісала музыказнавец Р. Аладава пра выступленне артысткі ў Доме кіно.— Віртуозную тэхніку прадэманстравала яна ў складанай арыі з «Магніфіката» Баха і ў радасна-лікуючай «Алілуя» Моцарта. Вялікім эмацыянальным напалам вызначалася выкананне «Амарылі» Качыні і каваціны Нормы з аднайменнай оперы Беліні. Зусім інакш, лёгка і непасрэдна, прагучалі дзве шатландскія песні Гайдна і «Фарэль» Шуберта. Праграму Л. Каспорскай дапоўнілі папулярныя «Аве Марыя» Баха — Гуно і «Песня Сольвейг» Грыга. Выступленне артысткі вызначалі эмацыянальная адкрытасць, рознабаковасць прадстаўленых стыляў, уменне перадаць найбольш важнае ў кожным з іх».

Такія рэцэнзіі можна было б напісаць на кожны яе канцэрт: у разнастайным рэпертуары — цеплыня і стыльнасць выканання, бездакорнае валоданне сваім інструментам — голасам, высокі прафесіяналізм, артыстызм. Вось рысы, якія выяўляюцца ва ўсіх выступленнях спявачкі, бо да ўсіх яна ставіцца вельмі сур'ёзна. За 15 гадоў яе працы ў хоры не адбылося ніводнага канцэрта, дзе б Люба Каспорская не пела сола ці ў ансамблях — пачуццё ансамбля ў яе выдатнае. А колькі запісаў зроблена ёй з Т. Міянсаравай і Л. Максімавай, з сімфанічным аркестрам і інструментальным ансамблем Белтэлерадыё!

Ад шыдрае песні

ПОБАЧ З ІМЕНАМІ Д. Шастаковіча, І. Стравінскага, А. Гарыльяна, Д. Гершвіна ў чарговай праграме Мінскага камернага аркестра значылася: Пётр Альхімовіч, «Concerto grosso». Неардынарнасць падзеі вызначала не толькі рэмарка «першае выкананне», а і той факт, што гісторыя беларускай музыкі не захавала прыкладаў у жанры concerto grosso. Як вядома, росквіт яго звязаны з творчасцю А. Вівальдзі, Г. Гендэля, А. Карэлі (XVII—XVIII стагоддзі). Увагай кампазітараў Расіі гэты жанр не карыстаўся. У савецкі час да concerto grosso звярталіся Ю. Юзелюнас, Э. Тамберг, А. Шнітке, А. Янчанка... Так што твор маладога беларускага кампазітара П. Альхімовіча ў гэтым складаным жанры стаў прыкметнай з'явай у музычным жыцці рэспублікі, выклікаўшы вялікую цікавасць не толькі ў прафесійных колах.

Твор П. Альхімовіча прываблівае яркасцю вобразаў. У І частцы («У маёй вёсцы») быццам паўстае маляўнічая карціна беларускай прыроды і народнага побыту. Увасабляючы ў музыцы бязмежную любоў да роднага краю, малады кампазітар асабліва тонка падышоў да гераічнай тэмы — подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Высокая грамадзянскасць аўтара раскрываецца ў II частцы твора — «Ля брацкіх магіл». Журботны, засяроджаны матыў саліруючай віяланчэлі вырастае ў мужную тэму, якую падхоплівае ўвесь аркестр. Арганічнае завяршэнне «Concerto grosso»— жыццярадасны і аптымістычны фінал, які названы аўтарам «У маім горадзе». Музыка фіналу асацыіруецца з вобразам нашага сучасніка, актыўнага будаўніка камунізму.

Апошнія энергічныя, магутныя акорды... Напружаная цішыня... І зала ўзрываецца ўдзячнымі апладысментамі слухачоў, якія выклікаюць аўтара і доўга не адпускаюць яго са сцэны.

— Твор Пятра Альхімовіча напісаны пераканаўча і вельмі ярка, — адзначыў пасля канцэрта галоўны дырыжор Мінскага камернага аркестра Юрый Цырук. — Адчуваецца, што кампазітар старанна вывучыў і добра засвоіў лепшыя традыцыі гэтага жанру. Акрамя таго, твор напісаны з выдатным веданнем інструментаў аркестра. Я ўспамінаю, як у час працы над «Concerto grosso» Пётр Альхімовіч прыходзіў да нас у аркестр і сам займаўся на інструментах, каб знайсці яркія тэмбры гучання, адчуць нюансіроўку і тэхнічныя магчымасці інструментаў.

Народны артыст рэспублікі прафесар Анатоль Васільевіч Багатыроў сказаў:

— Пётр Альхімовіч — адзін з маіх лепшых вучняў. Ён, несумненна, цікавы, таленавіты кампазітар, і я гэта слова не баюся падкрэсліць. Мэтанакіраваны, энергічны, працаздольны. Глыбока адчувае нацыянальную прыроду музыкі. Выяўленню яго творчай адметнасці спрыяе работа з фальклорам. Развіваецца ён як кампазітар хутка.

Прыемна, калі такую высокую ацэнку вучню дае строгі, патрабавальны Майстра! Выдатны педагог, А. Багатыроў распазнаў асаблівасць таленту маладога пачынаючага кампазітара. Гэта каштоўная асаблівасць — адданая любоў да народнага скарбу, песеннага фальклору. А далёка ж не заўсёды маладыя, а часам і не толькі маладыя кампазітары памятаюць крылатыя словы М. Глінкі аб тым, што стварае музыку народ, а кампазітары толькі яе аранжыруюць.

Пасля таго філарманічнага вечара я стаў знаёміцца з творчасцю маладога кампазітара больш падрабязна.

У першых сур'ёзных сачыненнях П. Альхімовіча — Канцэрт для габоя і камернага аркестра, Канцэрціна для эстрадна-сімфанічнага аркестра, вакальных творах — адчуваецца глыбокая сувязь з беларускім народным меласам. Тут мы не знойдзем простага цытавання народнай музыкі — аўтар стварыў свае, арыгінальныя мелодыі. Яны, ўсёй сваёй сутнасцю, інтанацыйным строем, каларытам, характарам гучання звязаны з фальклорам. І не дзіўна. Зачараваны непаўторнымі мелодыямі беларускіх вясельных, калядных песень, балад роднай Смаргоншчыны, Пётр Альхімовіч, выпускнік аддзялення народных інструментаў кансерваторыі, імкнецца вывучаць народную творчасць, і з 1972 года бярэ актыўны ўдзел у рабоце Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР па складанні трыццацітомнага збору беларускай народнай творчасці.

Узбагаціўшы свае веды, у прыватнасці, працуючы пад кіраўніцтвам Т. Дубковай над зборам і расшыфроўкамі народных песень для двух тамоў «Балад», П. Альхімовіч адчуў неадольную патрэбнасць творчага самавыказвання. Але бракавала прафесійных ведаў у кампазіцыі. Ён паступіў у клас прафесара А. Багатырова.

Чула і асцярожна накіроўваючы і развіваючы творчы талент свайго вучня, педагог паступова вёў маладога музыканта да значных творчых дасягненняў. Першы год настойлівай і сур'ёзнай працы пад кіраўніцтвам А. Багатырова ўвянчаўся поспехам на II Усесаюзным конкурсе маладых кампазітараў (Масква, кастрычнік 1977 г.): П. Альхімовіч быў удастоены звання дыпламанта. Гэта, аднак, не замінала П. Альхімовічу крытычна ставіцца да сваіх работ, працягваць пошукі, удасканальвацца ў прафесіі. Яго новы твор—«Варыяцыі на беларускую тэму для фартэпіяна» — быў цёпла сустрэты слухачамі ў канцэрце на пленуме Саюза кампазітараў БССР (снежань 1979 г.). Затым з'явілася паэма-фантазія для вялікага сімфанічнага аркестра «Лявоніха, або Прынашэнне Глінку», напісаная пад незабыўным уражаннем ад славутай «Камарынскай» М. Глінкі.

Музычныя інтарэсы кампазітара робяцца разнастайнымі. Ён супрацоўнічае ў кіно, піша музыку для самадзейных і прафесійных харэаграфічных калектываў рэспублікі, аказвае практычную дапамогу некаторым самадзейным калектывам Брэста, Гродна, Гомеля (вакальна-інструментальны ансамбль «Галасы Палесся», танцавальны ансамбль «Радасць» і інш.), сябруе з танцавальнымі, харавымі калектывамі рэспубліканскага Палаца піянераў і школьнікаў. У 1978 годзе П. Альхімовіч становіцца членам эстраднай секцыі Саюза кампазітараў БССР. Усё часцей яго музыка гучыць па радыё. Поспехам карыстаюцца творы Альхімовіча ў выкананні розных калектываў у Маскве, у рэспубліках савецкай Прыбалтыкі, Сярэдняй Азіі, Закаўказзя. Савецкія выканаўцы ўключалі іх у свой гастрольны рэпертуар у час паездак у ГДР, ЧССР, Францыю, Японію. А не так даўно Пётр зноў прыняў удзел у чарговым Усесаюзным конкурсе маладых кампазітараў, які быў прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. І зноў — дыпломы: адзін быў прысуджаны П. Альхімовічу за «Concerto grosso», а другі — за камерна-вакальны твор «Балада пра дачку-птушку».

— Неяк мой настаўнік Анатоль Васільевіч Багатыроў, — расказвае П. Альхімовіч, — звярнуў увагу на тое, што з усіх камерна-інструментальных жанраў квартэт здатны найбольш поўна раскрыць магчымасці буйнамаштабнага драматычнага развіцця. Таму для мяне квартэт з'явіўся сур'ёзнай творчай прыступкай да сімфоніі. Найважнейшай задачай, якую вызначыў для маёй працы над квартэтам Анатоль Васільевіч, было стварэнне музыкі глыбока нацыянальнай па змесце. У гэтым мне дапамаглі незабыўныя сустрэчы з «захавальніцамі» народнага музычнага скарбу — жыхаркамі вёскі Іскань Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці Параскай Кузміновай і Алексай Шурмялёвай, Аленай Паўлюкоўскай з вёскі Восава Мінскага раёна і іншымі. Пад уражаннямі іх спеваў у II частцы квартэта — Largo я стварыў свае тэмы на аснове інтанацый беларускай народнай песні «А што ў лесе зашумела...», а ў фінал — Allegro ma non tanto увёў матыў веснавой заклічкі.

На чарговым VIII з'ездзе кампазітараў Беларусі была прадстаўлена гэта новая работа Пятра Альхімовіча — Струнны квартэт № 1 до мінор. Тады, дзелячыся ўражаннямі аб музыцы маладых, што прагучала ў з'ездаўскіх канцэртах, народны артыст БССР Я. Глебаў сказаў пра Альхімовіча: «Гэты малады кампазітар, які прадставіў нам ужо цэлы шэраг цікавых твораў, безумоўна, таленавіты».

Мінула колькі часу — і П. Альхімовіч адпраўляе работу на міжнародны конкурс маладых кампазітараў, які праходзіць у ГДР, завяршае цыкл твораў для аргана, піша п'есы для кантрабаса і фартэпіяна. Кампазітар працягвае працаваць і над сваёй першай Сімфоніяй...

А. КАРАЦЕЕЎ.
Фота А. ХАРКОВА.

Ужо трэці год Любоў Канстанцінаўна сумяшчае шматбаковую артыстычную дзейнасць з цікавай, пачэснай і вельмі адказнай справай — вядзе клас сольных спеваў у кансерваторыі. А да гэтага была вучоба ў асістэнтуры-стажыроўцы пад кіраўніцтвам народнай артысткі СССР Т. Ніжнікавай. Тамара Мікалаеўна расказвае:

— Больш сур'ёзнага чалавека ў адносінах да сваёй спецыяльнасці я не сустракала. Нягледзячы на тое, што Любоў Канстанцінаўна шмат працавала і працуе як артыстка, як прафесіянал — у класе яна вучылася, як студэнтка кансерваторыі. Вучыцца яна і зараз, але ўжо як педагог, бо гэта зусім розныя справы — спяваць самой ці вучыць гэтаму іншых. Яна не саромеецца пайсці ў клас да мяне ці да іншых нашых старэйшых педагогаў, пасядзець на ўроках, запытацца пра тое, што яе цікавіць. Яна, з яе адчуваннем прыроды голасу і з высокай патрабавальнасцю да сябе і да сваіх вучняў, уяўляецца і мне, і выкладчыкам нашай кафедры перспектыўным педагогам. Падабаецца мне Люба Каспорская і як спявачка. Я з прыемнасцю бываю на яе канцэртах, слухаю яе запісы. Яна даравіты, музычны чалавек і, што самае галоўнае,—мае ва ўсім пачуццё меры.

Старэйшы яе калега, сам я магу зазначыць: хаця першыя крокі ў любой справе робяцца вельмі асцярожна, усё сведчыць за тое, што Люба Каспорская будзе добрым педагогам. Сапраўдны педагог, на мой погляд, яшчэ не той, хто добра ведае свой прадмет, а той, хто не спачыў на дасягнутым і ўсё жыццё вучыцца сам. Таму, хто ў пошуку, лепш за ўсё можа дапамагчы той, хто і сам не перастаў быць шукальнікам. Менавіта такая ва ўсім Люба Каспорская.

Леанід ІВАШКОЎ,
дацэнт кафедры спеваў
БДК імя А. В. Луначарскага.

ЗА ДЫРЫЖОРСКІМ ПУЛЬТАМ

ПРАГРАМА гэтага сімфанічнага вечара ўключала творы Г. Гендэля, В. Моцарта, С. Барбера і С. Рахманінава.

Салісткай выступіла лаўрэат Міжрэспубліканскага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў, арганістка з Рыгі Яўгенія Лісіцына. У яе выкананні прагучалі два арганныя сачыненні: Канцэрт Г. Гендэля сі-бемоль мажор для аргана і камернага аркестра і Святочная таката для аргана і вялікага сімфанічнага аркестра С. Барбера. Яркае каларытнае гучанне аргана і лёгкі струнны акампанемент аркестра ў Канцэрце Гендэля стварылі запамінальны вобраз свецкага, напісанага ў падкрэслена бліскучым стылі, твора. А Таката Барбера з яе прыгожай інструментоўкай і вострай сучаснай рытмікай прагучала вельмі светла і прыўзнята.

За дырыжорскім пультам Акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР быў таксама наш госць — народны артыст Казахскай ССР і Татарскай АССР, прафесар Фуат Мансураў.

Адгучала моцартаўская уверцюра... Незвычайная лёгкасць, чароўны шолах, яркія дынамічныя кантрасты, прыгожы тон, пявучасць агульнага гучання аркестра — так можна ахарактарызаваць гэтае выкананне. Уся сіла дырыжорскай волі і майстэрства кіравання сканцэнтраваны ў скупой, я б нават сказаў, падкрэслена аскетычнай манеры дырыжыравання.

«Сімфанічныя танцы». Складанае, глыбока філасофскае сачыненне апошняга перыяду творчасці С. Рахманінава. Глыбіня і маштабнасць зместу; музычная прыгажосць, яркія каларыстычныя эфекты, раптоўныя дынамічныя кантрасты; свет вобразаў жудаснай рэальнасці і ўзвышанай мары. Усё гэта ў апаэтызаванай форме танца — умоўнага танца, сімвала духоўнага свету мастака,— разгортваецца ў вялікую тэму: мастак і свет.

Гэты твор недастаткова «агучыць», г. зн. добрасумленна выканаць усё, што напісана. Яго трэба глыбока асэнсаваць, востра адчуць, перажыць. Менавіта такім і было выкананне Ф. Мансурава: пранікнёнае, кампактнае па форме, адточанае. Празрыстае гучанне і насычанае аркестравае туцці, кантылена і падкрэслена сухая рытмічная пульсацыя, яркія гукавыя тэмбры і жудаснае «прывіднае» гучанне — усе гэтыя кантрасты музычнай драматургіі былі выстраены ў непарыўную лінію апавядання.

У першай частцы вылучым сола саксафона (артыст У. Дзерышаў) — гэта заўсёды вялікія цяжкасці ў адносінах ладу і агульнага ансамбля з духавымі. На гэты раз яно прагучала роўна і выразна. Выдатна правяла «адказ» гэтай цудоўнай тэме струнная група, прадэманстраваўшы высокую культуру, без чаго рахманінаўская кантылена не выразная.

Вальс (II частка) навеяны вобразамі карцін швейцарскага мастака - сімваліста Арнольда Бёкліна, прагучаў вельмі цёпла і выразна. Ярка кантраставала трывожным фанфарам медзі галоўная тэма вальса. Добра прагучалі сола скрыпкі (С. Асновіч), складанае ансамблевае сола габоя і англійскага ражка (С. Сергяенка і Я. Шаблоўскі). І асабліва ўразіла рэпрыза галоўнай тэмы на найтонкім піяніссімо і ў больш стрыманым тэмпе.

Фінал — дынамічнае разгортванне ўсіх кантрастных вобразаў, пераканальна перададзеная кульмінацыя развіцця драмы мастака. У самым канцы тэма Радзімы пераплятаецца з матывам адзіноцтва кампазітара на чужыне.

...Вядома, што Ф. Мансураў, будучы дырыжорам Вялікага тэатра, не менш папулярны як кіраўнік аркестравага класа Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. Студэнцкі аркестр пад яго кіраўніцтвам стаў не толькі вучэбным, але і вырас у канцэртны калектыў, які неаднаразова выступае ў навучальным годзе з шэфскімі канцэртамі перад самай разнастайнай аўдыторыяй. Заняткі, праведзеныя прафесарам Мансуравым з калектывам опернай студыі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і з двума студэнцкімі аркестрамі — сімфанічным і камерным,— былі вельмі цікавыя і плённыя.

В. МНАЦАКАНАЎ.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Яўген ВЕРАБЕЙ

●

Вас называюць «закаханыя»,
На вас з таемнасцю глядзяць,
А вы зусім не ўсхваляваныя
Сваёй сустрэчай, як відаць.

Вы не гарыце, вы спакойныя,
І не кранаюць вас зусім
Ні краявіды навакольныя,
Ні веснавога неба сінь.

Вам ломкі халадок няпэўнасці
Не прынясе сумнення мук,
Не апячэ трывога рэўнасці
І не апаліць дотык рук.

Дзе сарамлівасць, дзе разгубленасць
Перад глыбінямі вачэй?
Ці шмат у вас канспектаў згубленых,
Бяссоннем спаленых начэй?

Не трэба вам спрадвечнай просіні,
Спрадвечных руж або гваздзік,
У вас — трывалыя адносіны,
Якія змацаваў разлік.

Хто сустракаў дабро без радасці,
Той без журбы сустрэне зло.
Не будзе крыўды і нянавісці
Там, дзе пяшчоты не было.

●

Да рэшты пакалечана жыццё,
А ён жыве на свеце з дабрынёю.
Хто б думаць мог, што гэта пачуццё
Ад крыўды стане лепшаю бранёю?!

Бярозка ў цясніне

Абрываецца абрыў
Непрыступна крута...
Хто бярозку пасадзіў
У цясніне Прута?

Па прыступках шэрых пліт
Мо сама ступіла
На распалены граніт
З горнага нахіла?

І глядзіць, што так шуміць,
Плешча пад абрывам,
Між ялін сышоўшы ўніз
З выглядам шчаслівым.

Паланіў бярозку Прут
У бурунах пенных.
Так і засталася тут
Між руін каменных.

●

Сцякае на пясок
Жывая вільгаць росту,
І залівае сок
Празрыстую бяросту.

Зазелянее дол,
Пусты і нежыццёвы,
І белы з чорным ствол
Атуліць шоўк лісцёвы.

На крылцах у стракоз
Ён не такі празрысты,
І выгляд у бяроз
І лёгкі, і ўрачысты.

Задумалі лятаць —
І рады, як дзяўчынкі:
Так хочацца дастаць
У небе аблачынкі!

●

Ты не такая, як усе.
Далёка да цябе красуням!
Ты сэрца вабіш пакрысе
Такім асеннім светлым сумам.

За што ж люблю я гэты сум,
Люблю, як восень на зыходзе?
Ды шум агню — журботны шум,
Апошні крык жыцця ў прыродзе.

І вецер гэты шум страсе,
А позірк твой пяшчотна-строгі
Зноў з гэтым шумам разнясе
Мае сумненні і трывогі.

З табой мне хочацца маўчаць.
З табой трывожна, але добра.
Ты нечым на вясну падобна:
Хачу нанова ўсё пачаць.

●

Працаўніца ты нястомная,
Выйшла б вечарам калі!
Не такая ж ноч і цёмная —
Зоркі зыркаць пачалі.
І, па-летняму не золкая,
Ціш ступіла на зямлю...
А не выйдзеш — і на золку я
Самы моцны сон згублю.
Мне з табой і ноччу сонечна,
Непрыкметна час міне.
Можа, ты не вельмі стомішся,
Усміхаючыся мне?

●

Павее ад жыцця замілаваннем —
І ўсё на свеце хочацца любіць.
І сэрца перапоўнена жаданнем,
Адным-адным жаданнем толькі — жыць!

Не адбываць лянотным існаваннем
Ні светлых, ні журботных дзён сваіх—
Хачу напоўніць вечным хваляваннем
Жыццё, падараванае на міг.

У скверы ля Дома кіно ў Мінску. Фота Э. ЭЛЬКСІНА.

ІНТЭРВ'Ю У НУМАР

КІНАПАСТАНОЎКА «РАСКІДАНАГА ГНЯЗДА»

Калі ў калідорах студыі «Беларусьфільм» з'яўляецца шыльда з назвай будучага кінатвора, гэта значыць, што ён ужо існуе — у рэжысёрскім уяўленні, у акцёрскіх пробах і рэпетыцыях, у касцюмах, дэкарацыях, у кампазітарскай партытуры. Такім жыццём — жыццём здымачнага перыяду — зажыў і фільм «Раскіданае гняздо».

Вось з-за дзвярэй, на якіх на кавалку кардона пазначана назва купалаўскай п'есы, выходзяць, спяшаючыся на студыйныя аўтобусы, маладзіцы ў зрэбных спадніцах і каляровых намітках, «падмацоўваючыся» на хаду хто бутэрбродам, хто «гарадской» булачкай; высокі хударлявы хлопец у світцы з даматканай тканіны, у лапцях, дакурвае цыгарэту, трымаючы яе між двума пальцамі — так ніколі не трымае цыгарку селянін. Але ў момант, калі ты не перад камерай, можна пабыць і самім сабой, хоць у галаве ўсё пракручваецца і пракручваецца роля...

У пакойчыку, адкуль толькі што выйшлі маладзіцы, сімпатычная бландзінка «сядзіць на тэлефоне» і выпрошвае ў некага мядзведзя (жывога, вядома). «Толькі на адзін дзень, з'ездзіць у Лошыцу, дзе будзе здымацца чарговы эпізод фільма — народнае гулянне».

Убачыўшы ўсё гэта на кінастудыі, нельга было не здзівіцца: у п'есе Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» няма ніякіх кірмашоў, ніякіх сцэн народнага гуляння, дзеянне п'есы адбываецца ў сценах (і ля сцен) мужыцкай хаты. А тут!..

Гартаю старонкі рэжысёрскага сцэнарыя. Тут не толькі кірмаш! Рассунуліся сцены хаты купалаўскага Лявона Зябліка. Увайшлі ў яе суседзі, хлопцы і дзяўчаты, панская дворня, гайдукі. Ёсць у сцэнарыі і сцэна, дзе ашчэраныя злосныя панскія ганчакі пачынаюць віляць хвастамі, як шчанюкі, убачыўшы Зоську — столькі ў ёй хараства і дабраты!.. З'явіліся ў сцэнарыі і «гарадскія» сцэны: Лявонава «блуканне па пакутах», яго спробы даказаць чыноўнікам што зямля, з якой яго зганяюць, спрадвеку належала яму, што на гэтай зямлі жылі і дзяды яго, і прадзеды.

У фільме «Раскіданае гняздо» прагучаць вершы Янкі Купалы. Шмат вершаў. Адным з іх — славутым вершам-гімнам «А хто там ідзе?» фільм павінен заканчвацца.

«Усё гэта, можа, і цікава, але ці не за многа вольнасцей у дачыненні да п'есы Купалы?»— мае права спытаць чытач.

Не будзем спяшацца з высновамі. Здымкі яшчэ толькі пачаліся.

Вось што сказаў рэжысёр фільма Б. Луцэнка (ён жа працаваў над сцэнарыем разам з Г. Бекарэвічам):

— Па-першае, нас не магла не захапіць усеагульная цікавасць да творчасці Купалы, якая набыла новы ўзлёт напярэдадні стагоддзя з дня нараджэння вялікага паэта. Акрамя таго, і гэта ўжо асабіста мая думка: «Раскіданае гняздо» — самы філасофскі твор Янкі Купалы. У ім, па-мойму, найбольш поўна выказаны сацыяльныя і маральныя ідэі Купалы, яго спадзяванні і надзеі.

На мой погляд, галоўная ідэя «Раскіданага гнязда»— неабходнасць асэнсавання чалавекам свайго існавання, свайго жыцця, лёсу ў яго сувязі з рухам часу, гісторыі, з будучыняй. Чалавек павінен думаць пра будучыню, бачыць у ёй выйсце з сённяшніх супярэчнасцей і складанасцей, ён павінен будаваць свой заўтрашні дзень, свой і свайго народа.

Думка гэтая выказваецца не прасталінейна. Яна спасцігаецца ў працэсе жыццёвай драмы. І, каб яе спасцігнуць, Купала прасочвае розныя шляхі сваіх герояў.

Вось, напрыклад, Сымон. Да сустрэчы з Незнаёмым ён жыве толькі нянавісцю, лічыць, што вакол — адны нягоднікі, што чалавек павінен змагацца толькі за сябе самога — адзін супраць усіх. Класічная выснова антаганістычнага грамадства: усе людзі ворагі.

Гэтай устаноўцы, гэтай пазіцыі супрацьпастаўлена Зоська — увасабленне ўсеагульнага прымірэння. Любоў можа аб'яднаць усіх людзей на свеце — любоў не толькі жаночая, а наогул тое, што мы завём любоўю да людзей і жыцця,— так я разумею ідэю вобраза Зоські, і мне, як рэжысёру, як чалавеку, гэтая ідэя найбольш блізкая.

Зоська церпіць паражэнне, гэта так, інакш і не магло быць у старым грамадстве, але ж ёсць яшчэ будучыня...

Я ўжо гаварыў, што кожны купалаўскі персанаж — гэта варыянт пазнання ісціны, варыянт выбару дарогі. Кожная такая дарога паасобку нікуды не прыводзіць — усе героі драмы церпяць крах. І тут асаблівы сэнс набывае вобраз Незнаёмага, які заклікае «аб'яднаць усе галасы, сабраць усе вочы ў адно месца»...

Сутыкненне розных светапоглядаў, індывідуальнасць спасціжэння ісціны кожным персанажам — псіхалагічны стрыжань будучай карціны. А пашырэнне відовішчных рамак п'есы дыктуецца патрабаваннямі кіно. Аднак мы імкнёмся пашырыць гэтыя рамкі, зыходзячы з самога Купалы, беручы ў свой фільм матывы яго вершаў і паэм.

Ролі ў фільме «Раскіданае гняздо» будуць выконваць, у асноўным, беларускія акцёры: Г. Гарбук, А. Ткачонак, А. Бендава, А. Франскевіч...

Ролю Данілкі будзе іграць сын акцёра-коласаўца Л. Трушко — Дзяніс Трушко. Яго тэатральны дэбют ужо адбыўся: ён выступаў у ролі Бачаны-хлопчыка ў спектаклі Акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа «Закон вечнасці» паводле рамана Н. Думбадзе.

Музыку да фільма піша Сяргей Картэс. Работа надзвычай цікавая і складаная. Бо трэба сродкамі музыкі дапамагчы аб'яднаць у адзінае цэлае бытавы і філасофскі пласты твора, дамагчыся канкрэтнай музычнай характарыстыкі кожнага персанажа, такой характарыстыкі, якая будзе адпавядаць паэтычнасці Купалы, яго паэзіі і яго драматургіі.

— Як бачыце,— заканчвае размову Б. Луцэнка,— нашу групу чакае наперадзе вялікая праца. Аб выніках яе будзе меркаваць глядач...

Марыя — А. Бендава, Сымон — А. Франскевіч, Данілка — Д. Трушко.

Хочацца пажадаць стваральнікам фільма «Раскіданае гняздо» поспеху і выказаць спадзяванне, што ў гэтым кінатворы па матывах творчасці вялікага песняра аўтарам удасца захаваць купалаўскі дух, купалаўскую паэтыку, высокія вартасці п'есы, што кінематаграфічнае пашырэнне яе рамак з'явіцца не вольнай гульнёй з класічным матэрыялам, а сродкам яго глыбокага і праўдзівага сённяшняга прачытання.

Р. БАКУНОВІЧ.

МАСТАК І ЖЫЦЦЁ

Выказаць сябе

НАТАТКІ З ВЫСТАЎКІ БАБРУЙСКІХ МАСТАКОЎ

У СІМІ КОЛЕРАМІ ВЯСЕЛКІ ззяе выставачная зала горада Бабруйска. 180 твораў жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва 35 бабруйскіх мастакоў склалі цікавую экспазіцыю. Тэхнічная разнастайнасць, багацце фарбаў, арыгінальныя кампазіцыйныя знаходкі ствараюць на выстаўцы святочную атмасферу, даюць магчымасць гледачам пазнаёміцца са шматграннай творчасцю мастакоў горада.

У сугучнасці з развіццём сучаснага стылю «рэтра» ў экспазіцыі можна ўбачыць творы, дзе праяўляецца захапленне лесіровачнай тэхнікай, вывучэнне творчасці старых майстроў Галандыі і Фландрыі. Іншыя карціны параджаюць асацыяцыі з мастацтвам Расіі і Францыі пачатку XX стагоддзя, у іх адчуваюцца пошукі псіхалагічнага ўздзеяння колеру, стварэнне эмацыянальнага настрою пры дапамозе жывапісных сродкаў. Але, нягледзячы на рысы падабенства, творы, прадстаўленыя на выстаўцы, вельмі самастойныя, глыбокае вывучэнне сусветнай гісторыі жывапісу, светаўспрымання старых майстроў і сродкаў выяўленчай мовы іх часу дапамагае моладзі адшукаць свой шлях у мастацтве.

У экспазіцыі прадстаўлены серыя акварэлей С. Абрамава «Па ленінскіх мясцінах», карціны Э. Белагурэва, А. Ананіча, Г. Шаўструка, А. Ясюкайця, дэкартыўныя творы А. Канцуба, В. Калтыгіна, Т. Араслана-вай-Смірновай і інш.

Адным са старэйшых мастакоў горада лічыцца Ю. Нікіфараў, які працуе як графік і мастак-манументаліст. Яго дынамічныя кампазіцыі, выкананыя з бліскучым веданнем малюнка, нагадваюць эскізы роспісаў, з характэрным для іх імклівым рухам і рознамаштабнасцю планаў. У гістарычнай карціне «Чырвоны сцяг» мастак здолеў стварыць абагульнены вобраз герояў грамадзянскай вайны, коннікаў Будзённага і Чапаева. Дакладна перададзена адчуванне суровага часу ў творы «Вясна. 1945 г.», прысвечаным К. П. Арлоўскачу. Больш лірычная работа «Летуценнікі». У гэтым творы аўтар удала спалучае жывапіс з графікай. Такі ж прыём выкарыстоўвае мастак і ў «Аўтапартрэце». З назіральнасцю і добрым гумарам выкананa гравюра «Мастак».

Высокім прафесійным узроўнем вызначаюцца гравюры У. Самачарнова. У экспазіцыі гледачы ўбачылі гравюру «Імгненне планеты». Складаная кампазіцыя, разнастайныя тэхнічныя прыёмы, багацце танальных адценняў адлюстроўваюць роздум мастака аб жыцці. Аднак асобныя работы гавораць аб непатрабавальнасці У. Самачарнова да сваіх карцін. Няёмка бачыць, калі член Саюза мастакоў БССР паказвае слабую работу. Напрыклад, у карціне «Вавёрачка» мастак паспрабаваў стварыць вобраз У. І. Леніна, але нават тяжкасць тэмы не змагла прыхаваць адсутнасць думкі і майстэрства жывапісца.

Своеасаблівы свет вобразаў У. Рубцова. Захоплены вывучэннем традыцый пастознага жывапісу, вясёлкавымі суадносінамі колеру, ён стварае кампазіцыі, поўныя складанага ўнутранага зместу. Нельга застацца раўнадушным перад карцінай «Памяці мастака А. С. Астроўскага», — глыбокім роздуме аб сутнасці жыцця і творчасці. Цікавы своеасаблівасцю светаўспрымання аўтапартрэт «Сваяцтва», насычанасцю і адначасова стрыманасцю колеру вабіць «Нацюрморт». Трэба заўважыць, што наўмысная ўскладненасць каларыстычных суадносін іншым разам замінае ўспрыняццю карцін У. Рубцова.

Толькі 5 гадоў працуе ў горадзе мастак-манументаліст Э. Белагураў. Зараз ён дыпламант Акадэміі мастацтваў СССР, вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі. На выстаўцы гледачы ўбачылі чорную карціну мастака «Красавіцкае інтэрв'ю». Э. Белагураў выкарыстаў традыцыйны для сваёй творчасці прыём: сумяшчэнне ў адной плоскасці некалькіх самастойных сюжэтаў, якія на яго думку, дапамагаюць паказаць працу журналістаў - рэпарцёраў. Побач з выявамі журналістаў і маладых працаўнікоў — асноўных герояў, аўтар уводзіць у карціну партрэты бацькоў, партрэт дачкі, аўтапартрэт у майстэрні, партрэт Ю. Гагарына, вобраз Флоры, вядомы па творы С. Бацічэлі «Вясна». Атрымалася складаная, арыгінальная і дынамічная кампазіцыя, усе фрагменты якой складаюць адзінае цэлае, падпарадкаванае аўтарскай думцы.

Невялічкія работы Г. Шаўструка, выкананыя ў традыцыях лесіровачнай тэхнікі жывапісу, нечым нагадваюць творы Э. Белагурава, але толькі на першы погляд. Нялёгкі шлях абраў малады мастак. Дасягнуць у карціне глыбокага ўнутранага зместу, падпарадкаваць усе сродкі выразнасці гэтаму зместу, галоўнай думцы заўсёды цяжка. Але мастак ужо дасягнуў пэўных поспехаў, аб чым гавораць яго творы «Адыгейскоўцы», «Ліст», «Нацюрморт з палітрай».

Калі глядзіш на работы А. Ананіча, асабліва на твор «Хлеб майго дзяцінства», дык сціскаецца сэрца. Таму што ў гэтай карціне, якая апавядае пра цяжкае ваеннае жыццё жанчын і дзяцей, столькі асабіста перажытага. ...Зеляніна далягляда́ў, жорны, жанчыны ў цёмным адзенні, адна з іх трымае каструлю з бялюткай мукой, яе так мала; а побач хлопчык, мусіць, той самы, памяццю якога ўзноўлена сёння гэтая карціна. Твор не здзіўляе багаццем каларыстычных адценняў, складанай кампазіцыйнай пабудовай. У ім усё проста, але аўтар здолеў дамагчыся галоўнага — адчування часу.

Пейзажы А. Араслана-ва... Складанае спалучэнне чырвоных і цёмных фарбаў стварае абагульнены вобраз подзвігу ў творы «Рэквіем». Ветраны дзень, маленькі помнік з зоркай на ўзвышшы, дрэвы, асветленыя заходзячым сонцам, нагадваюць чалавечыя постаці, што застылі ў хвіліне маўчання. У гэтым пейзажы побач з рэалістычнымі выявамі мастак выкарыстоўвае сімволіку, якая дапамагае значна паглыбіць змест. Прысутнічае своеасаблівая сімволіка і ў нацюрморце «Пралескі», толькі там яна стварае адчуванне вясновага настрою. Цікава працуюць бабруйскія акварэлісты. Своеасаблівай манерай пісьма, выяўленнем складаных нюансаў настрою вызначаюцца акварэлі Л. Прошчанка-Мілаванавай «Старое люстра», «Прэм'ера». Маляўнічай сімфоніяй адыходзячага лета ўяўляюцца акварэлі Т. Араслана-вай-Смірновай, прасякнуты лірычным настроем яе нацюрморты.

Сярод новых імён мастакоў варта назваць А. Кірылаву. Яе творы вызначаюцца незвычайнай характэрнасцю вобразаў — рабіна ў белым уборы на пейзажы «Першы снег», поўныя настрою «Аўтапартрэт з яблыкамі» і «Прадаўшчыца кветак».

Непаўторнае, асабістае пачуццё і своеасаблівая паэтычная сімволіка вылучаюць акварэлі А. Ясюкайця «Сон Ю. Гагарына», «Квітнеючы луг», робяць іх не толькі арыгінальнымі, запамінальнымі, але і насычанымі глыбокім роздумам. Крыху надуманымі і пазбаўленымі пачуцця здаюцца карціны, напісаныя алеем, за выключэннем, бадай што, пейзажа-ўспаміну «Вясна. 1945 г.»

У экспазіцыі прадстаўлена некалькі дэкаратыўных пано. Найбольш цікавае з іх «Раніца» Т. Араслана-вай-Смірновай. Дэкаратыўныя творы гэтага аўтара тоўсць у сабе выяўленчы вобраз. Выкарыстоўваючы колер ільну, мастачка спрабуе стварыць адчуванне надыходзячай раніцы. Дэкаратыўнасць і выяўленчасць характэрны для яе батыка «Узбуджэнне», дзе багацце фарбаў, складаная каларыстычная гама, стылізацыя расліннага свету надаюць лірычнасць і своеасаблівую выразнасць твору.

Плённа працуюць керамісты, выкладчыкі прафесійна - тэхнічнага мастацкага вучылішча № 15. А. Канцуб у сваіх творах выкарыстоўвае тэхніку роспісу па кераміцы з увядзеннем аб'ёмнай пластыкі. Дэкаратыўны пласт «У гасцях у Вівальдзі» перадае паэтычны настрой музыкі славутага кампазітара. З добрым гумарам выканаў А. Канцуб дэкаратыўную скульптуру «Вясна і восень». Вясна ў вобразе прыгожай дзяўчыны з кветкамі, а з другога боку сімвалічнай аркі — старая стомленая кабета, вобраз сумнай халоднай восені.

Своеасаблівыя творы прадставіў у экспазіцыі В. Калтыгін. Тут складаныя і цікавыя дэкаратыўныя пласты «Наша з табой біяграфія», «Мужчына і жанчына». Паспрабаваў мастак свае сілы ў станковай скульптуры. Яму ўдалося стварыць вельмі пранікнёныя вобразы бацькі і маці. Столькі цеплыні ў гэтых партрэтах! Нават абагульненне формы не можа прыхаваць, а, наадварот, толькі падкрэслівае індывідуальнасць іх характараў.

Акрамя названых работ, варта прыгадаць габелен «Пара цвіцення» М. Канцуб, пано Л. Рыгалёвай. Але пры ўсім гэтым дэкаратыўна-прыкладное мастацтва прадстаўлена слаба. Няма дэкаратыўнай драўлянай скульптуры. Дзіўна: у горадзе ёсць прафесійныя разьбяры, выкладчыкі мастацкага вучылішча, а на выстаўках іх работы не паяўляюцца.

К. Аляксееў вельмі любіць дрэва, таму найбольш цікавыя работы выкананы іменна ў гэтым матэрыяле. Глыбокі, засяроджаны характар чалавека ў «Партрэце бацькі», мужнасць барацьбітоў адлюстравана ў кампазіцыях «Хлеб», «Бацька і сын».

Толькі дзве работы паказаў у экспазіцыі Г. Родзін. Малады скульптар здолеў стварыць складаны эмацыянальны настрой, тонкае адчуванне паэзіі і лірыкі. Кволая постаць дзяўчыны ў «Партрэце настаўніцы» выклікае адначасова пяшчоту і павагу.

На жаль, мала ў экспазіцыі работ, прысвечаных гісторыі роднага горада, яго сучаснаму працоўнаму жыццю. Асноўнае месца займае пейзаж.

І ўсё ж выстаўка робіць прыемнае ўражанне, сведчыць пра тое, што ў горадзе працуе шмат таленавітых мастакоў.

Т. КАРЧАЖКІНА,
мастацтвазнавец.

НАШ КАЛЯНДАР

6 ЧЭРВЕНЯ — 80 гадоў з дня нараджэння пісьменніка У. М. Глазырына (1901 — 1961).
Яго пяру належаць кніжкі прозы «Апавяданні», «Маленькі разведчык», п'есы «Фронт», «Агонь» і інш.

22 ЧЭРВЕНЯ — 50 гадоў беларускаму паэту М. І. Янчанку.
Ён — аўтар паэтычных кніг «Кросны», «Зраблю сонейка» і інш.

16 ЧЭРВЕНЯ — 70 гадоў з дня нараджэння Д. А. Лукаса (1911 — 1979), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР. Разам з лібрэтыстам М. Клімковічам кампазітар стварыў оперу «Кастусь Каліноўскі». Прэм'ера адбылася ў 1947 годзе, а пастаноўка твора ў новай рэдакцыі была здзейснена калектывам Беларускага радыё ў 1978 г. У творчасці Д. Лукаса вылучаецца радыёопера для дзяцей «Ракусач», музыка да тэатральных пастановак па п'есах «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча і інш. Ён аўтар шматлікіх песень, рамансаў, музыкі для кіно («Несцерка», «Белавежская пушча»...). Пільную ўвагу надаваў Д. Лукас рабоце з самадзейнымі кампазітарамі.

КНІГАПІС

СЦЕЖКА БЕЗ КАНЦА. Зборнік апавяданняў. Укладальнік і аўтар біяграфічных звестак В. Гужва. Пераклад з украінскай М. Дубянецкага. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

Творы пісьменнікаў братняй Украіны штогод выходзяць у Беларусі як асобнымі кнігамі, так і ў калектыўных зборніках. «Сцежка без канца» — найлепшае пацвярджэнне гэтаму. Змест кнігі склалі апавяданні сучасных украінскіх празаікаў, якія пачалі сваю творчасць у шасцідзесятыя гады. Сярод іх — Ніна Бічуя, Багдан Бойка, Юрый Логвін, Васіль Шкляр і іншыя.

Е. ДРОМІН.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

«ДАПАЎНЕННЕ» ДА ГІСТАРЫЧНАГА ПОМНІКА

Да вас звяртаецца пастаянны чытач «ЛіМа». З асаблівай цікавасцю і ўвагай чытаю я матэрыялы па ахове і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры — адной з важнейшых праблем сённяшняга дня.

Праходзячы нядаўна па плошчы Свабоды, я са здзіўленнем убачыў, што каля помніка архітэктуры XVII стагоддзя — кафедральнага сабора — вядзецца будаўніцтва прыбудовы для ўваходу ў склеп. Па сваім архітэктурным вырашэнні і размяшчэнні яна не спалучаецца з будынкам сабора і скажае яго аблічча.

Выклікае недаўменне, што сёння, калі так многа ўвагі надаецца ахове і аднаўленню ў першапачатковым выглядзе гістарычнай забудовы, адзін з нямногіх твораў барока ў Мінску, што захаваўся без значных змен, скажаецца. Нават калі ўсе неабходныя фармальнасці па ўзгадненні праекта гэтай прыбудовы і былі захаваны, дух нашых законаў аб ахове помнікаў у дадзеным выпадку не захоўваецца. Можна дапусціць, што пабудова новага ўваходу ў склеп неабходна. Але тады можна і трэба было знайсці вырашэнне тактоўнае і ненавязлівае, якое не парушыла б кампазіцыю і стылявое адзінства будынка.

І. БАЙЦОЎ,
архітэктар.

г. Мінск.



НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

ДЛЯ МАЛАДОЙ СЯМ'І

У рытуальных залах і палацах рэгістрацыі шлюбу, як правіла, маладых вітаюць шматзначным лозунгам «Моцная сям'я — моцная дзяржава», у чым ёсць глыбокі сацыяльна-палітычны сэнс. Сцвярджаючы шлюбны саюз урачыстым актам рэгістрацыі, дзяржава ўскладае на маладую сям'ю вялікія спадзяванні. Ад парога ЗАГСа для кожнай маладой пары пачынаецца новы шлях, новы этап жыцця, які абавязвае несці адказнасць за лёс сямейнай ячэйкі, за прадаўжэнне роду, за фарміраванне новага пакалення. Як зрабіць гэты этап шчаслівым? Як зберагчы любоў? Як выхоўваць дзяцей?.. Дзесяткі пытанняў, на якія не так проста знайсці адказ, а знайсці — трэба.

У саўгасе «Усход» Магілёўскага раёна створаны добрыя ўмовы для вытворчай дзейнасці. Гэтая гаспадарка вызначаецца высокай культурай працы, асноўны кантынгент працаўнікоў — моладзь. А дзе моладзь — там і вяселлі.

У саўгасе кожная маладая сям'я — на асаблівым уліку. На асаблівым уліку яна і ў сельскім Доме культуры. Мясцовыя культработнікі лічаць, што гэта тая нялёгкая сфера ўплыву, якая патрабуе да сябе асабліва далікатнага і разумнага падыходу. Тут створаны «Клуб маладой сям'і», аб некаторых аспектах дзейнасці якога і хочацца расказаць.

Саўгас «Усход» знаходзіцца ў зоне абслугоўвання Вільчыцкага сацыяльна-культурнага комплексу. Тут, як і ў іншых цэнтрах культуры, стварэнне клубаў маладых сем'яў звязана з патрабаваннем ЦК ЛКСМБ, міністэрстваў культуры, юстыцыі, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, праўлення таварыства «Веды» БССР, Белсаўпрофа. У іх сумеснай пастанове сказана: «Камітэтам камсамола, прафсаюзным камітэтам, органам і ўстановам юстыцыі, аддзелам культуры, аховы здароўя райвыканкомаў, праўленням арганізацый таварыства «Веды» прыняць канкрэтныя меры па стварэнні на базе культасветустаноў клубаў маладой сям'і, умацаваць свой уплыў на фарміраванне маральнага аблічча асобы ў сям'і».

У Доме культуры саўгаса «Усход» пасяджэнні «Клуба маладой сям'і» праходзяць у форме гаворак. На сустрэчу з маладажонамі запрашаюцца настаўнікі, урачы, дзеячы мастацтваў, самадзейныя артысты, аднавяскоўцы.

Маладыя сем'і. Шмат у чым яны адчуваюць патрэбу на першым часе сумеснага жыцця: у мудрых парадах, у кансультацыях урачоў, у павучаннях старэйшых. І як мала атрымліваюць з-за той заслоны «інтымнасці», якая не дазваляе выйсці на шчырую гутарку нават з бацькамі. Падманная сціпласць дорага абыходзіцца часам маладажонам.

Запрошаны на сустрэчу з маладымі парамі выкладчык Магілёўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута Анатоль Іванавіч Сарокін адказаў на многія пытанні, звязаныя з маральнай асновай сямейна-шлюбных адносін. Урач-псіхатэрапеўт Магілёўскай абласной бальніцы Леанід Нікіфаравіч Панчанка расказаў аб праблемах гармоніі адносін паміж мужам і жонкай.

На вечары ўдала спалучаліся сур'ёзная размова з музычнымі антрактамі, задушэўныя гутаркі з гумарыстычнай віктарынай, інтэрв'ю, гульнямі. На вясёлы лад настройвалі маладых і жартаўлівыя плакаты, і конкурсы на лепшае выкананне песні пра каханне, лірычных вершаў, веданне пяшчотных імён. Упрыгожаннем сямейнага вечара маладых працаўнікоў з'явілася выступленне народнага агіттэатра «Усмешка»...

Устаўныя патрабаванні «Клуба маладой сям'і» канкрэтныя і лаканічныя: строга прытрымлівацца прынцыпаў маральнага кодэксу будаўніка камунізму, умацоўваць маральна-псіхалагічны клімат сям'і, фарміраваць маральную чысціню, духоўнае багацце і фізічнае ўдасканаленне маладажонаў, павышаць адказнасць маладых мужа і жонкі за маральна-этычны клімат у сям'і, за выхаванне дзяцей і падрыхтоўку іх да грамадска-карыснай працы. А за ўсім гэтым карпатлівая і вельмі адказная работа культасветработнікаў.

Такая форма аматарскіх аб'яднанняў у рэспубліцы толькі нараджаецца, але там, дзе гэта справа робіцца з душой, з адчуваннем вялікай адказнасці, яна прыжываецца, набывае аўтарытэт.

А. СУРЫНОВІЧ,
нам. дырэктара Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра Міністэрства культуры БССР.

РАСКАЗАЦЬ ПРА ПОБЫТ

Радуюць вока прасторныя вясковыя дамы, што ўтварылі новыя вуліцы ў вёсках Лінова, Аранчыцы і многіх іншых населеных пунктах Пружанскага раёна. Будуюць тут добра, з размахам, з перспектывай — сем'і маладыя, дзеці растуць,— каб не цясніцца. Гаспадары но-

ЭТЫКА, МАРАЛЬ, ПРАВА

Гоп, гоп, чаравікі...

НІНА. Тоненькая дванаццацігадовая дзяўчынка. Валасы туга заплецены ў касу. На бледнаватым тварыку вялікія блакітныя вочы глядзяць з падкрэсленай шчырасцю. І гаворка — нечакана зусім дарослая: «А цяпер коратка пра сябе...», «Мой дэбют адбыўся на зямлі Якуба Коласа, у Мікалаеўшчыне...»

Маці яе, пажылая смуглявая кабета, дастае з альбома некалькі вялікіх фотаздымкаў, дзе занатавана ўрачыстая сустрэча літаратараў у Мікалаеўшчыне. На пярэднім плане хлеб-соль народнаму паэту ўручае дзяўчына ў народным касцюме, побач з ёй, у такім жа касцюме, знёмая ўжо мне постаць Ніны.

— Гэтая, каторая ўручае, — тлумачыць маці, — мая старэйшая — Лена.

— Мы тады сарвалі нямала апладысментаў, — спакойна гаворыць Ніна, і я зноў здзіўляюся яе спецыфічнаму «сарвалі».

Мы сядзім у невялікім пакойчыку вясковай хаты, вокны якой выходзяць проста на Волкавіцкі лес. На сценах — прыгожыя мастацкія вышыўкі, вязанне. Перахапіўшы мой позірк, маці кажа, што гэта ўсё зроблена рукамі Лены, яна народны майстар, «робіць ад Мастацкага фонду».

— Хто ж навучыў яе такой прыгажосці? — цікаўлюся я.

— Ды я, канечне, — адказвае жанчына, — у нас гэта з роду ў род. Самі прадзём, самі вяжам: і пуховыя хусткі,— ідзе ў суседні пакой і выносіць адтуль вялікую прыгожую хустку,—і кофтачкі, і сукенкі. І Ніна таксама навучылася, сабе нядаўна кофтачку звязала.

Але прывяло мяне сюды не гэтае ўмельства маці і дачок. Майму візіту папярэднічалі візіты гаспадыні (аднойчы разам з Ленай) у рэдакцыю. Чым выкліканы быў візіт? Да малодшай — Ніны — у школе (яна ў шостым класе) ставяцца прыдзірліва, асабліва настаўніца беларускай мовы, не хоча ёй выпраўляць «чатыры» на «пяць».

— Зразумейце маё мацярынскае гора, — выціраючы слёзы, казала Антаніна Іванаўна, — гэта скончыцца трагедыяй, Ніна не ходзіць у школу, бывае, начуе на вакзалах.

— Ніначка загіне, а гэта — талент. Я ўпэўнена, ёй наканавана вялікая артыстычная будучыня,—падхоплівала Лена. — Вы не бачылі яе выступлення па тэлебачанні? Шкада! Яна выступала і на Новы год, і на першамайскія святы...

Шчыра кажучы, можна было разгубіцца, слухаючы ўсё гэта. Дзяўчынка не ходзіць у школу з-за чацвёркі? Начуе на вакзале? У дванаццаць гадоў— «тэлезорка»?

А маці са старэйшай дачкой ужо настойваюць:

— Напішыце пра гэта, каб нас баяліся ў школе, каб не прыдзіраліся да Ніначкі.

Праўда, апошнія словы гаварыліся імі ўжо на кватэры рэдакцыйнага работніка, куды абедзве жанчыны завіталі нечакана ў адзінаццаць гадзін вечара (дзе яны здабылі хатні адрас, застаецца тайнай і па сённяшні дзень).

Не паспеў гаспадар штонебудзь сказаць на гэта, як на стале з'явіліся, спрытна выцягнутыя з торбы, каўбасы і шарсцяны шалік.

— Гэта вам наш прэзент, — сціпла апусціўшы вочы, сказалі госці. Ды, пачуўшы некалькі «ласкавых» слоў гаспадара, яны разам з «падарункамі» хуценька зніклі.

Пагадзіцеся, «прыёмчык» той яшчэ... Ды самае галоўнае, што, як пасля аказалася, для гэтай сямейкі (назавём іх Новікамі) ён зусім звычны.

Чытач, відаць, здзіўлены: чаму аўтар хавае гэтых людзей за псеўданімамі? Растлумачу. Толькі дзеля малодшай дачкі. Не хочацца яе траўміраваць. Тым больш, што цяперашняе жыццё дванаццацігадовай дзяўчынкі (а менавіта ў гэтым узросце фарміруюцца многія рысы характару) выклікае, на мой погляд, вялікую трывогу. І вінаватыя ў гэтым дарослыя людзі, у першую чаргу — яе родныя.

У школе, дзе вучыцца Ніна,— гэта ў пасёлку, што за дваццаць кіламетраў ад Мінска, — варта мне было сказаць, што я з рэдакцыі, як дырэктар адразу спытала:

— Вы з нагоды Ніны Новік? Яна тут вамі даўно палохае, кажа, вось прыедуць з рэдакцыі, дык разбяруцца...

— З чым разбяруцца? — пацікавіўся я.

— Не ведаю. Неяк прыязджала інспектар аблана па скарзе маці Новік.

— Па скарзе?

— Так. Быццам Ніне неаб'ектыўна выстаўляюцца адзнакі. Вядома ж, гэта не пацвердзілася. Дарэчы, — дадае дырэктар, — дзяўчынка даволі здольная, у яе ўсяго толькі некалькі чацвёрак, астатнія выдатныя адзнакі. Але варта ёй атрымаць чацвёрку, або, бараніі божа, тройку, як у школу прыбягае маці. Некалькі разоў яна рабіла спробу даваць настаўнікам хабар, а калі ўбачыла, што гэта не праходзіць, напісала ў аблана. Маўляў, дачка вельмі таленавітая, яе ведае ўся рэспубліка, а тут яе не хочуць рабіць круглай выдатніцай.

— І ўсё гэта адбываецца на вачах аднакласнікаў? — пытаюся я.

— Ну вядома ж, — пацвярджае класны кіраўнік Ніны. — Дзеці ўсё заўважаюць. Адсюль і адпаведныя адносіны да Новік. Вось і зусім нядаўні выпадак. У класе выбіралі савет піянерскага атрада. У спіс кандыдатаў трапіла і Ніна. І што вы думаеце, за яе падняла руку толькі адна вучаніца. Гэта з трыццаці шасці вучняў класа...

Я слухаю настаўніка і ўспамінаю гаворку з Нінай, якая, між іншым, паскардзілася і на тое, што ёй не даюць ніякай грамадскай пасады (гаворка была яшчэ да тых выбараў). Якія, аднак, страсці, якое славалюбства раздзіраюць гэтае кволае з выгляду дзяўчо!

— У школьным хоры яна ўжо не спявае, лічыць, што нас перарасла, — расказвае настаўніца спеваў. — Дзіва што, яе ж ужо неаднойчы запісвала тэлебачанне!

Я адчуваю, як настаўнікі, калі пачынаюць гаварыць пра Ніну, імкнуцца схаваць сваю непрыязнасць і прыкрасць. Гэта бянтэжыць — усё ж педагогі! Але ж людзі таксама, з уласцівымі ім сімпатыямі і антыпатыямі. У дадзеным выпадку ўсё гэта спрацавала трохі нечакана. Як я даведаўся, некаторыя настаўнікі пачалі завышаць Ніне адзнакі: маўляў, лепш не звязвацца...

Ніна хоча быць артысткай. Ей сказалі, што ў яе ёсць здольнасці.

— Яна сапраўды вельмі раскавана, смела трымаецца на сцэне, — расказвае настаўніца. — Але, вядома, ніякі яна не вундэркінд. Калі мы павезлі наш калектыў на раённы агляд мастацкай самадзейнасці, дык Ніна там не трапіла ў лік лепшых.

І вялікім было здзіўленне настаўніцы і вучняў, калі яны на абласным аглядзе ўбачылі Ніну, якая выступала, так сказаць, сама па сабе. Потым пахвалілася: маўляў, сястра ведае таго-сяго з членаў журы...

З таго пары старэйшая «прабівае» малодшую, як некалькі гадоў назад «прабівала» сябе.

Мне расказваў Леанід Аляксандравіч Смялкоўскі, мастацкі кіраўнік інструментальнага ансамбля Беларускага радыё і тэлебачання, як яму давялося два разы вытрымліваць сапраўдную асаду з боку Лены, якой хацелася трапіць у гэты прафесійны калектыў. Ей было недвухсэнсоўна сказана, што па сваіх вакальных і іншых дадзеных яна не падыдзіць. Ды, на вялікае здзіўленне Леаніда Аляксандравіча, кожны раз пачыналіся пэўныя абходныя захады — запрашэнне ў рэстаран (разам з маці, якая ў патрэбны момант аказвалася побач), спробы ўручыць прэзент, або абяцанне «дастаць дублёнку»...

— З мяне не выйшла, — сказала мне пры сустрэчы Лена,— дык хай выйдзе з Ніны.

— Што выйдзе? — спытаў я.

— Артыстка, — цвёрда адказала сястра.

Мы доўга з ёй гутарылі, і я дзіву даваўся, як артыстычна хлусіць гэтая зусім яшчэ маладая асоба (я спытаў у яе пра загадзя вядомыя мне, абсалютна праверaныя факты), як крывадушнічае, разыгрываючы цэлыя мімічныя сцэны, як «б'е» на слязу — анёлак дый годзе. Мусіць, па гэтай прычыне Тацяна Іванаўна Лявонцьева, якая курыруе ў Мастацкім фондзе Лену, гаварыла пра яе як пра надта сарамлівага і палівага чалавека.

Але, як кажуць, бог з ёй, Ленай. Яна — дарослы чалавек. Бяда ў тым, што, як я меў магчымасць упэўніцца, малодшая сястра падобная на яе не толькі тварам. І «заслуга» ў гэтым Лены відавочная. Не ведаю, мо сённяшняя дванаццацігадовая Ніна сапраўды стане некалі артысткай. Але якой цаной? Па прыкладзе старэйшай, будучы ўпэўненай, што для дасягнення мэты няма забароненых шляхоў, што добрыя ўсе сродкі?

Цяпер Лена і Ніна — салісткі-вакалісткі народнага цымбальнага аркестра Палаца культуры сістэмы прафтэхадукацыі. Смешна, але і ў самадзейнасць яны прыйшлі «па знаёмстве». Мне расказаў кіраўнік аркестра Генадзь Аляксандравіч Ермачэнкаў, што да яго ў кансерваторыі — ён там выкладае — падышоў калега і папрасіў узяць у калектыў Лену. А тая, у сваю чаргу, прывяла малодшую сястру.

— Ніна падкупляе гледача сваёй непасрэднасцю на сцэне, — гаворыць Генадзь Аляксандравіч. — Яна ніколі не саромеецца, па-мойму, нават не ведае, што гэта такое.

Я не выказаў пры гэтых словах вялікага захаплення. Мне здаецца, што дванаццаць гадоў — гэта не той узрост, ка-

вых дамоў іншы раз упрыгожваюць іх арнаментам, клапоцяцца пра вонкавы выгляд пабудоў, добраўпарадкаванне вуліц. Гэта натуральна, што, ствараючы новую сям'ю, будуючы новую хату, чалавек павінен думаць пра зручнасць і прыгажосць жыцця на новым месцы, пра пэўную культуру быту. Тут яму павінны дапамагчы ўзоры лепшага, цікавейшага, што назапашана ў вясковым будаўніцтве. А ўзоры гэтыя не заўсёды пад рукой. Таму, думаецца, прапаганду новага, камуністычнага побыту на вёсцы абавязаны ўзяць на сябе культасветработнікі.

Побыт, як мне ўяўляецца, у пэўнай ступені аснова маралі. І не дзіўна, што ў апошнія гады рух за высокую культуру працы, побыту, паводзін узначальваюць сельскія саветы і работнікі культуры. У Пружанскім раёне, напрыклад, спаборніцтва за ганаровае званне дамоў высокай культуры праходзіць з удзелам грамадскасці. На пасяджэннях райвыканкома падводзяцца таксама вынікі спаборніцтва паміж вёскамі і сельсаветамі. Сёння гаворка ідзе пра якасна новы ўзровень эканамічнага і сацыяльнага развіцця нашай вёскі. Пераход сельскагаспадарчай вытворчасці на прамысловую аснову вымагае зрухаў і ў штодзённым побыце сельскіх жыхароў. І гэты працэс, думаецца, будзе яшчэ больш прадукцыйным, калі мы, культасветработнікі, будзем актыўна і разумна прапагандаваць рысы новага побыту сённяшняга селяніна.

Чалавек імкнецца зрабіць сваімі рукамі гарадскія выгоды ў старым ці новым доме, пасадзіць сад з рэдкімі гатункамі дрэў і кветак, аздобіць дом. Гэта тая самая народная творчасць. І яе лепшыя ўзоры павінны захавацца для наступных пакаленняў вясковых жыхароў, напрыклад, на тых жа фотаздымках, што ўпрыгожваюць стэнды сельскіх клубаў. Гэтак жа і расказ пра народных умельцаў трэба пачынаць з выстаўкі іх работ, макетаў і фотаздымкаў, якія таксама могуць знайсці месца ў СДК.

Метадычны кабінет нашага раённага Дома культуры пачынае абагульняць вопыт сельскіх дамоў культуры і клубаў па прапагандзе народнай творчасці ва ўсіх яе праявах. Мы пачалі з захавання сучаснай мастацкай творчасці ў фота- і фанатэцы, а зараз пераходзім да метадычных рэкамендацый папулярызацыі гэтых каштоўных скарбаў сучаснасці. Надзвычай зацікаўлена ўспрымаецца, напрыклад, запіс песні ці танца на вечарах адпачынкаў або стэнд ці экспазіцыя з узорамі прыкладнога мастацтва нашых землякоў. Ды і для тэматычных вечароў гэта неацэнны матэрыял. Хіба ж можа абысціся гаворка пра будучыню Пружаншчыны або сустрэча ветэранаў без такой прадметнай выстаўкі?

Не трэба, аднак, перабольшваць нашы магчымасці ў гэтай важнай справе прапаганды народнай творчасці, камуністычнага побыту на вёсцы. Нам патрэбна падтрымка абласнога і рэспубліканскага навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культасветработы, творчых саюзаў мастакоў і архітэктараў. Сельскі працаўнік чакае сапраўды мастацкіх узораў, паводле якіх ён мог бы сваімі рукамі аздобіць сядзібу і абсталяваць яе з усімі выгодамі.

Вёска ўступіла ў новы этап свайго росквіту. І на гэтым шляху штодзённая праца работнікаў культурнаасветных устаноў набывае асаблівую значнасць.

В. КУРАЧЫНСКІ,
дырэктар Пружанскага РДК.

лі, бывае, людзі перастаюць саромецца і бянтэжыцца...

І Лену, і Ніну разам з аркестрам неаднойчы паказвала рэспубліканскае тэлебачанне, яны выступаюць у розных аўдыторыях. Нядаўна Ніна аб'явіла і маці, і ў школе, што едзе з аркестрам на гастролі за мяжу. Я пацікавіўся ў Ермачэнкава, ці праўда гэта. Ён усміхнуўся:

— Як вам сказаць, нам паабяцалі ў Беларускім таварыстве дружбы з замежнымі краінамі, дзе мы аднойчы выступалі, што нас будуць мець на ўвазе.

Калі я прыехаў да Новікаў, і маці мне паскардзілася, што Ніна зноў не ходзіць у школу (туды паведамілі, што яна хварэе), я выказаў меркаванне, што, можа быць, варта на нейкі час дзяўчынцы спыніць гэтую гульню ў артысткі. Антаніна Іванаўна не пагадзілася.

— Што вы! — усклікнула яна. — Мая сярэдняя, Клава, у Мінску спявае ў самадзейнасці, і яе там і прапісалі, і інтэрнат адразу ж далі.

— Мая задача, — перапыняе нас Ніна, — трапіць у ансамбль Красоўскага. Ён мне абяцаў. Там я буду расці.

І Г. Ермачэнкаў, і рэдактары тэлебачання В. Козак і К. Гарадко, і Мікалай Піліпавіч Красоўскі, кіраўнік эстрадна-харэаграфічнага ансамбля «Чараўніцы» Дома культуры работнікаў гандлю горада Мінска (ён сказаў мне па тэлефоне, што сапраўды аднойчы абяцаў узяць Ніну да сябе пасля заканчэння ёю на выдатна шасці класаў) забыліся, што яны маюць справу з падлеткам і таму павінны быць яшчэ і чулымі педагогамі.

Тут жа, наадварот, раздзьмухвалі недзіцячыя амбіцыі дванаццацігадовай дзяўчынкі, раздзьмувалі дзеля «сюминутного» поспеху, дзеля таго, каб нехта пахваліў: «Глядзіце якую тут прыдбалі салістку».

А што за ўсім гэтым стаіць, чым жывіцца няспелая яшчэ душа «салісткі», нікога так і не зацікавіла.

У тое маё наведванне Новікаў я ўбачыў на стале тэлеграму, дзе Лене і Ніне прапанавалася заўтра а палове шостай вечара быць у Палацы культуры на канцэрце (у горад ім трэба дабірацца электрычкай паўгадзіны). Але ж кіраўнік аркестра не мог не ведаць, што Ніна займаецца ў другую змену, што выехаць на канцэрт — значыць, прапусціць урокі.

Ніна пры мне ўзяла ў рукі тэлеграму і ўрачыста прачытала яе ўголас.

— Буду выступаць перад работнікамі міліцыі, — дадала. І чыталася ў гэты час на яе чыстым дзіцячым тварыку, у яе блакітных вачах: ну хто, ну хто можа са мной параўнацца...

Менавіта тады мне ўспомніўся адзін даўнаваты эпізод. На раённым аглядзе школьнай мастацкай самадзейнасці я зайшоў за кулісы і адтуль наглядаў за выступленнем танцавальнай групы адной са школ. Раптам адна з танцорак паслізгнулася і ўпала, ды так няўдала, што, відаць, звіхнула нагу. Ёй дапамаглі падняцца, і яна з выразам адчаю на твары, выціраючы слёзы, пакульгала са сцэны. І тут я пачуў за спіной рогат і апладысменты. Азірнуўся і ўбачыў рослых хлопцаў і дзяўчат у прыгожых танцавальных касцюмах — відаць, хутка быў іх выхад.

— Чаго радуецеся? — спытаў я не здагадваючыся пра сапраўдную прычыну весялосці.

— Цяпер першае месца нам забяспечана, — выкрыкнуў нехта з акселератаў і, крутануўшы галавой у бок сцэны, зласлива дадаў: — З гэтымі ўсё скончана, спякліся...

Помню, мяне вельмі засмуціла жорсткасць падлеткаў. Дарэчы, яны-такі ўзялі першае месца і заваявалі права паездкі на абласны агляд...

Нядаўна мне давялося гутарыць з Валянцінай Дзям'янаўнай Шалуха, загадчыцай аддзела пазакласнай і пазашкольнай работы Міністэрства народнай асветы рэспублікі. Я, між іншым, расказаў ёй пра гэты эпізод. Нечакана для мяне Валянціна Дзям'янаўна строга сказала:

— Вы лічыце, што мастацкая самадзейнасць псуе дзяцей?

— Ну, вядома ж, не, — трохі разгубіўся я. — Сам некалі ўдзельнічаў. Але ж пагадзіцеся, выпадак гэты робіць цяжкае ўражанне.

— Галоўнае, не трэба абагульняць, — парыравала мая субяседніца. — Толькі ў сістэме народнай асветы мастацкай творчасцю ахоплена 354030 вучняў, пераважная большасць іх радуе сваімі поспехамі. Што ж тычыцца аглядаў, конкурсаў, дык жа гэта адна з важнейшых форм спаборніцтва.

Я сказаў Валянціне Дзям'янаўне, што, барані божа, нічога не абагульняю, але хоць тыя трыццаць за кулісамі і з'яўляюцца выключэннем (30 супраць 354 тысяч!), усё роўна пра гэта нельга маўчаць. Я таксама за спаборніцтва. Мяне вельмі радуе, калі, напрыклад, спаборнічаюць токар з токарам, цэх з цэхам, домакіраўніцтва з домакіраўніцтвам. А вось наконт спаборніцтва, скажам, спевакоў ці танцораў... Гэта што — хто першы возьме верхняе «до» ці больш пракруціць фуэтэ?

Конкурсы-агляды? Народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы Сяргей Уладзіміравіч Абразцоў, цудоўны знаўца дзіцячай псіхалогіі, у сваім артыкуле ў газеце «Известия» «Мастацтва: асцярожна, дзеці!» пісаў, што ў падлеткаў, прыхвачаных да музыкі, спеваў, танцаў, малявання, бывае, развіваецца эгаізм, дух саперніцтва, канкурэнцыі. На думку аўтара, гэтаму спрыяюць і розныя заахвочванні, прэміі, дыпломы, якія для многіх маладых «талентаў» становяцца проста самамэтай. Дарэчы, гэтую думку С. Абразцоў паўтарыў нядаўна ў час свайго творчага вечара, які перадаваўся Цэнтральным тэлебачаннем.

Гісторыя, якую я вам расказаў, яркае пацвярджэнне праваты славутага артыста. І ўсё ж такі я не буду такі катэгарычны наконт фестываляў, конкурсаў, аглядаў дзіцячай самадзейнасці, дыпломаў і прэмій. Без гэтага, відаць, не абысціся. Ды толькі ні на адну хвілінку нельга забываць, што асноўнае прызначэнне мастацтва — рабіць чалавека лепшым, рабіць яго спагадлівым, чуйным, тонкім.

Спаборніцтва ў самадзейнасці? Так. Напрыклад, гэтая школа мае пяць гурткоў, а суседняя — тры, няхай даганяе. Але пры чым тут гладыятарскі дух, вылузванне са скуры, каб быць першым? Чаму трэба штурхацца локцямі, зайздросціць і ненавідзець? Нарэшце, прычым тут дэвіз: хто каго?

...Каронны нумар Ніны Новік — беларуская народная песня «Гоп, топ, чаравікі». Яна не толькі спявае, а і «паказвае» песню — дзе тупне ножкай, дзе зробіць ручкай. А пасля заўсёды доўгія апладысменты. Ніна некалькі разоў выбягае на сцэну кланяцца. Потым за кулісамі скардзіцца, па-даросламу сцяўшы вусны, што мінулы раз яе выклікалі тры разы, а сёння толькі два...

«Гоп, топ, чаравікі...» Колькі ім яшчэ «топаць»? І галоўнае, што будзе з Нінай, калі яна вырасце з тых чаравікаў? Пытанне не лішняе...

М. ЗАМСКІ.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

АЛЬГЕРД АБУХОВІЧ НА ТЭЛЕЭКРАНЕ

Нядаўна на экранах тэлевізараў трохі нечакана для сябе мы ўбачылі знаёмае імя: Альгерд Абуховіч. Равесніку і пабраціму Францішка Багушэвіча менш пашанцавала на даследчыкаў, і дагэтуль яго творчасць застаецца ў ценю літаратуразнаўства. Мы неяк звыкліся з той думкай, што многае з яго спадчыны страчана — згарэла ці вывезена, а біяграфію ведаем толькі па мемуарах самога ж пісьменніка. Усё гэта яшчэ больш павышала цікавасць да перадачы.

Вёў яе вядомы беларускі літаратуразнавец Адам Мальдзіс, гісторык нашай літаратуры, які дараваць такога палітычнага акту.

Усе ўладанні дзеда, асабліва Сядзельнікі і Грабава Мазырскага павета, былі апісаны губернскімі ўладамі і падлягалі секвестрацыі. Так як сам удзельнік паўстання Іосіф Абуховіч у хуткім часе памёр (пра гэты факт паведамляе і сам пісьменнік у сваіх мемуарах), то абарону маёмасці вялі жонка Паўліна, сын Адольф і памянёны ў тых жа мемуарах Нерэзыуш. Першай асобай выступала Паўліна Абуховіч, яна і складала прашэнні вяльможнаму начальству і ў камісію па справах секвестрацыі. (Дарэчы, у мове паданняў прасіцельніцы поўна беларусізмаў). Справа гэта каштоўная для нас апісаннем быту Абуховічаў, іх хатняй абстаноўкі.

У Сядзельніках Мазырскага павета ў доме дзеда — Іосіфа Абуховіча знаходзіліся творы мастацтва: выключна прыгожая мэбля, як, напрыклад, «стол ломберны складаны з чырвонага дрэва з блакітным сукном са срэбранай аздобай»; калонкі круглыя з карэльскай бярозы пад бюсты; гадзіннік з курантамі ў шафе з чырвонага дрэва, ды яшчэ з бронзавымі фігуркамі; дзевяць статуй, канапы, сафа, і шмат, шмат іншага.

На «польскім дыялекце», а фактычна на беларускай мове, напісаў сваё прашэнне абуховічаўскі аканом Іван Рыгоравіч Руткоўскі, які сведчыў, што ён у паўстанні не ўдзельнічаў і таму прасіў вярнуць яго дакументы аб вызваленні ад прыгону, каб можна было знайсці іншую работу.

Усё ж Паўліне, Адольфу і Нерэзыушу Абуховічам былі вернуты толькі тыя хатнія рэчы і прадметы хатняга ўжытку, якія неабходны для вядзення гаспадаркі, а рэшта апісана, затрымана на невядомы тэрмін, як, напрыклад, цудоўнай работы англійская і пецярбургская брычкі і іншыя каштоўнасці.

Лёс абуховічаўскіх твораў мастацтва пакуль што невядомы, але, зноў жа, гэтыя факты прыгадваюцца не выпадкова, а каб весці далейшыя пошукі, каб ведаць, куды ўсё падзелася.

Пры перавыданні і пашырэнні змястоўнага зборніка дакументаў і матэрыялаў Г. В. Кісялёва «Пачынальнікі» варта ўлічыць і гэтыя.

І яшчэ пра тэлеперадачу. Варта было паказаць у ёй тыя мясціны, дзе нарадзіўся і жыў Альгерд Рышардавіч Абуховіч. Кажу гэта, бо спадзяюся, што тэленарыс пра беларускага пісьменніка XIX ст. будзе паўтораны.

Ёсць пажаданне больш рыхтаваць такіх вось літаратурных перадач, каб можна было сустрэцца з нашымі літаратуразнаўцамі і з такімі шукальнікамі, як Рыгор Родчанка са Слуцка, Уладзімір Урбановіч з Валеўкі Навагрудскага раёна, Алесь Белакоз з Гудзевіч Мастоўскага раёна і іншымі, чыя праца не плануецца ні Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, ні літаратурнымі кафедрамі, пра іх і ў Саюзе пісьменнікаў не часта ўспамінаюць. Такіх апантаных даследчыкаў, якія не шкадуюць ні часу, ні здароўя, трэба падтрымліваць.

Генадзь КАХАНОЎСКІ.

НА РАДЗІМЕ СКУЛЬПТАРА

Яшчэ нядаўна ў Мінску працавала выстаўка твораў заўчасна памёршага скульптара Віктара Гроса. Цяпер яна пераехала на Навагрудчыну—радзіму творцы. Некаторыя работы мастака тут прапісаліся назаўсёды: помнік воінам-партызанам у роднай вёсцы Дзяляцічы, бюст юнай змагарцы з фашызмам Люды Сечка, устаноўлены ля ўваходу ў новы будынак сярэдняй школы г. п. Любча.

З асаблівымі пачуццямі ідуць землякі скульптара на выстаўку ў раённым Доме культуры, выказваючы ў кнізе водгукаў словы ўдзячнасці мастаку.

ПОМНІКІ РОДНАГА КРАЮ

КАМЯНЕЦКІ СТОЎП

У XIII стагоддзі ў архітэктуры Беларусі з'яўляецца новы тып абарончых збудаванняў — асобна размешчаная шматпавярховая каменная вежа. Такія вежы, распаўсюджаныя ў XI—XIII стагоддзях у Цэнтральнай і Заходняй Еўропе і ў Скандынавіі, увайшлі ў абарончую сістэму многіх беларускіх гарадоў і драўляных парубежных крэпасцей. Новага, больш дасканалага тыпу абарончых збудаванняў патрабавала складаная ваенная і палітычная абстаноўка таго часу: з усіх бакоў пагражала ваенная навала. Мангола-татарскія орды, зруйнаваўшыя многія ўсходнеславянскія княствы, зачапілі і землі Беларусі.

Яшчэ большая небяспека пагражала з захаду і поўначы. У пачатку XIII стагоддзя прыбалтыйскія землі захапіў Лівонскі ордэн, і толькі перамога Аляксандра Неўскага на Чудскім возеры прыпыніла яго экспансію на ўсход. На захадзе на былых прускіх землях стаў валадарыць Тэўтонскі ордэн — самы злосны вораг славян і літоўцаў.

Усё гэта прымушала ўдасканальваць свае абарончыя збудаванні, запазычваць лепшыя ўзоры заходнееўрапейскай фартыфікацыі і архітэктуры.

З XIII стагоддзя ў будаўнічай справе Беларусі адбываецца карэнны пералом. Новыя архітэктурныя формы прынеслі з сабой новыя будаўнічыя матэрыялы і прыёмы. На змену плінфе прыйшла вялікапамерная цэгла, цамянку замяніла вапнаваная расчына, свінцовае пакрыццё даху — дахоўка і гонт.

Абарончыя вежы былі ў Брэсце, Гродне, Тураве, Навагрудку і іншых гарадах. Але да нашых дзён дайшла толькі Камянецкая вежа, пабудаваная ў апошняй чвэрці XIII стагоддзя.

Яна знаходзіцца ў горадзе Камянцы Брэсцкай вобласці і стаіць на высокім левым беразе ракі Лясной. Зроблена вежа з вялікапамернай цэглы цёмна-чырвонага і жаўтаватага колеру, якая мае на адным з шырокіх бакоў барозны. Такая цэгла была распаўсюджана ў Беларусі з сярэдзіны XIII да канца XVIII стагоддзяў і атрымала назву «пальчатка». Барозны на ёй рабіліся для таго, каб расчына, якая заходзіла ў іх, лепш звязвала рады цаглін між сабой. Пакладзены цагліны ў адпаведнай сістэме, якая завецца «балтыйскай» або «вендскай» і ўяўляе сабой чаргаванне двух лажкоў (доўгіх бакоў цагліны) і аднаго тычка (кароткага боку цэглы). Гэта муроўка ў XII—XIII стагоддзях ужывалася ў каменным прыбалтыйскім дойлідстве і таму завецца «балтыйскай». У Беларусі гэты тып муроўкі дажыў да сярэдзіны XIV стагоддзя. Вапнаваная расчына з дамесам жвіру, на якую пакладзена цэгла, вельмі трывалая.



Камянецкая вежа.

З малюнка Н. Орды. 1878 г.

Вышыня вежы дасягае 30, таўшчыня сцен—2,5, знешні дыяметр — 13,5 метра. Вежа, якая ў летапісе завецца «Камянецкі стоўп», мае магутны падмурак з вялікіх камянёў, перасыпаных дробным пяском.

Пры будаўніцтве Камянецкай вежы дойліды ўпершыню ў Беларусі выкарысталі элементы цаглянай готыкі: спічастыя праёмы, нервюрнае скляпенне з кранштэйнамі на пятым паверсе, тынкаваныя нішы, пояс з пакладзеных «на вугол» цаглін.

Готыка — гэта культурная плынь, характэрная для Заходняй Еўропы XII—XV стагоддзяў. Яна праяўлялася ў многіх сферах тагачаснага культурнага жыцця і ў першую чаргу ў архітэктуры. Асноўным элементам гатычных збудаванняў стала вострая спічастая арка, увасобленая ў розных архітэктурных дэталях, асабліва ў аконных і дзвярных праёмах. Узнікнуўшы на поўдні Еўропы (Францыя, Іспанія, Партугалія), гатычны стыль у XIII стагоддзі распаўсюдзіўся на паўночную Еўропу. Асаблівага росквіту гатычная архітэктура дасягнула ў Германіі і Скандынавіі. Таму тэрмін «готыка» азначае даслоўна мастацтва готаў — былых германскіх плямёнаў, што насялялі Германію і Скандынавію. У XIX стагоддзі гатычнае мастацтва разглядалася як прымітыўнае, «варварскае» і супрацьпастаўлялася італьянскаму адраджэнню. Толькі ў XX стагоддзі вучоныя і мастацтвазнаўцы поўнасцю перагледзелі гэтае пытанне, бо готыка была сапраўднай раніцай еўрапейскай цывілізацыі, прадвеснікам і асновай для пазнейшага рэнесансу.

Калі на поўдні, асабліва ў Францыі, гатычныя будынкі рабілі з абчасаных камянёў, амаль не ўжываючы цэглы, то на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, дзе не было залежаў будаўнічага каменю, гатычныя збудаванні рабілі цалкам цаглянымі. Менавіта готыку паўночнай прыбалтыйскай Еўропы і называюць цаглянай. Цагляная готыка больш чым каменная ўвабрала мясцовыя будаўнічыя традыцыі і таму праіснавала даўжэй, чым на поўдні, стварыўшы да XV стагоддзя ў кожнай краіне асаблівыя нацыянальныя плыні. Беларуская готыка аформілася да пачатку XVI стагоддзя.

Усе раннегатычныя элементы Камянецкага стаўпа пра якія мы ўжо ўпаміналі, тонка прарысоўваюцца на магутным целе вежы, пераклікаюцца з арнаментальнымі матывамі народнага мастацтва. З трэцяга паверха сцяны пачынаецца цагляная лесвіца, якая асвятляецца двума вузкімі акенцамі. Яна выходзіць на самы верх вежы, на баявы праход, дзе знаходзіліся абаронцы. Праход, ці баявая галерэя, прыкрыта 14 зубцамі. Кожны з зубцоў мае скразную адтуліну, якая, відаць, выкарыстоўвалася ў якасці назіральнай шчыліны ў час інтэнсіўнага варожага абстрэлу.

Вежа ўзвышалася над грамадскімі ўмацаваннямі і знаходзілася на высокім узгорку, які быў абнесены абарончым валам з драўлянымі канструкцыямі наверсе. З поўначы, з боку ракі Лясной, замак прыкрывала балоцістая нізіна. Рэшткі валоў вакол вежы добра бачны на малюнках мастакоў XIX стагоддзя.

Назва «Белая вежа» замацавалася за гэтым абарончым збудаваннем значна пазней, дзесьці ў XIX ст. Усе часы вежа была пазбаўлена белага колеру. Упершыню яе пабялілі ў пачатку 50-х гадоў нашага стагоддзя і гэтым самым значна сапсавалі яе ранейшы выгляд. Цяпер Камянецкая вежа ператворана ў філіял Брэсцкага краязнаўчага музея і стала месцам турысцкіх экскурсій.

Алег ТРУСАЎ.



Капліца, у якой знаходзіцца музей Дуніна-Марцинкевіча

Фота Ул. СІЗА.

На блакітным экране

НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

Другая праграма

з 8 па 14 чэрвеня

9 чэрвеня, 17.45.

«ЖЫЦЦЕВЫЯ КЛОПАТЫ».

Выступленне пісьменніка У. Дамашэвіча.

9 чэрвеня, 20.15.

«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ».

Перадача прысвечана жывапісцу і графіку М. Карпуку.

10 чэрвеня, 17.45.

«НАТХНЕННЕ».

Перадача знаёміць з літаратурным аб'яднаннем трактаразаводцаў «Полымя».

12 чэрвеня, 19.20.

«МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА НАРОДАЎ СССР».

Вы ўбачыце канцэрт народнага ансамбля «Ляасме», падрыхтаваны Латвійскім тэлебачаннем.

12 чэрвеня, 23.00.

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Музычная праграма з удзелам Палада Бюль Бюль-аглы.

12 чэрвеня, 13.00.

«ТВОРЧАЯ ЭСТАФЕТА».

Расказ пра моладзь Акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа. Вы ўбачыце ўрыўкі са спектакляў «Стары дом», «Закон вечнасці», «Скорыя паязды», «Брыльянт».

13 чэрвеня, 15.25.

«ПАЛЫМЯНАЕ СЛОВА ПЕСНЯРА».

Рэпартаж з гарадскога купалаўскага свята паэзіі.

13 чэрвеня, 18.15.

«НАШЫ ГОСЦІ».

Сустрэча з удзельнікамі занальнага семінара, прысвечанага развіццю сучаснага дакументальнага фільма.

13 чэрвеня, 19.45, 21.35.

«У ТЭЛЕВІЗІЙНЫХ ТЭАТРАХ КРАІНЫ».

Спектакль Украінскага тэлебачання «Расплата» паводле аповесці У. Цендракова.

14 чэрвеня, 12.00.

«ТЭАТРАЛЬНАЯ ГАСЦІНАЯ».

Тэма перадачы «Вобраз сучасніка на сцэне беларускіх тэатраў». Вы ўбачыце ўрыўкі са спектакляў «Сінія коні на чырвонай траве», «Як гартавалася сталь», «Закон вечнасці». Вядучая—народная артыстка БССР Г. Маркіна.

14 чэрвеня, 15.10.

«НЕСЦЕРКА».

Спектакль Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра па п'есе В. Вольскага.

14 чэрвеня, 19.20.

«ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ».

Расказ пра Мінскае культасветвучылішча.

АБ'ЯВЫ

Рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» тэрмінова патрабуецца машыністка. Званіць па тэлефоне 33-24-61.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 04287

1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-22-04, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае празаічныя творы аб'ёмам не больш як друкаваны аркуш, артыкулы, нарысы—да 15 старонак, вершаваныя творы—не больш як 100 радкоў. Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.